



М. М. Яніцкая

# Беларускае мастацкае шкло

## XIX — пачатак XX ст.

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1984

ББК 85.12
Я62
УДК 748(476)(091)

Рэдактар
кандыдат мастацтвазнаўства В. Г. Гаўрылаў

Рэцэнзенты:
П. А. Карнач, М. Ф. Раманюк, кандыдаты мастацтвазнаўства,
А. П. Грыцкевіч, кандыдат гістарычных навук

**Яніцкая М. М.**
Я 62 Беларускае мастацкае шкло: XIX — пачатак XX ст.— Мн.: Навука і тэхніка, 1984.—143 с., іл.

У пер.: 1 р. 60 к.

У манаграфіі даследуецца развіццё шкларобства Беларусі апошняй стадыі мануфактурнай вытворчасці на прыкладзе Урэцкай і Налібоцкай мануфактур і стадыі імперыялістычнага развіцця, калі дробныя гуты зліваліся ў буйныя манапалістычныя канцэрны, на прыкладзе Барысаўскага і Нёманскага шклозаводаў.
Разглядаюцца мастацкія асаблівасці шкляных вырабаў і тэхналогія іх вытворчасці.
Разлічана на мастакоў, тэхнолагаў і інжынераў шклозаводаў, студэнтаў і выкладчыкаў мастацкіх вучылішч, ВНУ.

Я $\frac{4904000000-155}{М316-84}$ 136—83

ББК 85.12

© Выдавецтва
«Навука і тэхніка», 1984.

# УВОДЗІНЫ

У манаграфіі даследуецца развіццё мастацкага шкларобства Беларусі ў XIX — пачатку XX ст., да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Гісторыю развіцця мастацкага шкларобства Заходняй Беларусі ў 1920—1939 гг., калі яно было цесна звязана з развіццём шкларобства гэтага часу ў краінах Заходняй Еўропы (Германіі, Чэхаславакіі, Аўстрыі), мэтазгодна таксама разглядаць як гісторыю шкларобства Беларусі дасавецкага часу. Гэты этап развіцця беларускага шкла выдзелен у асобны раздзел— «Шкларобства Заходняй Беларусі (1920—1939 гг.)».

Мастацкае шкло Беларусі да 60-х гадоў XIX ст. аналізуецца па вырабах Налібоцкай і Урэцкай шкляных мануфактур, якія былі створаны магнатамі Радзівіламі ў іх вотчынных мястэчках: Налібоцкая — у 1717 г. (цяпер в. Налібокі Стаўбцоўскага р-на), Урэцкая — у 1737 г. (цяпер г. п. Урэчча Любанскага р-на Мінскай вобл.). Дзейнічалі мануфактуры да 60-х гадоў XIX ст. (Налібоцкая да 1862 г.[1], Урэцкая да 1866 г.[2]).

Мастацкае шкло Беларусі канца XIX — пачатку XX ст. аналізуецца па вырабах шклозавода «Нёман», які сфарміраваўся на базе трох невялікіх гут, размешчаных у лясах вакол сучаснага г. п. Бярозаўка Лідскага р-на Гродзенскай вобл. [3], Барысаўскага шкло-крышталёвага завода, які ўзнік у 1885 г.[4] у г. Барысаве, і шклозавода «Барысаў», які ўзнік у 1898 г. у Нова-Барысаве на месцы сучаснага шклозавода (цяпер г. Барысаў Мінскай вобл.) [5].

Мастацтвазнаўчай літаратуры па беларускаму мастацкаму шклу разглядаемага перыяду няма. Але з'яўленне данай манаграфіі стала магчымым дзякуючы папярэднім даследаванням гісторыкамі дзейнасці Урэцкай і Налібоцкай шкляных мануфактур па архіўных крыніцах. Важкі ўклад у вывучэнне гісторыі дзейнасці Урэцкай мануфактуры ўнеслі беларускія даследчыкі А. Ельскі [6] і А. Урбанскі [7]. А. Ельскі — вядомы беларускі этнограф, гісторык, эканаміст, пісьменнік, гісторык

---

[1] ЦДГА ЛітССР, ф. 388, воп. 1, спр. 390, л. 19; Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861 гг.).— Мн., 1966, с. 164.

[2] Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 157, 159.

[3] Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.).— Мн., 1953, т. 3, с. 32.

[4] Жаврид М. Ф. Белорусское стекло.— Мн., 1969, с. 53; Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии. 1860—1900.— Мн., 1978, с. 214.

[5] ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 204, л. 5/10.

[6] Jelski A. Wiadomość historyczna o farbryce szkieł i zwierciadeł ozdobnych w Urzeczu Radziwiłłowskim na Litwie.— Sprawozdania Komisij Historii sztuki. Wilno, 1899, t. VI.

[7] Urbański A. O. fabryce szkiel w Urzeczu Radziwiłłowskiem.— Południe. Wilno, 1932, z. III.

мастацтва, стваральнік краязнаўчага музея ў сваім маёнтку (в. Замосце Пухавіцкага р-на). Шматлікія экспанаты з яго калекцыі розных відаў беларускага мастацтва і культуры пасля 1917 г. трапілі ў музеі Варшавы і Кракава [8].

А. Ельскі звярнуў увагу на высокі мастацкі ўзровень урэцкіх шкляных вырабаў (посуд, люстэркі, люстры), якія ў канцы XIX ст. яшчэ сустракаў на Міншчыне, у дамах сваіх сяброў і знаёмых. Менавіта гэта падштурхнула яго даследаваць гісторыю дзейнасці Урэцкай шкляной мануфактуры. Значэнне працы А. Ельскага для гісторыкаў мастацтва ў тым, што ён у канцы XIX ст. першы выявіў і зарысаваў урэцкія люстэркі, шкляны посуд і іншыя рэчы XIX ст. (датыроўка якіх высветлілася пазней), надрукаваў рысункі і шэраг інвентароў мануфактуры, даў уяўленні аб тэхналогіі, абсталяванні, прыладах, тэрміналогіі шкларобаў, асартыменце вырабаў і звярнуў увагу на іх значную мастацкую каштоўнасць і неардынарны талент выканаўцаў. Недахоп працы ў тым, што надрукаваныя вырабы не былі прадатаваны. Але гэта праца вельмі зацікавіла польскіх і беларускіх краязнаўцаў, гісторыкаў, даследчыкаў мастацтва і развіцця прамысловасці і з'явілася штуршком для глыбейшага вывучэння гісторыі Урэцкай шкляной мануфактуры, пошукаў у прыватных і музейных калекцыях шкла не толькі вырабаў Урэцкай, але і іншых шкляных мануфактур і заводаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі этнічнай Польшчы і Беларусі да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай.

Вынікам пошукаў і даследаванняў была арганізаваная ў 1913 г. у Варшаве выстаўка польскай керамікі і шкла, на якой упершыню экспанавалася сярод вырабаў іншых мануфактур вялікая колькасць урэцка-налібоцкіх рэчаў. Яны паступілі на выстаўку і потым у музеі Варшавы і Кракава як дар розных калекцыянераў, што мелі дачыненне да Беларусі (яе ўраджэнцы, уладальнікі маёнткаў, краязнаўцы і г. д.). Ілюстраваны каталог выстаўкі з'яўляецца другой каштоўнай крыніцай для гісторыкаў мастацтва пры атрыбутаванні ўрэцка-налібоцкіх вырабаў XIX ст.[9]

Другі даследчык А. Урбанскі звярнуў увагу чытачоў Заходняй Беларусі на фальклорны характар надпісаў на ўрэцкіх вырабах і іх цесную сувязь з побытам беларускага народа.

Значны ўклад у вывучэнне гісторыі дзвюх буйнейшых шкляных мануфактур Беларусі, Налібоцкай і Урэцкай, унеслі польскія гісторыкі Б. Смаленская [10] і С. Каменская [11]. Б. Смаленская першая надрукавала архіўныя матэрыялы (ведамасці) аб дзейнасці Налібоцкай мануфактуры, у тым ліку за 1806, 1816, 1820, 1830, 1844, 1862 гг. С. Каменская ў сваім артыкуле даследавала абсталяванне і тэхналогію вырабаў Урэцкай шкляной мануфактуры.

---

[8] Кісялёў Г. Пачынальнікі.— Мн., 1977, с. 327, 328; КБелСЭ, т. 5.

[9] Katalog wystawy zabytków starożytności.— Warszawa, 1913; Pamętnik wystawy ceramiki i szkła polskiego.— Warszawa, 1913.

[10] Smolenska B. Materiały do dziejów huty szklanej w Nalibokach z XVIII w.— Teki archiwalne. Warszawa, 1953, N 1.

[11] Kameńska Z. Z dziejów techniki szklarskiej w Polsce XVIII i pierwszej połowy XIX wieku.— Kwartalnik Historij Kultury Materialnej PAN. Warszawa, 1955, r. III, N 4.

Выкарыстаўшы публікацыі гісторыкаў і новыя архіўныя крыніцы, польскі гісторык мастацтва К. Бучкоўскі [12] ўпершыню спалучыў архіўныя звесткі з існуючай у Кракаўскім Нацыянальным музеі калекцыяй польскага шкла і вылучыў з яе ўрэцка-налібоцкія вырабы, якія адначасова ўяўляюць старонку гісторыі і беларускага мастацкага шкла [13]. К. Бучкоўскі даў агульную мастацкую характарыстыку ўрэцка-налібоцкага шкла XVIII — першай чвэрці XIX ст. Каштоўнасць яго працы ў тым, што ў манаграфіі змешчан багаты, кваліфікавана прааналізаваны ілюстрацыйны матэрыял і прыведзены поўныя звесткі аб мастацкіх своеасаблівасцях урэцка-налібоцкага шкла.

Найбольш дакладныя гістарычныя даныя аб дзейнасці Урэцкай шкляной мануфактуры на працягу XVIII і першай палавіны XIX ст. прывяла ў сваёй манаграфіі С. Каменская [14], дзе падрабязна даследаваны ўмовы ўзнікнення мануфактуры, арганізацыі працы, тэхналогія вырабу шкла, тэхнічнае абсталяванне, сыравіна, падрыхтоўка спецыялістаў, умовы і аплата працы, збыт прадукцыі, узаемаадносіны адміністрацыі і майстроў, асартымент вырабаў.

З сучасных беларускіх гісторыкаў першымі сабралі звесткі аб дзейнасці шкляных мануфактур і шклозаводаў на тэрыторыі Беларусі ў першай палавіне XIX ст. М. Ф. Болбас [15] і Н. Т. Раманоўскі [16], якія зрабілі агляд стану ўсіх галін прамысловасці Беларусі ў дарэформенны час.

М. Ф. Жаўрыд [17] абагульніў даступныя яму архіўныя і друкаваныя гісторыка-эканамічныя даныя аб шкляных гутах, мануфактурах і заводах Беларусі, якія дзейнічалі на працягу XVII—XX стст., уключаючы шкляную прамысловасць Савецкай Беларусі. Па сутнасці, гэта першая праца гісторыка-эканамічнага характару, у якой зроблен рэтраспектыўны агляд развіцця шкларобства на Беларусі. Аналізуючы ўзнікненне і развіццё шклозаводаў у канцы XIX — пачатку XX ст., даследчык звярнуў асноўную ўвагу на эканамічны фактар іх дзейнасці, умовы працы, крыніцы сыравіны, рынкі збыту прадукцыі, узаемаадносіны са шклозаводчыкамі Расіі.

Абапіраючыся на папярэднія даследаванні, аўтар данай манаграфіі

---

[12] Buczkowski K. Dawne szkła artystyczne w Polsce.— Kraków, 1958.

[13] Вырабы Урэцкай і Налібоцкай мануфактур, якія захоўваюцца ў музеях Польскай Народнай Рэспублікі, лічацца вырабамі польскімі на той падставе, што тэрыторыя сучаснай Беларусі на працягу двухсот год уваходзіла ў складзе Вялікага княства Літоўскага ў шматнацыянальную дзяржаву Рэч Паспалітую. Але вырабы тых жа беларускіх мануфактур канца XVIII ст. і XIX ст., якія захоўваюцца ў музеях РСФСР, атрыбутаваны яшчэ дарэвалюцыйнымі даследчыкамі як вырабы Расіі, таму што тэрыторыя Беларусі з канца XVIII ст. уваходзіла ў склад Расіі. Таму, каб узнавіць карціну развіцця беларускага шкларобства XVIII—XIX стст., прыходзіцца атрыбутаваць у музейных калекцыях РСФСР, УССР і ПНР вырабы канкрэтных мануфактур Беларусі.

[14] Kameńska Z. Manufaktura szklana w Urzeczu (1737—1846).— Warszawa, 1964.

[15] Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861 гг.).— Мн., 1966; яго ж. Промышленность Белоруссии. 1860—1900.— Мн., 1978.

[16] Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии (вторая половина XVIII— первая половина XIX в.).— Мн., 1966.

[17] Жаврид М. Ф. Белорусское стекло.—Мн., 1969.

значна дапоўніла спіс гут і шклозаводаў Беларусі, якія дзейнічалі тут на працягу XIX і ў пачатку XX ст., на аснове архіўных крыніц мануфактур, гут і шклозаводаў, што захоўваюцца ў Цэнтральным Дзяржаўным гістарычным архіве БССР (ЦДГА БССР) і Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве (AGAD), атрыбутавала сярод музейных калекцый шкла ПНР і СССР вырабы Урэцкай і Налібоцкай шкляных мануфактур і ўпершыню ўводзіць іх у навуковы абарот, адначасова прасачыўшы на іх развіццё мастацкіх стыляў і плыней у першай палавіне XIX ст.

Мастацкае шкло Беларусі канца XIX — пачатку XX ст. выяўлена аўтарам у Дзяржаўным Эрмітажы, Дзяржаўным Рускім музеі ў Ленінградзе, беларускіх музейных і прыватных калекцыях. Асновай для выяўлення беларускіх вырабаў гэтага перыяду і іх атрыбутавання паслужыў Каталог шклозавода «Нёман», надрукаваны ў 1939 г., і Каталог шкляных вырабаў Барысаўскага шкло-крышталёвага завода, выдадзены ў 1904 г.

У даным даследаванні праводзіцца параўнаўчы аналіз беларускага мастацкага шкла з рускім і заходнееўрапейскім, пад уплывам якіх яно развівалася ў даследуемы перыяд, што дазваляе выявіць агульныя тэндэнцыі ў развіцці беларускага шкларобства і вылучыць мясцовыя, своеасаблівыя рысы, а таксама даследаваць асноўныя мастацкія стылі і плыні, якія фарміравалі мастацкае аблічча шкляных вырабаў Беларусі.

Аўтар выкарыстала даступную зарубежную і савецкую літаратуру па мастацкаму шкларобству Заходняй Еўропы і Расіі XIX — пачатку XX ст. Выкарыстоўвалася таксама спецыяльная перыёдыка.

У манаграфіі выкарыстаны публікацыі аб шматлікіх мастацкіх выстаўках, дзе дэманстраваліся шкляныя вырабы, і спецыяльных выстаўках шкла. Для плённага развіцця беларускага мастацкага шкла, як і сусветнага, становучае значэнне мелі сусветныя выстаўкі 1884, 1890 і 1925 гг. у Парыжы. Яны сталі своеасаблівымі салонамі, дзе вызначаліся адносіны шырокіх слаёў насельніцтва і спецыялістаў да новых твораў са шкла.

Шкляныя вырабы беларускіх заводаў канца XIX — пачатку XX ст. адзначаліся міжнароднымі ўзнагародамі: Grand-Prix у 1908 г. і Залатым медалём у 1910 г.

Вывучэнне мастацкага шкла гэтага часу мае значную навуковую і практычную каштоўнасць, таму што ў пачатку XX ст. ствараліся ўмовы для фарміравання і развіцця мастацкага шкларобства Савецкай Беларусі. Вытокі мастацкага шкларобства нашай рэспублікі караняцца ў традыцыях шкларобства менавіта тых часоў.

Выяўленне і вывучэнне не толькі мастацкіх, але і тэхналагічных традыцый у фармаванні і дэкарыраванні шкляных вырабаў пачатку XX ст. могуць аказаць дзейсную практычную дапамогу сучасным мастакам, майстрам і тэхнолагам беларускіх шклозаводаў ва ўзбагачэнні сучаснага мастацкага шкла серыйнай і масавай вытворчасці з улікам творчага выкарыстання папярэдніх традыцый.

# ХАРАКТАРЫСТЫКА ВІДАЎ ШКЛАРОБСТВА

Далучэнне Беларусі да Расіі плённа адбілася на росце мануфактурнай вытворчасці ва ўсіх галінах прамысловасці, расшырэнні гандлю. Вырабам шкляных рэчаў займаліся ў першую чаргу шклозаводы, гуты і мануфактуры, а таксама рамесныя шкларобы ў гарадах і вёсках, якія мелі свае дробныя гуты. Гуты сельскіх шкларобаў называліся «ляснымі», таму што будавалі іх у лясах. Акрамя таго, існаваў шкляны (гутны) промысел. Ім займаліся шкловыдзімальшчыкі, якія выдзімалі рэчы з паўторна расплаўленай фрыты, закупленай у гутах.

У першым дзесяцігоддзі XIX ст. дзейнічала не менш 47 шкляных мануфактур і заводаў, а не 13, як адзначыў М. Ф. Жаўрыд [18] (дадатак).

У пачатку другога дзесяцігоддзя XIX ст. шкляной прамысловасці Беларусі нанесла значныя страты нашэсце войск Напалеона ў 1812 г. Аднак да канца дзесяцігоддзя яна амаль ужо была адноўлена, і к канцу XIX ст. колькасць шклозаводаў узрасла да 116.

На працягу XIX ст. дзейнічала да 203 шкляных прадпрыемстваў (з улікам гут, ад якіх засталіся толькі назвы вёсак). У іх ліку працягвалі дзейнасць 23 буйныя шкляныя прадпрыемствы, створаныя ў XVIII ст. На працягу XIX ст. узнік 101 шклозавод (дадатак).

Акрамя таго, на працягу XIX — пачатку XX ст. шкларобствам займалася яшчэ і шмат гарадскіх рамеснікаў. Існавалі памешчыцкія і рамесніцкія майстэрні на 7—12 работнікаў [19], дзе выраблялі ліставое шкло і посуд. Ад некаторых мануфактур іх адрознівала толькі колькасць рабочых.

Прастата будаўніцтва драўляных гутных памяшканняў, нескладанасць абсталявання, наяўнасць рамесных традыцый у вырабе шкла, танная і даступная кожнаму рамесніку і памешчыку мясцовая сыравіна (пясок, драўняны і раслінны попел і паташ, мел, вапна, гліна) і неабходная гутам вада, таннае драўнянае паліва спрыялі развіццю ўсіх відаў шкларобства — мануфактурна-заводскага, рамеснага і сельскага шклянога промыслу. Спаліўшы лес у адным месцы, гуту ці майстэрню пераносілі хутка ў другое лясістае месца, бліжэй да паліва.

Побач з вырабам аконнага шкла, бутэлек і штодзённага посуду на дробных гутах рамеснікаў у гарадах шкляныя рэчы і аконнае «лясное» шкло (не асветленае, натуральнага зялёнага колеру) выраблялiся на шматлікіх лясных гутах, якія ўзводзіліся сярод лесу вандроўнымі гутнікамі на землях памешчыкаў на правах арэнды. Гэта традыцыя — узводзіць гуты пры дапамозе вандроўных гутнікаў — захавалася на Беларусі, як і ў Заходняй Еўропе, яшчэ з часоў позняга жалезнага веку [20] і ранняга сярэдневякоўя [21].

---

[18] Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 41—42.

[19] Да мануфактурна-заводскай вытворчасці шкла з 1882 г. аднесены прадпрыемствы з колькасцю працуючых не менш 16 чалавек.— Документы и материалы..., т. 3, с. 921 (2).

[20] Mały słownik kultury dawnych słowian.— Warszawa, 1972, s. 373.

[21] Яніцкая М. М. Вытокі шкларобства Беларусі.— Мн., 1980, с. 92, 93.

Лясныя гуты задавальнялі патрэбы ў шкле мясцовага сялянскага, дробнашляхецкага і местачковага люду. Ад гарадскіх гут рамеснікаў «лясныя» адрозніваліся тым, што іх рабочыя працавалі і жылі на тэрыторыі гуты, утвараючы своеасаблівыя працоўна-бытавыя супольнасці. Уладальнікі гут спецыяльна будавалі для жылля асобныя дамы, у якіх сялілі запрошаных на працу шкларобаў. Традыцыя гэта захоўвалася на Беларусі да канца XIX — пачатку XX ст. Аб гэтым сведчаць планы лясных гут, размешчаных ва ўрочышчах каля вв. Парэцкая Пушча, Краснае Сяло і іншых Мінскай губерні [22]. Рост вытворчасці на лясных гутах патрабаваў павелічэння колькасці рабочых. Яны сяліліся вакол гуты, пасяленні раслі, што спрыяла ўтварэнню вёсак.

У гарадах існавалі дробныя рамесныя майстэрні, у якіх працавалі шклаpобы. Архіўныя крыніцы даюць звесткі аб 4 рамесніках-шклаpобах у м. Дрыса (цяпер г. Верхнядзвінск, 1855) [23], 4 рамесніках у Полацку (1852), 179 рамесніках-майстрах па Віцебскай губерні (1900), 404 па Гродзенскай (1905) [24] і г. д. У справаздачах уладальнікі майстэрняў звычайна паказвалі толькі колькасць гутных майстроў без уліку ўсяго складу спецыялістаў. На чале рамеснай майстэрні стаяў гутны майстар, які ведаў рэцэптурны састаў шкла, тэхналогію яго вытапу, умеў выдзімаць і аздабляць шкло, быў кіраўніком вытворчасці [25]. Акрамя яго ў майстэрні працавалі выдзімальшчык, падавальшчык (баначнік), які набіраў шкло «на баначку» з донніцы, дзе яно варылася, і падаваў «баначку» выдзімальшчыку, аздобнік (наносіў пячаткі, прылепы, ніці на выдзьмутую форму), аддзельшчык (адбіваў рэчы ад понціі, зарабляў вусце посуду), апальшчык (паліў печ дровамі), ганчар (рабіў з гліны донніцы), сталяр (рабіў з дрэва формы, у якія выдзімалі шкло пры фармаванні), каваль (вырабляў інструменты і жалезныя формы для выдзімання ў іх шкляных вырабаў). Па Гродзенскай губерні ў 1860 г. працаваў 191 рамесны шклароб, у тым ліку ў гарадах — 52, у вёсках — 139 [26], у 1896 г.— 404, у тым ліку вучняў 40 [27]; у 1905 г. колькасць шклаpобаў павялічылася да 487, у тым ліку майстроў — да 404 (па гарадах і вёсках), 29 рабочых і 54 вучні [28]. Па Віцебскай губерні ў 1895 г. працавала 188 шклаpобаў, у тым ліку рабочых — 18, вучняў — 4 [29]; у 1900 г. працаваў 191 шклароб, у тым ліку майстроў — 179, рабочых — 3 і вучняў — 9; у 1914 г. колькасць шклаpобаў павялічылася да 267 чалавек, у тым ліку майстроў — да 211, рабочых — да 48, вучняў — 8 [30].

---

[22] ЦДГА БССР, ф. 299, воп. 2, спр. 1110; воп. 5, спр. 758.

[23] Белоруссия в эпоху феодализма.— Мн., 1961, т. 3, с. 409, 539, 544.

[24] Документы и материалы..., т. 3, с. 120, 123.

[25] Polak A. Szklo i jego historia.— Warszawa, 1981, s. 22, 23.

[26] Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 409.

[27] Обзор Гродненской губернии за 1896 год.— Гродно, 1897, с. 25.

[28] Документы и материалы..., т. 3, с.123.

[29] Обзор Витебской губернии за 1895 год.— Витебск, 1896 (ведомость ремесленников).

[30] Документы и материалы..., т. 3, с. 120, 127.

Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ў лік рамеснікаў-шкларобаў не ўваходзілі «аканішнікі», прафесія якіх у архіўных дакументах падавалася асобна. Так, па Мінскай губерні ў 1800 г. працавала 48 цэхавых майстроў-аканішнікаў [31]. У 1902 г. аканішнікі паказваліся ў справаздачах аб рамеснай вытворчасці ў графе «шкляныя работы»—4 у Магілёўскай губерні [32], у 1909 г. у Віцебскай губерні — 43 майстры [33].

Акрамя таго, існаваў шкляны (гутны) промысел, які па сутнасці ўяўляў хатняе рамяство. Промысел гэты развіваўся і ў гарадах, і ў вёсках. Шклароб-прамысловік выдзімаў і ляпіў шкляную рэч у хатніх умовах з паўторна расплаўленай у тыглі фрыты, шкляных трубак ці стрыжняў, якія награваліся ў полымі нафтакнотавай лямпы, якая паддувалася кавальскім мехам, ці паяльнай. Фрыту, трубкі і стрыжні закуплялі ў гутах. Атрыманы такім спосабам шкляны танкасценны сталовы, аптэчны і хімічны посуд, ёлачныя цацкі, пацеркі, дробная пластыка са шкладроту называліся «выдутымі», а майстры — «шкладувамі», а не шкловыдзімальшчыкамі, якія працавалі пры гутнай печы.

Шкляным промыслам па Віцебскай губерні ў 1895 г. займалася 225 шкларобаў [34]; у 1901 г.— 276 сельскіх шкларобаў, у тым ліку 15 жанчын; у 1914 г. колькасць такіх шкларобаў па губерні павялічылася да 1197 чалавек [35].

Шкляным промыслам займаліся таксама вандроўныя шклаpобы, якія звычайна ставілі «лясныя гуты» на кароткі час. Выканаўшы заказы ў бліжэйшай акрузе, яны пераязджалі ў другое месца. Калектыў вандроўных шкларобаў-прамысловікаў часта быў сямейным, дзе гаспадар быў гутным майстрам, а жонка і дзеці выконвалі абавязкі выдзімальшчыка, баначніка, аздобніка, апальшчыка і г. д. Увогуле шкларобы вандравалі групай і так падбіралі яе склад, што хутка маглі наладзіць вытворчасць шкла на новым месцы. Добра падабраны вандроўны калектыў прамысловікаў на чале з таленавітым гутным майстрам меў магчымасць зарабляць больш, чым фабрычна-заводскі калектыў. Напрыклад, 1197 шкларобаў, якія займаліся шкляным промыслам у Віцебскай губерні ў 1914 г., мелі гадавы заработак 307 040 руб., г. зн. кожны 257 руб.[36], у той час як сярэдні заработак фабрычна-заводскага шклароба ў год складаў 145 руб.[37] Відавочна, заработак павышаўся за кошт вырабу больш працаёмкіх мастацкіх шкляных рэчаў, якія каштавалі даражэй, чым заводскія.

Пашырэнне вытворчасці шкла «ляснымі» гутамі адбілася на геаграфічных назвах хутароў і вёсак (Гута, Буда, Паташня), якія ўзніклі вакол месц, дзе выраблялі шкло або сыравіну для шкла — вугаль, попел і паташ. Спецыялізаваных прадпры-

---

31 Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 105.

32 Обзор Могилевской губернии за 1902 год.— Могилев, 1903 (ведомость № 11).

33 Хозяйственное положение и промыслы сельского населения Витебской губернии.— Витебск, 1910, с. 40—43.

34 Обзор Витебской губернии за 1895 год (ведомость кустарных промыслов).

35 Документы и материалы..., т. 3, с. 128, 132.

36 Там жа, с. 132.

37 На Парэцкім шклозаводзе ў 1899 г.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 216, л. 25.

емстваў па вырабу паташу было мала, таму што большасць буд займалася вырабам як попелу, так і паташу. Апошні выкарыстоўваўся для варкі добра асветленага шкла.

Буда [38] і паташня [39]— драўляныя будынкі з печчу, у якой палілі драўніну з мэтай атрымання вугалю і попелу, а таксама варкі паташу з попелу. Паселішчы вакол буд і паташняў узнікалі пераважна пасля адмены прыгоннага ладу. Да адмены прыгонніцтва ўладальнікам шкляных гут, мануфактур і заводаў не было неабходнасці ствараць спецыялізаваную вытворчасць вугалю, попелу і паташу. Неабходную іх колькасць павінны былі здаць на мануфактуру як паншчыну прыгонныя сяляне, якія палілі драўніну ў невялікіх памерах (на патрэбы аднаго прадпрыемства) у месцах вырубак памешчыцкага лесу. Гэты метад здабычы ўсіх відаў мясцовай сыравіны апісваецца ў архіўных дакументах[40] Урэцкай шкло-люстэркавай мануфактуры, якая спыніла сваю дзейнасць у 1866 г., менавіта пасля адмены прыгоннага ладу.

Між тым з XV ст. на Беларусі ўжо існавалі асобныя рамесныя прадпрыемствы пад назвай «Буда», якія збывалі сваю прадукцыю мясцовым шкларобам, ганчарам, мылаварам і іншым рамеснікам, а таксама прадавалі попел і паташ за межы Вялікага княства Літоўскага — у Польшчу і Расію [41].

Да нашага часу на тэрыторыі Беларусі захаваліся вёскі, хутары і пасёлкі з назвамі «Гута» і вытворнымі ад яе (55, дадатак), «Буда» (143), «Паташня» (14), што сведчыць аб пашырэнні на Беларусі шкларобства і размяшчэнні калісьці тут лясных гут, буд і паташань.

Аб значным развіцці шкларобства на тэрыторыі Беларусі ў 1-й палавіне XIX ст. сведчыць і распаўсюджанне шкляных вырабаў сярод сельскага насельніцтва. У гэты час узнік попыт на шыбы аконныя і шкляны посуд нават у сялян. Так, Б. Цалінскі, які ў 40-я гады XIX ст. падарожнічаў па Беларусі, адзначаў, што «ў вокнах многіх сялянскіх дамоў Віцебскай і Магілёўскай губерняў можна бачыць устаўленае шкло» [42].

У 1827 г. прыгонныя «хлопы» набылі ўрэцкага посуду на 4,6% ад агульнага вырабу [43]. У гэтым жа годзе шкляны посуд, напрыклад, Урэцкай мануфактуры меў попыт на сельскіх кірмашах у былых мястэчках Пагосце, Парычах і інш., а ўтарганыя за год на кірмашы грошы ад продажу шклянога посуду раўняліся суме, на якую ў гэты ж год набылі шкла магнаты [44].

Такія кірмашы 2—3 разы ў год праводзіліся ў мястэчках Усвяты і

---

[38] Назва паходзіць, відаць, ад слова «будынак» ці «будан», ужываецца і на Украіне.

[39] Назва прадпрыемства ўтварылася ад назвы прадукцыі, якую атрымлівалі ў выніку яго дзейнасці. У іншых краях гэту сыравіну называюць салетрай. Назва «паташня» характэрна толькі для Беларусі.

[40] Kameńska Z. Manufaktura szklana..., s. 150, 158.

[41] Мелешко В. И. Очерки аграрной истории восточной Белоруссии (XVII—XVIII вв.).— Мн., 1975, с. 172, 173.

[42] Целинский Б. Агрономические путешествия по России.— Журнал министерства государственных имуществ, 1848, ч. XXVI, № 1—6, с. 46.

[43] Kameńska Z. Manufaktura szklana..., s. 201.

[44] Там жа, с. 203—204.

Янавічы (1833), Друя (1837), Дрысенскім павеце (1833) Віцебскай губ.; Радашковічы і Нясвіж (1837) Мінскай губ.; Свіслач (1829) і Зэльва (1830) Гродзенскай губ.[45] і інш.

Факт шырокага бытавання мясцовага шклянога посуду ў побыце сялян знайшоў адлюстраванне і ў беларускіх валачобных песнях, у якіх часта ўпамінаецца, напрыклад, традыцыйны шкляны посуд для моцных напіткаў — кварта:

Ай, нясі, нясі кварту гарэлкі,
Кварту гарэлкі, сыр на талеркі...

Або:

Нам, валачобным, мала трэба:
Кварта гарэлкі дзеля пасядзелкі...

Часта ў песнях упамінаюцца чаркі:

Гэта не госці — валачойнічкі,
Яны ж у нас часта не бываюць,
У гадок разок ды перапытаюць.
Палажыце кладку ды завіце ў хатку.
Чарку гарэлкі, сыр на талеркі.[46]

Ёсць песня, дзе ўпамінаецца «чаша надзіманая», што сведчыць аб веданні сялянамі тэхналогіі шкляных вырабаў спосабам выдзімання:

Стаўляе чашы надзіманыя,
Налівае чашы чорнага піва,
Чорнага піва, зялёнага віна,
Зялёнага віна, салодкага мёду.

Упамінаюцца ў валачобных песнях і «кубкі пісаныя», г. зн. распісаныя эмалямі:

Засцілае сталы ўсё кітайкамі,
Усё кітайкамі, усё зялёнымі,
Ды стаўляе кубкі, ды ўсё пісаныя,
Усё пісаныя, маляваныя.

* * *

...Перад ім стаяць чатыры кубкі,
Маляваненькіх, наліваненькіх.[47]

Як бачым, у песнях указваецца нават на прызначэнне пэўных відаў посуду, якім карысталася сельскае насельніцтва: чашы (чары) і кубкі для зялёнага віна, пшоннага піва, салодкага мёду. Трэба адзначыць, што фарфоравы і фаянсавы посуд быў значна даражэйшы і таму менш даступны простаму люду.

Мануфактурнае шкларобства ў XIX ст. было развіта ва ўсіх губернях Беларусі. У 1859 г. у Магілёўскай—выпускалася ў год шкляных вырабаў на 211 тыс. руб., у Мінскай — на 125 тыс., у Віцебскай — на 102 тыс., у Смаленскай — на 239 тыс. руб.[48] У гэты час у Магілёўскай губерні выраблялася больш шкляных вырабаў, чым на ўсіх прадпрыемствах Украіны[49]. Між тым выраб крышталёвага посуду ў губер-

---

[45] Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 436—440, 452, 451, 455, 430, 432.

[46] Валачобныя песні.— Мн., 1980, с. 52, 53, 73.

[47] Там жа, с. 67, 69.

[48] На 239 тыс. руб. шкляных вырабаў Смаленскай губерні, большая частка тэрыторыі якой размяшчалася ў той час на тэрыторыі сучаснай Беларусі, прыпадала 100 тыс. руб. шкляных вырабаў Мальцаўскіх заводаў, што размяшчаліся вакол вёскі Шчоткін Рослаўскага п. (цяпер тэрыторыя РСФСР). Такім чынам, на долю сучаснай беларускай тэрыторыі былой Смаленскай губерні прыходзіўся яшчэ значны аб'ём вытворчасці — на 139 тыс. руб. (Россия.— СПб., 1905, т. 9, с. 297).

[49] Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 312.

ні к сярэдзіне XIX ст. рэзка скараціўся. Большасць заводаў перайшла на выраб ліставога шкла [50]. Гэта было абумоўлена значным пашырэннем попыту на ліставое шкло, якое выкарыстоўвалі не толькі для шклення акон цэркваў, касцёлаў, палацаў, фабрык, крам, жылых дамоў, але і для атрымаўшых пашырэнне ў памешчыцкіх маёнтках аранжарэй, цяпліц, карцінных галерэй. У 1815 г. у Беларусі было выраблена 5 тыс. лістоў высакаякаснага «бемскага шкла», што складала 96% ад агульнарасійскага «бемскага шкла» [51].

У 1815—1817 гг. на долю Беларусі прыходзілася звыш палавіны ўсяго аптэкарскага посуду, які выраблялся ў Расіі, 2/3 графінаў і кілішкаў, 1/3 бутэлек, больш 10% шклянак [52].

У пачатку XIX ст. значна ўзрос выраб бутэлек. Галоўным стымулам іх вытворчасці было пашырэнне вінакурэння і бровараў. Бровар ці вінакурню меў амаль кожны памешчык у сваёй сядзібе. Піва і віно разлівалася і захоўвалася пераважна ў бутэльках. Акрамя таго, на працягу XIX ст. узнікла 12 буйных піўзаводаў, што карысталіся паравымі рухавікамі [53]. Такі ж уплыў на пашырэнне вырабу бутэлек мела і вінная вытворчасць. У 1860 г. у Беларусі працавала 53 вінакурныя заводы з паравымі рухавікамі, не ўлічваючы безлічы дробных, якія яшчэ не механізавалі ручныя працэсы. У 1881 г. механізаваных вінакурных заводаў было ўжо 186 [54]. У сярэдзіне XIX ст. больш палавіны сваёй прадукцыі прамыслоўцы пастаўлялі гандлярам у шкляной тары [55].

---

[50] Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 305—306.

[51] Там жа, с. 298.

[52] Там жа.

[53] Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 78.

[54] Там жа.

[55] Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 289.

# МАСТАЦКАЕ ШКЛО БЕЛАРУСІ I–III ЧВЭРЦІ XIX СТ.



БЕЛАРУСКАЕ
МАСТАЦКАЕ ШКЛО I—III ЧВЭРЦІ XIX ст.
РАЗВІВАЛАСЯ
Ў ЦЕСНАЙ СУВЯЗІ
З АГУЛЬНЫМ РАЗВІЦЦЁМ
ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКАГА
І РУСКАГА МАСТАЦКАГА ШКЛА.
У ЯГО ФОРМАХ І ДЭКОРАХ
ЗНАЙШЛІ АДЛЮСТРАВАННЕ
СТЫЛІСТЫЧНЫЯ ПЛЫНІ
Ў ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНЫМ
МАСТАЦТВЕ XIX ст.—
КЛАСІЦЫЗМ,
АМПІР,
БІДЭРМЕЕР

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СТАНУ ШКЛАРОБСТВА І ШКЛЯНЫХ ВЫРАБАЎ

Калі ў Заходняй Еўропе ў сярэдзіне XIX ст. драўнянае паліва замянілі вугалем, а драўняны паташ — содай, то ў Беларусі ў гэты час толькі некалькі шклозаводаў выкарыстоўвалі соду замест паташу (памешчыкаў А. М. Пацёмкіна ў вв. Усвяты, Ушакі, Славінскага ў вв. Пасмуркі і Талачыно і графа Чарнышова-Круглікава ў г. Чачэрску) [1], а драўнянае паліва часткова замянілі торфам і газагенератарамі толькі ў канцы XIX ст.

Многія шкляныя прадпрыемствы 1-й палавіны XIX ст. выраблялі адначасова некалькі відаў шкляных вырабаў: посуд сталовы, хімічны, аптэчны; шклатару (бутэлькі, бутлі, слоікі); люстраное шкло і люстры; лямпавае, аконнае і ліставое шкло. Апошняе прызначалася для мэблі і карэт. Крышталёвыя (гравіраваныя і шліфаваныя) вырабы рабілі на прыгонных мануфактурах князёў Радзівілаў у в. Налібокі і м. Урэчча, графа П. Салтыкова (пазнейВаладковіча) у м. Ілья, графа М. П. Румянцава ў г. Гомелі, вв. Беліца і Студзёная Гута, былых мануфактурах князя Р. Пацёмкіна (потым А. М. Пацёмкіна) у в. Ушакі і г. Крычаве (у XIX ст. належалі таварыству Магідсон—Расія). Пры гэтым завод М. П. Румянцава ў 1811 г. па колькасці печаў (16) пераўзыходзіў нават Урэцкую (14) і Налібоцкую (8) мануфактуры. А па колькасці прыгонных рабочых (па 105—120 чалавек на кожнай), у тым ліку гравіравальшчыкаў і шліфоўшчыкаў (па 33), колькасці вырабаў посуду яго пераўзыходзілі радзівілаўскія мануфактуры [2]. Люстраное шкло і люстэркі, жырандолі і люстры асвятляльныя выраблялі толькі на Урэцкай і Налібоцкай мануфактурах.

Неабходна адзначыць, што ў XIX ст. усё ж адбыліся значныя зрухі ў абсталяванні шкляных прадпрыемстваў новымі прыстасаваннямі, а таксама станкамі, якія механізавалі асобныя ручныя працэсы (выдзіманне і гравіраванне), што прывяло да змены тэхналогіі вырабу рэчаў — укаранення прасавання і гільяшыравання — і паўплывала на мастацкае аблічча шкляных вырабаў.

---

[1] Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 290, 312.

[2] Там жа, с. 292.

Спосаб фармавання шкляных вырабаў пры дапамозе ручнога прэса вядомы з найстаражытнейшых часоў. Але першыя звесткі аб фармаванні гэтым спосабам бытавога посуду адносяцца да XVIII ст. У гэтай тэхніцы выраблялі посуд з каляровага шкла ў 1764 г. у Паўночнай Амерыцы. Першы механічны прэс для фармавання адначасова аздобленага посуду быў вынайдзен у ЗША ў 1820 г. і выкарыстан у Заходняй Еўропе ў 1830—1840 гг. Але ліставое шкло і бутэлькі выраблялі метадам ручнога выдзімання да канца XIX ст.[3] Пры прасаванні расплаўленае шкло ўлівалі ў металічную форму, знешнія абрысы якой паўтаралі форму і аздобу той шкляной рэчы, якая атрымлівалася пасля прасавання. Да формы быў прымацаван штэмпель (матрыца), ідэнтычны ўнутранай форме посуду. Штэмпель ручным рычагом уціскалі ўнутр формы. Такім спосабам адзін прасаўшчык нават невысокай кваліфікацыі мог надаць форму і дэкор вялікай колькасці аднолькавых вырабаў. Спачатку прэс выкарыстоўвалі толькі для прасавання адкрытага посуду (талерак, місак, кружак) ці літых вырабаў (ручак да дзвярэй, дробнай пластыкі). Пазней прасаванне прымянілі да вырабу рэчаў з досыць складанымі формамі (масленіцы з накрыўкамі, крушонніцы з ручкамі і накрыўкамі, рыс. 71, 86). Часта ў вырабе прасаваныя дэталі спалучалі з выдзіманымі (прасаваныя ножкі і стопы з выдзіманымі чашамі ў кілішках). У Беларусі ручныя прэсавыя станкі пачалі пашырацца ў 2-й палавіне XIX ст.

У Заходняй Еўропе механічныя прэсы пачалі прыводзіць у рух парам з 1864 г. У Беларусі толькі адзін Чачэрскі шклозавод з 1862 г. пачаў выкарыстоўваць паравую машыну, але спачатку для прывядзення ў рух шліфавальных і паліравальных станкоў, а пазней і механічных прэсаў. Большасць беларускіх шклозаводаў, якія выраблялі шкляны посуд метадам прасавання, пачалі прымяняць паравыя машыны для гэтай мэты з 90-х гадоў: з 1890 г. у в. Ноўка, з 1895 г.— у вв. Чарняны і Парэчча, з 1897 г.— у в. Ельна, з 1898 г.— у в. Астраўно, з 1899 г.— у в. Целяханы, з 1902 г.— у в. Глуша (дадатак). У канцы XIX ст. амаль кожны шкляны выраб выконваўся ручным ці пнеўматычным прасаваннем, у тэхніцы ціхага выдзімання, маліравання ці ліцця шкляных вырабаў пры дапамозе прасцейшых прыстасаванняў. Колькасць шкляных рэчаў, што вырабляліся на кожным прадпрыемстве, узрасла, і яны сталі больш таннымі і больш даступнымі для шырокіх слаёў насельніцтва. Дэкоры пры такой тэхналогіі імкнуліся закласці ўжо ў самой форме. Але страцілася тая непаўторнасць, якая дасягалася віртуознай рукатворнасцю, што была так характэрна для гравіраваных сюжэтнымі кампазіцыямі вырабаў XVIII ст., калі кожны выраб з'яўляўся своеасаблівым творам прыкладнога мастацтва нават пры паўторным выкананні яго адным і тым жа майстрам.

Трэба адзначыць, што ў XIX ст. мастацкае шкло набыло касмапалітычны характар. Гэтаму спрыялі выданні заводскіх і мануфактурных каталогаў шкляных вырабаў, масавая міграцыя шкларобаў і гравіроўшчыкаў з краіны ў краіну і канку-

[3] Polak A. Szkło i jego historia, s. 263.



*Рыс. 1. Вырабы Урэцкай мануфактуры. 1-я пал. XIX ст. З публікацыі А. Ельскага*

рэнцыя прамыслоўцаў, якія імкнуліся не адставаць адзін ад другога ў тэхналогіі, вынаходніцтве форм і дэкораў. Адначасова прамыслоўцы мадыфікавалі формы і арнаменты, наследаваныя ў іншых цэнтрах. Ніверыроўцы мастацкага аблічча шкляных вырабаў спрыяў і масавы характар вырабаў, аб'ём вытворчасці якіх павялічыўся ва ўсім свеце. У 1-й чвэрці стагоддзя яшчэ адчуваўся значны ўплыў англійскіх цэнтраў шкларобства. З 30—40-х гадоў павялічыўся мастацкі ўплыў чэшскіх майстроў шкла. Яны распрацавалі новыя формы і экспартавалі свае вырабы па ўсёй Еўропе [4]. Паступова ўзрос уплыў французскіх і бельгійскіх шкляных цэнтраў.

Беларускае мастацкае шкларобства развівалася ў агульным рэчышчы з заходнееўрапейскім. Нягледзячы на тое што з XIX ст. Беларусь ужо цалкам знаходзілася ў складзе Расіі, цесныя мастацкія, тэхнічныя і тэхналагічныя сувязі шкляной вытворчасці з заходнееўрапейскім мастацтвам і шкляной прамысловасцю, што склаліся тут на працягу XIV—XVIII стст., захаваліся і ў першай чвэрці XIX ст. На шкляных прадпрыемствах Беларусі працавала шмат рамеснікаў і спецыялістаў Чэхіі, Германіі, Польшчы, Бельгіі.

Дзейнасць Налібоцкай і Урэцкай шкляных мануфактур найбольш вы-

[4] Polak A. Szkło i jego historia, s. 313, 314.



*Рыс. 2. Фрагмент сервіза. Урэчча. 1-я пал. XIX ст. З публікацыі А. Ельскага*

вучана, што дазваляе прааналізаваць мастацкія своеасаблівасці іх вырабаў.

Рысункі і фатаграфіі ўрэцка-налібоцкіх вырабаў XIX ст., апублікаваныя А. Ельскім і К. Бучкоўскім, у спалучэнні з архіўнымі крыніцамі дазволілі больш поўна ўзнавіць выгляд гэтых вырабаў, а потым адшукаць іх сярод музейных калекцый шкла ў Львове, Маскве, Мінску, Ленінградзе, Варшаве, Кракаве. Аўтар даследавала ў музеях Варшавы і Кракава шэраг вырабаў, атрыбутаваных супрацоўнікамі гэтых музеяў як вырабы ўрэцка-налібоцкія канца XVIII — пачатку XIX ст., а таксама XIX ст., але не апублікаваных. З ліку 129 атрыбутаваных аўтарам урэцка-налібоцкіх вырабаў XVIII—XIX стст. 16 датуюцца польскімі спецыялістамі XIX ст. (рыс. 22, 23, 25, 27, 29, 30, 31, 33, 37, 38,41). У атрыбутаваных А. Ельскім і К. Бучкоўскім шкляных вырабах Урэцкай і Налібоцкай мануфактур канца XVIII — першай палавіны XIX ст. (рыс. 1—8, 12) выразна прасочваюцца рысы мастацкіх стыляў класіцызму і ампіру.

Пэўны кансерватызм і інерцыя традыцый прывялі да таго, што асартымент вырабаў і многія дэкоры захоўваліся побач з новым асартыментам на працягу амаль 50 гадоў, у прыватнасці з 1780 па 1830 г. Так, у 1-й чвэрці XIX ст. яшчэ выраблялі «дубельцікі», (бакалы, у якіх дзве чашы аб'ядноўваліся донцамі, пры гэтым адна чаша выконвала функцыю пастамента), флеты, бакалы на ножцы, кілішкі, келіхі, шклянкі, кварты, графіны, фляшы, чашкі для чаю і сподкі, цукерніцы, чарнільніцы, масленіцы, рукамыі пад назвай «налеўка», чары для садавіны і варэння. Да 1825 г. выраблялі люстэркі і люстры, падсвечнікі [5]. Між тым асартымент посуду памяняўся. Менш пачалі вырабляць келіхаў, пераважаў выраб кілішкаў і бакалаў. Пашырэнне атрымалі талеркі, чашкі для кавы і чаю і сподкі, сальніцы, шклянкі, бутэлькі, салатнікі, графіны, сподкі для варэння. Кіраўнікі мануфактур імкнуліся прапанаваць пакупніку цэлыя шкляныя сервізы, якія ўключалі ўвесь вырабляемы асартымент посуду. Пры гэтым рэчы аднаго сервіза стылістычна аб'ядноўваліся адпаведнай формай і аднолькавым дэкорам (рыс. 2, 25, 32, 33, 38, 41).

Сярод новых вырабаў Урэцкай мануфактуры ў 1781 г. з'явіўся посуд пад назвай «стаканы», упамінаюцца яны і ў 1810 г., аздабляліся шліфаванымі авaламі, кружочкамі, стуж-

---

[5] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 99, 148, 172, 174.



*Рыс. 3. Вырабы Урэцкай мануфактуры. 1-я пал. XIX ст. З публікацыі А. Ельскага*

камі. К. Бучкоўскі апублікаваў такі від посуду, які ён тлумачыць «як келіх з тоўстым дном». Тоўстым дном К. Бучкоўскі называе шкляны прамавугольны пастамент, у якім умацавана ножка бакала [6]. У 40-х гадах паявіліся флаконы, табакеркі, шкатулкі, вазы дэкаратыўныя і для кветак.

*Шліфаваныя* дэкоры ўзялі на сябе асноўную дэкаратыўную нагрузку. Найбольш распаўсюджанымі элементамі шліфаванага дэкору з'яўляюцца арнаментаваныя фрызы з трохвугольнікаў, авалаў, ромбікаў, кругоў, «жамчужынак», ламбрэкенаў, размешчаныя па вусцях, «рамбічная сетка» на донцах і ножках (рыс. 9—12, 15, 17, 24). Часта шліфаваныя і паліраваныя дэкоры размяшчаліся на фоне матавых вузкіх палосачак, каб падкрэсліць розныя якасці шкла і асабліва выдзеліць яго бляск, святланоснасць, прамяністасць.

Першынство ў вытворчасці мастацкага шліфаванага шкла ў 1-й чвэрці XIX ст., як і ў канцы XVIII ст., належала англійскім майстрам шліфоўкі, уплывы якіх назіраюцца і на ўрэцка-налібоцкіх вырабах.

Цэннік Урэцкай мануфактуры на шліфаваны посуд за 1817 г. сведчыць, што ў гэты час тут прымянялі 4 віды шліфавання: *«у брыльянт», «у карпавую луску», «у паскі»* і *«шліф гладкі»* [7]. Шліфоўка «ў брыльянт» была засвоена беларускімі шліфоўшчыкамі яшчэ ў XVIII ст.[8] Гэта шліфоўка складаецца з рытмічна паўтораных чатырох трохвугольнікаў, злучаных катэтамі і вяршынямі, што прыводзіць да ўтварэння мноства пірамідак, якія ўкрываюць сценкі

---

6 Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 99, 100.
7 Kameńska Z. Manufaktyra szklana..., s. 108.
8 Там жа.



*Рыс. 4. Кубкі і бакал Урэцкай мануфактуры. 1-я пал. XIX ст. З публікацыі А. Ельскага*

Шліфоўка «ў карпавую луску» ўяўляла сабой мноства шліфаваных кругоў, якія цалкам пакрывалі посуд, і тым самым стваралася ўражанне карпавай лускі. Гэты від шліфоўкі быў распаўсюджан у XVIII ст. на Урэцкай мануфактуры, але, як сведчаць архівы, ужываўся яшчэ і ў першай чвэрці XIX ст.

Шліфоўка «ў паскі» ўяўляла сабой вузкія шлячкі, утвораныя з вастраверхага гранення, якія апаясвалі бутэлькі, шклянкі, кілішкі, чашы бакалаў і келіхаў, графіны сервізныя і інш. (рыс. 4, 33).

«Шліф гладкі» засвоены беларускімі майстрамі таксама з XVIII ст., але тады шліфоўка ножак келіхаў, кілішкаў, донцаў шкляніц, шклянак, графінаў плоскімі шырокімі вертыкальнымі гранямі ў форме прамаву-



*Рыс. 5. Шклянка. Урэчча. 1-я пал. XIX ст. З публікацыі А. Ельскага*

посуду ці падсвечнікаў. Такую шліфоўку рабілі на таўстасценных вырабах. Гэты від шліфоўкі ў нямецкім мастацтвазнаўстве атрымаў назву «Schpiecschteinschlif» [9], у рускім — шліфоўка «вастраверхая» [10].

У 1810 г. англійскія майстры ўдасканалілі свой від шліфоўкі крышталю. Навізна была ў тым, што маштаб утвораных пірамідак стаў значна драбнейшы. Пазней замест пірамідак на сценках посуду пачалі шліфаваць высокія прызмы. Адзін з відаў такога шліфавання ў канцы XIX ст. атрымаў назву «рускі камень». Святло, якое праламлялася ў шматлікіх гранях, выпраменьвала вясёлкавае зіхаценне (рыс. 22).

---

[9] Pazaurek G. Glaser der Empire und Biedermeierzeit.— Leipzig, 1923, s. 23.

[10] Лазаревский И. Заметки о русском цветном хрустале и стекле.— Среди коллекционеров, изд. 2-е. Петербург, 1917, с. 192.

гольніка называлася ў інвентарах шліфоўкай «у сценкі». Гэтай шліфоўкай пачалі аздабляць не толькі ножкі бакалаў, але і донцы чаш, зрэдку стопы і вельмі часта донцы шклянак, бутэлек-графінаў (рыс. 16, 17, 19, 23).

У гэты перыяд шліфоўкай аздабляўся амаль кожны выраб (бутэлькі, шклянкі, кілішкі, бакальчыкі, графінчыкі, флеты, келіхі і шклянкі з накрыўкамі, салатнікі, талеркі, чашкі для кавы і чаю, графіны сервізныя, сальнічкі) [11]. З гэтай мэтай была павялічана колькасць шліфоўшчыкаў. Калі ў 1750—1775 гг. на Урэцкай мануфактуры працавала толькі 2—3 шліфоўшчыкі адначасова, то ў 1811 г.— 33 шліфоўшчыкі [12]. Колькасць шліфаваных вырабаў пачала скарачацца ва Урэччы толькі з 1825 г.[13]

Галоўным і самым лепшым шліфоўшчыкам у 1-й чвэрці XIX ст. быў Каспар Рымашэўскі [14]. Рысункі «шліфу» прымяняліся традыцыйныя для Урэчча і Налібок, якія былі распрацаваны яшчэ рысавальшчыкамі-шліфоўшчыкамі XVIII ст.— Хрысціянам Шэрберам, Данілам Арастовічам, Мікалаем Банцэрам, Ежы Лобачам, Казімірам Хадаровічам, а таксама рысавальшчыкамі-шліфоўшчыкамі XIX ст. Мікалаем Рымашэўскім і Міхалам Малішэўскім, якія былі абучаны не толькі майстэрству шліфоўкі, але і рысаванню [15]. Трэба адзначыць, што наяўнасць «шліфэрні» пры гуце як асобнага цэха шкляной мануфактуры — з'ява рэдкая нават для заходнееўрапейскіх шкляных мануфактур. У Заходняй Еўропе першая «шліфэрня» пры гуце ўзнікла ў Намюры (Бельгія) толькі ў 2-й палавіне XVIII ст. Там звычайна шліфоўкай



*Рыс. 6. Флеты. Урэчча. 1-я пал. XIX ст. З публікацыі А. Ельскага*

шкляных вырабаў займаліся ў спецыяльных майстэрнях, якія знаходзіліся ў гарадах. Шкляныя вырабы скуплялі ў гутах і аздаблялі іх гравіроўкай і шліфоўкай згодна з індывідуальнымі густамі і заказамі пакупнікоў [16].

Хоць роля гравіраваных дэкораў у шкле XIX ст. значна паменшылася

---

[11] Kameńska Z. Manufaktura szklana..., s. 108.
[12] Там жа, с. 106.
[13] Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 290, 312.
[14] Kameńska Z. Manufaktura szklana..., s. 107.
[15] Там жа, с. 106, 129.
[16] Там жа, с. 109.



*Рыс. 7. Бакал. Урэчча — Налібокі. Канец XVIII — пачатак XIX ст. Кракаў, НМ, № XIII/2026, вышыня 18,6 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 8. Бакал. Урэчча — Налібокі. Канец XVIII — пачатак XIX ст. Кракаў, НМ, № XIII/2011, вышыня 16,7 см. Публікуецца ўпершыню*

ў параўнанні з аздобамі вырабаў XVIII ст., але ж яны яшчэ ўплывалі на мастацкае аблічча рэчаў. Гравіраваныя дэкоры на беларускім шкле гэтага перыяду сустрэты ў выглядзе арнаментаў, надпісаў і сюжэтных кампазіцый. Неабходна зазначыць, што гравіраванне матавых ліній на празрыстым шкле пры дапамозе невялічкага меднага калёсіка, якое рухаецца з пэўнымі абаротамі, патрабуе ўпэўненай і спрытнай рукі, неабходнага рысавальнага таленту і ведаў, таму што выправіць памылку ў гравіраваным рысунку на шкле ўжо немагчыма. Мэтанакіраванае навучанне «рысаванню на шкле» гравіроўшчыкаў, як і шліфоўшчыкаў, спрыяла развіццю іх мастацкіх здольнасцей. Наяўнасць 111 афортаў з узорамі аздаблення шклянога посуду на Урэцкай мануфактуры і

336—на Налібоцкай [17] сведчыць аб устойлівай традыцыі шліфаваць і гравіраваць пэўныя ўзоры і тым самым павышаць якасць выканання, ствараць арнаментальныя і сюжэтныя традыцыі ў гэтай галіне. Падобныя зборы афортаў з узорамі вырабаў, шліфовак і гравіровак прымяняліся і на мануфактурах Заходняй Еўропы [18].

Уяўленні аб характары і арнаментах *гравіраваных* дэкораў таксама даюць інвентары. Згодна з цэннікам урэцкага гравіраванага посуду ад 1817 г., там выраблялі бутэлькі, шклянкі, кілішкі, бакалы, «карафіны», флеты, шкляніцы і келіхі з накрыўкамі («дэкінглясы»), аздобленыя гравіроўкай [19]. Вельмі каштоўна, што цэннік дае пералік гравіровак. Выгляд некаторых з іх удалося высветліць. Так, рысунак *«у сухарыкі»* [20] мае выгляд шашачнага арнаменту з гравіраваных матавых і паліраваных квадрацікаў. У цэнтры матавых квадрацікаў размяшчалі шліфаваную бліскучую зорачку, а ў цэнтры бліскучых — матавую. Пад назвай «шашачны» гэты дэкор



*Рыс. 10. Бакал. Урэчча — Налібокі. Пачатак XIX ст. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1645, вышыня 20 см, дыяметр вусця 9,2 см, стапы— 10,2 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 9. Бакал. Урэчча — Налібокі. Канец XVIII — пачатак XIX ст. Кракаў, НМ, № XIII/2398. Публікуецца ўпершыню*

[17] Kameńska L. Manufaktura szklana..., s. 109.

[18] Polak A. Szkło i jego historia, s. 163, 164.

[19] Kameńska Z. Manufaktura szklana..., s. 98.

[20] Сам тэрмін «сухарыкі» мае архітэктурнае паходжанне, што яшчэ раз напамінае аб удзеле радзівілаўскіх архітэктараў у распрацоўцы дэкораў для шкляннога посуду.



*Рыс. 11. Кілішак. Урэчча — Налібокі. Канец XVIII — пачатак XIX ст. Кракаў, НМ, № XIII/2399, вышыня 18,3 см, дыяметр вусця 8,5 см, стапы — 10,2 см. Публікуецца ўпершыню*

упамінаюць і інвентары Налібок (рыс. 16, 32).

*«Авёс шэры»* — стылізаваная выява квітнеючага аўса ў выглядзе гравіраванага матавага кружочка на сцяблінцы, размешчанага між двух лісточкаў (рыс. 21, 23—25). Аздабляў пераважна бутэлькі і шклянкі.

*«Авёс паліраваны ў кратах»* — стылізаваныя паліраваныя выявы «оўсікаў», размешчаныя сярод гравіраваных квадрацікаў ці ромбаў, якія, састаўленыя радамі, ствараюць уражанне крат.

*«Вінаградавы»* — выява вінаграднай лазы з лісцямі і гронкамі, якая то свабодна абвівае пасудзіну, то размешчана ў шлячку (рыс. 46).

*«Пацеркі з гірляндамі»* — круглыя паліраваныя «пацеркі», размешчаныя па лініі ўяўляемай гірлянды (рыс. 17, 21).

*«Зорачкі»* — гэта тры або чатыры скрыжаваныя гравіраваныя рысачкі. Такімі «зорачкамі» маглі пакрываць усю паверхню чашы кілішка або гравіравалі толькі шлячок з іх (рыс. 12, 41).

*«Шлячкі з хвойкамі»* — стылізаваныя выявы хвойных галінак, размешчаныя ў шлячках.

*«З гірляндамі ў лініях»* — гэты рысунак уяўляе сабой гірлянду са шлячкоў (рыс. 17, 18).

*«Зорачкі ў сухарыках»* —стылізаваныя выявы зорачак, размешчаныя ў квадраціках (рыс. 31, 32).

*«Балдахінчык з паліраваным аўсом»* (налібоцкая назва «ламбрэкен з оўсікамі») — стылізаваная выява задрапіраванай тканіны, якая звісае са шлячка з паліраванымі «оўсікамі» (рыс. 38).

Акрамя таго, прымяняліся і іншыя арнаменты: *«карункавы»* — нагадвае карункавае пляценне, размяшчалі яго вакол вусцяў чаш; *«сухарыкі з ялінкай»* — у аснове выява стылізаванай яловай галінкі ўнутры гравіраванага квадраціка ці ромба; *«лісце з фестонамі»* — гірлянда з лісцяў, якая павольна абвівае шліфаваны вузкімі аваламі шлячок; *«авёс шэры вензелем прарываны»*— вензель размяшчалі сярод шлячка з «оўсікаў»; *«шашачны з паліраванымі зорачкамі»* — зорачкі размешча-

ны ўнутры гравіраваных квадрацікаў.

Часцей у якасці дэкору выкарыстоўвалі *манаграмы* (рыс. 11, 12, 15), *«вянкі»* (15), *«фестоны з оўсікаў»* (рыс. 21), *паясочкі, стужкі, «стужкі з вензелямі», «стужкі з кратачкамі»* (рыс. 13) ці *«крутэскамі»* (кратачкі ад слова «краты» — дробная рамбічная сетка; крутэскі — арнамент накшталт арабесак). Сярод раслінных і кветкавых дэкораў часта называюцца *«вінаграднае лісце», «павілёнік»* і *«флеурэткі»* [21]— выява свабодна размешчаных кветак ці букецікаў (ад нямецкага fler). Своеасаблівы выгляд меў арнамент *«балясікі»* (рыс. 14). Блізкімі былі арнаменты *«вузялкі з хвосцікамі»* — выявы завязаных бантам вузкіх шнурочкаў і *«хвосцікі са шлячкамі»* — выявы банцікаў, якія звісаюць са шлячкоў (рыс. 41).

Пералічаныя вышэй дэкоры, якія ўпамінаюцца ў інвентарах Урэцкай і Налібоцкай мануфактур, лічыліся майстрамі ўласнымі, хоць некаторыя з іх прымяняліся на мануфактурах Заходняй Еўропы і Расіі і, магчыма, былі адтуль запазычаны, але моцна стылізаваны мясцовымі гравіроўшчыкамі. Між тым з'явіліся свае, адметныя дэкоры. Мясцовыя арнаменты і сюжэтныя гравіроўкі былі вынікам развіцця вечна жывой народнай творчасці. Наяўнасць дэкору пад назвай «Налібоцкі», які гравіравалі і на Урэцкай мануфактуры, сведчыць, што рысавальшчыкі мануфактур самі стваралі рысункі гравіровак і выкарыстоўвалі пры гэтым мясцовыя матывы (стылізаваныя



*Рыс. 12. Кілішак. Урэчча—Налібокі. Канец XVIII — пачатак XIX ст. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1147, вышыня 16,2 см, дыяметр стапы 9,2 см. Публікуецца ўпершыню*

выявы хваёвых галінак, аўса), папулярныя ў народным беларускім мастацтве сімвалы — *«зорачкі»* і арнаменты — *«шашачны»*, распаўсюджаны ў ткацтве, і *«карункавы»* — у вязанні.

Адначасова ў інвентарах пералічваюцца і дэкоры, якія ўрэцка-налібоцкія гравёры лічылі запазычанымі ў іншых майстроў: *чэшскі, расійскі, з вензелем баварскім, каралеўскі, чэшскі з папярочнымі лініямі, вар-*

[21] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 128—130.



*Рыс. 13. Кілішак. В. Старая Мыш Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Шкляная мануфактура графа Міхала Масальскага. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1641, вышыня 16,2 см. Публікуецца ўпершыню*

З злотых каштавалі бутэлькі, гравіраваныя рысункамі «вінаградны», «авёс паліраваны ў кратах» і «хвойкамі ў шлячках». Столькі ж каштавалі шклянкі і келіхі з накрыўкамі («дэкінглясы»), якія гравіраваліся гэтымі рысункамі.

Сярод гравіраваных дэкораў Налібоцкай мануфактуры ўпамінаюцца рысункі «налібоцкі», «ламбрэкенавы», «вінаградны», шашачны», «варшаўскі» (магчыма, так тут



*Рыс. 14. Кілішак. Урэчча—Налібокі. Канец XVIII — пачатак XIX ст. Кракаў, НМ, № 75744. Публікуецца ўпершыню*

*шаўскі.* Пакуль не ўдалося вызначыць, як выглядаюць усе гэтыя рысункі. Шэраг дэкораў не трэба тлумачыць: *«з вензелем», «з кутасамі», «з аўсом шэрым ламаным», «з аўсом паліраваным без вянкоў», «з паліраваным вензелем саксонскім».*

Самым каштоўным лічыўся посуд, гравіраваны «каралеўскім» рысункам. Калі бутэлька, гравіраваная «аўсом шэрым у сухарыках», каштавала 2 злотых, то бутэлька, гравіраваная рысункам пад назвай «каралеўскі», каштавала 4 злотых. Па

называлі рысунак «каралеўскі»[22].

З рэестра праданых за 1823 г. шкляных вырабаў Налібоцкай мануфактуры ў м. Ляхавічы вынікае, што ў 1-й чвэрці XIX ст. рэзка абмяжоўваліся віды гравіраваных кампазіцый на шклянках, кілішках, бутэльках і графінах, якія прызначаліся для продажу ў беларускіх мястэчках. Сярод сціпла дэкарыраваных вырабаў 1-й чвэрці XIX ст. мы сустракаем шкляны посуд, умерана гравіраваны і шліфаваны, які прызначаўся і для заможных пакупнікоў (рыс. 2, 3, 15, 20). Увогуле гравіраваны дэкор стаў вельмі лаканічным. Прыкметна зменшылася яго значэнне ў мастацкім абліччы посуду.

У 1-й палавіне XIX ст. для беларускіх шкляных вырабаў, прызначаных для масавага пакупніка, больш характэрны гладкія паверхні, сціпла гравіраваныя пераважна геаметрычнымі арнаментамі вакол вусцяў бакалаў і кілішкаў.

Характэрная асаблівасць урэцка-налібоцкага шкла XIX ст. у аздабленні бакалаў і шклянак наіўнымі і простымі па зместу надпісамі, прысвечанымі дню імянін, сяброўству (рыс. 10), Канстытуцыі 3 мая 1791 г., падзеям нацыянальна-вызваленчых паўстанняў 1831 і 1863 гг. (рыс. 42, 43), а таксама лаканічнымі надпісамі «Wiwat» ці «Wiwat-Wiwat» і рознымі сатырычнымі вершамі і памфлетамі (рыс. 8). Апошнія, напрыклад, упамінаюцца ў інвентарах Урэцкай мануфактуры за 1809—1810 гг. Большасць надпісаў выконвалася па заказах пакупнікоў. На



*Рыс. 15. Бакалы. Урэчча—Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Кракаў, НМ, № XIII/2394, вышыня 18,5 см, дыяметр вусця 6,2 см, стапы — 7,3 см; № XIII/2381, вышыня 15.6 см, дыяметр вусця 6,7 см, стапы — 7,5 см. Публікуецца ўпершыню*

бакале (выяўлены ў Кракаўскім Нацыянальным музеі, № XIII/2011) з выявай зграі дваровых сабак і буйнога дужага пародзістага сабакі, які ў імклівым руху кідаецца на іх, выгравіраваны радкі: SKOMŁO WYZLETA BRYTAN NIE UWAZA SPANAŁY JEZYK PODŁYCH NIE URAZA (Высакародных і дужых [маецца на ўвазе людзей] нікчэмныя выказванні ніколі не абражаюць). Бакал з аналагічнай гравіраванай кампазіцыяй і блізкім па зместу надпісам: SKUMLQCYCH WYZLQT BRYTAN MAŁO CO UWAZA WSPANIAŁYCH PODŁY JEZYK

[22] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 4282, с. 2. Рэестр праданых за 1823 г. шкляных вырабаў у мястэчку Ляхавічы.



*Рыс. 16. Кілішак. Урэчча — Налібокі. 1-я чвэрць XIX ст. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1000*

NIGDY NIEURAZA, але большай вышыні (20,5 см) выяўлены намі ў МЭіМП АН УССР (№ 13445). Гравіраваныя надпісы часта спалучаліся з сюжэтнымі кампазіцыямі, якія мелі алегарычны, метафарычны ці сімвалічны сэнс. Зрэдку выконваліся і асобныя сюжэтныя гравіроўкі.

Сюжэтныя гравіраваныя кампазіцыі, якія наносіліся на шкляныя вырабы, прызначаныя для заможнага пакупніка, таксама падвергліся зменам. У канцы XVIII і пачатку XIX ст. яны стужкай апаясвалі чашу келіха, бакала ці кілішка, нібы сцвярджаючы развіццё дзеяння ў прасторы (рыс. 8). У 30—50-я гады гравіраваныя кампазіцыі пераважна размяшчаліся ў авальнай ці прамавугольнай рамцы, чым падкрэслівалася іх адасоблены сімвалічны сэнс. Гравіраваныя кампазіцыі ў асноўным мелі «фасадны характар», г. зн. размяшчаліся з аднаго боку чашы (рыс. 11, 12), але зрэдку і двух (рыс. 17).

Формы посуду для піцця (бакалаў, кілішкаў, флетаў), якія вызначаюцца формамі іх чаш, у 1-й чвэрці XIX ст. значна не змяніліся ў параўнанні з XVIII ст. Памянялася архітэктанічная будова гэтага посуду і як вынік змянілася яго мастацкае аблічча. Посуд набыў манументальнасць за кошт скарачэння ножак, павышэння чаш бакалаў, кілішкаў, флетаў, якія размяшчаліся на плоскіх квадратных подыумах (рыс. 7, 8). Змяніўся і сам характар шкляных вырабаў беларускіх прадпрыемстваў адносна вырабаў XVIII ст. Зніклі манументальныя келіхі, вышыня якіх была 30—50 см, знізілася вышыня бакалаў з 30 да 15—20 см, а кілішкаў — з 20 да 7—8 см. Мастацкае аблічча вырабаў стала прасцейшым (рыс. 6, 10—12, 18, 19). Усё гэта сведчыць аб змяненні адрасата, якому яны прызначаліся. У XVIII ст. іх рабілі галоўным чынам для князя, шляхціца, памешчыка, заможнага гараджаніна і рамесніка.

Формы і дэкоры шклянак у XIX ст. адметна не змяніліся. Агульны выгляд стаў іншым за кошт новых дэкаратыўных кампазіцый, якія адпавядалі дэкорам кілішкаў, бакалаў, графінаў. Тыя ж гірлянды са шліфа-

ваных ззяючых авалаў, перахвачаных двума перавязанымі шнурамі з масіўнымі кутасамі на канцах, што «падтрымліваюцца» вакол вусця арнаментальнымі шлячкамі «з оўсікаў». Донцы на адну трэць шліфаваліся высокімі гранямі, якія асацыіруюцца з пялёсткамі (рыс. 2, 5, 40), або вострымі зубцамі. Адметная прыкмета шклянак XIX ст.— выдзіманне ў форму і адпаведна адсутнасць следу ад понціі.

У XIX ст., напрыклад, формы чаш кілішкаў выдзімаліся наступныя: эліпсападобныя, канічныя (лейкападобныя), цыліндрычныя (з плоскім і авальным дном) і паўсферычныя. Стопы кілішкаў былі квадратныя (дзвюхступеньчатыя і аднаступеньчатыя), а таксама круглыя (плоскія і выпуклыя). Сярод ножак часцей сустракаліся кароткія (шліфаваныя ў 4, 6, 8 граней і «ў ромбы», а таксама гладкія), цэльнацягнутыя з чашай і адвольна фармаваныя. Донцы чаш дэкарыраваліся то шырокімі закругленымі ўверсе гранямі-пялёсткамі, то шліфоўкай «у ромбы», то заставаліся гладкімі (рыс. 9, 10, 12, 15).

У дэкорах урэцка-налібоцкіх бакалаў, фужэраў, кілішкаў і флетаў XIX ст. намецілася пэўная аднастайнасць, таму што прызначаліся яны ўжо для масавага пакупніка і вытворчасць была арганізавана паточная.

Найбольшым зменам падвергліся дэкоры вусцяў і донцаў чаш, ножак і стоп. Калі ў канцы XVIII ст. грані наносіліся ў выглядзе ромбаў, пяці-, шасцівугольнікаў (рыс. 9—11), «у зоркі», «у producer кулькі», то ў пачатку XIX ст. пераважала шліфоўка «ў брыльянт» і «ў сценкі» (рыс. 22—26, 31, 33). Значны ўплыў на архітэктоніку посуду аказвалі дэкаратыўныя фрызы, якія падкрэслівалі форму, надаючы ёй лёгкасць. Дэкаратыўныя фрызы па вусцю чаш звычайна шліфаваліся і гравіраваліся. Найбольш характэрнымі былі шліфаваныя фрызы з арнаментамі «ў кругі», якія чаргаваліся з васьміканцовымі гравіраванымі зорачкамі, «у зубцы», «у трохвугольнікі», «у ромбы». Гравіраваныя арнаменты фрызаў былі карункавыя, гірляндныя, з матавых кругоў, у цэнтры якіх блішчэлі шлі-



*Рыс. 17. Кілішак. Урэчча — Налібокі. Канец XVIII — пачатак XIX ст. Кракаў, НМ, № IV-Sz-801, вышыня 14,4 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 18. Бакал. Урэчча—Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Кракаў, НМ, № XIII/2398, вышыня 15,2 см. Публікуецца ўпершыню*

фаваныя пацеркі, з матавых эліпсаў, што чаргаваліся з чатырохпялёсткавымі кветкамі і чатырма трохлістнікамі [23], «оўсікавыя».

Шліфаваныя дэкоры па тулаве чаш сустракаюцца ў выглядзе вертыкальных палос і гарызантальных шлячкоў, васьміканцовых зорачак, падтрымліваючых гірлянды «з оўсікаў» і гравіраваных шасціканцовых зорачак.

[23] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 99.

Гравіраваныя дэкоры па тулаве чаш часцей сустракаліся з выявамі гірлянд «з ламбрэкена», «з оўсікаў», з вертыкальна пастаўленых авалаў ці «жамчужын», перахвачаных шнурамі з кутасамі на канцах; медальёнаў з манаграмай, увенчанай бантам, і кветкавымі галінкамі па баках або з манаграмай пад каронай, абапал якіх размяшчаліся пальмавыя галінкі, перавязаныя стужкамі; манаграм, ламбрэкенаў, амураў і кошыкаў з кветкамі на фоне паркавай архітэктуры малых форм (рыс. 4).

У выяўленчых гравіраваных дэкорах пераважалі матывы вінаграднай лазы з гронкамі і лісцямі, калосся жыта з кветкамі, рога дастатку, якія падаваліся ў выглядзе арнаментальных шлячкоў, гірлянд. Часцей пачалі ўжывацца раслінныя матывы, у якіх адлюстравалася мясцовая флора (рыс. 14, 30, 35, 36). У сярэдзіне веку вяртаюцца дэкаратыўныя элементы класіцызму 80—90-х гадоў XVIII ст.— лаўровыя і дубовыя галінкі, выявы амураў — і адначасова наглядаецца зварот майстроў да імклівых завіткоў ракако, ракавінак і кветак. Яны размяшчаюцца на чашах класіцыстычных аб'ёмаў чоткіх геаметрычных форм (цыліндрычных, канічных, паўсферычных), устаноўленых на кароткіх ножках з масіўнымі квадратнымі ці круглымі стопамі, якія асацыіруюцца з архітэктурнымі подыумамі ці пастаментамі. Таму ў звычайных утылітарных сасудах адчувалася прэтэнцыёзнасць манументальных скульптурных пабудоў (рыс. 17, 32, 33).

Увогуле ў 1-й палавіне XIX ст. мастацкі вобраз шкляных вырабаў паранейшаму знаходзіўся пад уплывам стыляў і напрамкаў, уласцівых пра-

фесійнай архітэктуры. Шкляны посуд гэтага перыяду сведчыць, што яго формы і дэкоры распрацоўваліся, як і ў XVIII ст., архітэктарамі, якія працавалі пры двары Радзівілаў.

У сярэдзіне XIX ст. пераважае каляровы посуд, сціпла дэкарыраваны гравіроўкай ці роспісам золатам. Для прыкладу разгледзім бакал з сіняга шкла (рыс. 15). Па вусцю застаўся шліфаваны шлячок з рытмічна паўтораных прамавугольнікаў, шліфаванае «ў ромбы» дно чашы плаўна пераходзіць у ножку. З «фасаднага боку» размешчана толькі манаграма.

Даследуючы запазычаныя ў Заходняй Еўропе формы ўрэцка-налібоцкіх вырабаў XVIII ст., можна заўважыць, што многія з іх, прайшоўшы пэўную эвалюцыю, арганічна ўвайшлі ў XIX ст. ужо як формы мясцовыя. Прыкладам можа служыць бакал з высокай крыху расшыранай чашай (рыс. 10), якая пераходзіць у масіўную ножку на круглай стапе. Са змяненнем стыляў у мастацтве XIX ст. вырабы толькі інакш дэкарываваліся, а форма заставалася ранейшай.



*Рыс. 19. Кілішак. Урэчча—Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1285, вышыня 13,8 см, дыяметр вусця 4,5 см, стапы — 5,4 см. Публікуецца ўпершыню*

Калі ў XVIII ст. наглядаецца разнастайнасць форм сярод манументальных келіхаў, то ў XIX ст. гэта характэрна для кілішкаў і бакалаў. Шырока бытуюць кілішкі з эліпсападобнай формай чашы (рыс. 16, 33), якія мы сустракалі і ў XVIII ст. Але іх мастацкі вобраз стаў зусім іншы. Напрыклад, маленькую чашу кілішка (рыс. 33) упрыгожылі гарызантальнымі палоскамі з гладкім граненнем. Яны апаясваюць вусце і сярэднюю частку чашы, край накрыўкі. Акрамя таго, кілішак членіцца яшчэ вертыкальнымі гранямі. Кароткая ножка аздоблена шліфаванымі гранямі, якія паступова пераходзяць на круглую масіўную стапу, размешчаную на квадратным подыуме. Маленькі кілішак вырашаны як урна (але без ручак) антычных часоў. Ён імкнецца да манументальнасці, але яго прызначэнне і памеры знаходзяцца ў супярэчнасці з дэкаратыўным рашэннем і канструктыўнай пабудовай аб'ёмаў. Кілішкі канца XVIII — пачатку XIX ст. мелі яшчэ формы чаш у выглядзе ўсечанага ў верхняй частцы эліпса (рыс. 9, 11, 17). Гэта

эліпсападобная форма эвалюцыяніравала і дала жыццё двум відам бакалаў. Адзін бакал мае рысы класіцызму (рыс. 15). Яго чаша размяшчаецца на высокай балясінападобнай ножцы і мае сціплы гравіраваны дэкор. Бакал чоткі па сілуэту, з дасканалымі прапорцыямі. Урэцканалібоцкія майстры і ў XIX ст. захавалі сваё асноўнае архітэктанічнае правіла — стапа была заўсёды большай (7,5 см) за дыяметр вусця чашы (6,7 см). Чаша бакала дэкарыравана манаграмай, размешчанай у цэнтры вянка са стылізаваных кветак і трылісніковых галінак, а вусце — фрызам, утвораным з матавых кругоў са шліфаванай «жамчужынай» у цэнтры.



*Рыс. 20. Бакал. Урэчча—Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1217. Вышыня 23 см. Публікуецца ўпершыню*

Другі бакал — у стылі ампір з цяжкай масіўнай стапой, размешчанай на подыуме (рыс. 21). Чаша мае форму антычнага кантараса, а канструктыўная будова ножкі і стапы ўскладненая. Чашу падтрымлівае шліфаванае шасціграннікамі «яблыка», размешчанае на канічным чатырохгранным пастаменце, які ў сваю чаргу ўзвышаецца над квадратным масіўным подыумам. Бакал дэкарыраваны шліфоўкай і гравіроўкай. Яго вышыня 11,2 см, дыяметр вусця — 9 см. Па сваіх прапорцыях (дыяметр вусця чашы амаль роўны вышыні) гэты выраб не адпавядае тэрміну «бакал», у якім вышыня звычайна перавышае дыяметр вусця. Ва Урэччы падобныя вырабы называліся «лямпка». У сучасным масавым шкларобстве бакалы з шырока раскрытым вусцем чашы называюцца фужэрамі, крэманкамі, у пачатку XX ст. іх называлі «шампанкамі».

У гэтым бакале своеасабліва перапляліся рысы стылю ампір з яго антычнымі формамі і бідэрмееру з характэрнай для яго масіўнасцю. На ім прыкметны ўплывы пераходнага этапа, калі ў недрах ампіру пачалі з'яўляцца рысы бідэрмееру. Дэкор бакала захоўвае матыў арнаментальных гравіраваных кампазіцый пад назвай «оўсікі», характэрных для канца XVIII—1-й чвэрці XIX ст. Аднак размяшчэнне «оўсікаў» на плоскасці чашы ў выглядзе гірлянд («оўсікі з гірляндамі» — так называўся арнамент Урэчча ў 1817 г.)

сведчыць, што бакал зроблен у 1-й чвэрці XIX ст.

З канца XVIII ст. у XIX ст. перайшлі формы бакалаў з конусападобнай, ці т. зв. лейкападобнай, чашай (рыс. 4, 13, 14, 20, 41). Аднак у XIX ст. іх прапорцыі рэзка змяніліся ў выніку скарачэння вышыні ножкі. Гэта стварыла ўражанне непамернай выцягнутасці чашы. Такія бакалы ў XIX ст. набылі масіўнасць і груваткасць, бо іх чашы часта таксама размешчаны на квадратных тоўстых подыумах. Дэкаратыўныя гравіраваныя кампазіцыі і ў гэтых бакалах прыкметна спрасціліся. Па вусцю размешчан арнаментальны фрыз з «оўсікаў», якія чаргуюцца з вертыкальна пастаўленымі аваламі, а донца і ножка шліфаваны васьмю шырокімі гранямі «ў сценкі» (рыс. 41). Зрэдку арнамент з «оўсікаў» меў выгляд чатырох гірлянд, перахвачаных шнурком з кутасамі на канцах.



*Рыс. 21. Бакал. Урэчча. 1-я чвэрць XIX ст. Кракаў, НМ, № XIII/2376. Публікуецца ўпершыню*

Побач з гэтымі формамі бакалаў і кілішкаў бытавалі кілішкі і бакалы з цыліндрычнымі (рыс. 7, 8, 15, 19) і цюльпанападобнымі чашамі (рыс. 18, 36), а таксама кілішкі канічныя, чашы якіх нібы плаўна перацякалі ў стромкія ножкі (рыс. 30, 31). Кілішкі з цыліндрычнымі чашамі і плоскімі донцамі мелі размешчаныя на квадратных подыумах масіўныя літыя ножкі.

*Посуд у стылі класіцызм* вылучаецца класічнай прастатой форм, сціплымі дэкорамі. Пры канструяванні форм вырабаў перавага аддавалася прамой чоткай лініі, стромкім суадносінам прапорцый, сухаватым геаметрычным формам (конусападобным і паўсферычным). Формы цыліндрычныя хоць і працягвалі існаваць, але значнай ролі ў агульнай колькасці вырабаў яны ўжо не адыгрывалі. У беларускім шкларобстве гэтага перыяду адчуваецца ўплыў антычных узораў посуду, што звязана з распаўсюджаннем стыляў класіцызму і ампіру. З'ява гэта была ўсеагульнай.

У 10—30-х гадах у дэкаратыўных тэхніках пераважала шліфоўка. Амаль уся паверхня сасуда пакрывалася рознымі па канфігурацыі гранямі. Сярод разнастайных рысункаў граней часцей прымяняліся «ў брыльянт», «у значэнні ў брыльянт», «у сценкі», «у ромбы». Паступова чоткасць форм перайшла ў чоткасць ліній арнаменту. У дэкорах перавагу атрымалі арнаментальныя раслінныя і геаметрычныя кампазіцыі і радзей выкарыстоўваліся геральдычныя і сюжэтныя.

Сярод папулярных гравіраваных геаметрычных дэкораў часцей ужываліся «гірлянды з кутасамі», «жамчужыны з гірляндамі». Такі дэкор упамінаецца ў цэнніках гравіраваных работ Урэцкай шкляной мануфактуры за 1817, 1823, 1829 гг.[24] У кілішках з цыліндрычнай чашай, крыху расшыранай уверсе, авальным гранёным дном, масіўнай чатырохграннай ножкай, размешчанай на квадратным подыуме (рыс. 7, 8, 16), дэкор яшчэ захоўвае пераходныя рысы ад XVIII да XIX ст.— спалучэнне шліфоўкі і гравіроўкі, але характар дзвюх бакавых гравіраваных кампазіцый стаў іншым. Дэкор «фасаднага» боку кілішка (рыс. 17) (манаграма пад княжацкай каронай, акаймаваная з двух бакоў пальмавымі галінкамі, перавітымі ўнізе стужкай) не звязаны з гравіраванай кампазіцыяй «тыльнага» боку. Там размешчан так званы «ламбрэкенавы арнамент», які нібы звісае з шырокага матавага шлячка, аздобленага шліфаванымі бліскучымі ромбамі. Вышэй гэтага шлячка яшчэ размешчан арнамент з «оўсікаў». Безумоўна, дэкор атрымаўся featureзнастылявым і не гарманічным, таму што фасадная кампазіцыя з манаграмай чужародна ўклінілася ў папулярны лінейны арнамент XIX ст. і спыніла яго імклівы рух вакол вусця чашы. Магчыма, такое афармленне было зроблена па жаданню заказчыка.

На змену ясным і простым антыкізіраваным формам у стылі класіцызму прыйшлі прэтэнцыёзныя вырабы *ў стылі ампір*, якія ўзнік у Францыі ў эпоху Напалеона і атрымаў шырокае распаўсюджанне ў еўрапейскім дэкаратыўна-прыкладным мастацтве 20—30-х гадоў XIX ст. Гэта прэтэнцыёзнасць вынікала з самой сутнасці Напалеонаўскай імперыі, якая прэтэндавала на сусветнае панаванне [25].

Шкло стылю ампір было звычайна бясколерным, умерана дэкарыраваным і часта манціравалася з бронзай ці мела бронзавую аправу. На Урэцкай мануфактуры быў створан спецыяльны цэх, дзе вырабляліся алавяныя і бронзавыя дэкоры, а таксама канструктыўныя элементы — падстаўкі (пастаменты), накладкі, коркі, накрыўкі, аплёткі, вянчыкі, розныя ўпрыгожанні для сасудаў, умацаванняў люстэркаў і асвятляльных люстраў, жырандолей, кандэлябраў, насценных асвятляльнікаў («кінкетаў»). Рэч з такім прызначэннем цяпер называецца бра. У інвентарах Урэцкай і Налібоцкай мануфактур часта ўпамінаюцца, напрыклад, фляшы, аплеценыя ажурнымі металічнымі дэкорамі [26].

У час панавання стылю ампір на гэтых мануфактурах узніклі новыя формы посуду: чашы келіхаў, падобныя на лодку (ладдзю), жбаны ў форме амфар, чашы бакалаў у формах кратара (рыс. 31), кантараса (рыс. 21), урны (рыс. 39), вытанчаныя ў прапорцыях «чары» (рыс. 26), высокія вузкія кілішкі, што прызначаліся для шампанскага (рыс. 41), і шырокія адкрытыя, як патэра. Сярод дэкораў паявіліся масонскія надпісы і эмблемы, аб чым сведчыць упамінанне 60 масонскіх кілішкаў у

---

[24] Archiwum Głowny Akt Dawnych. AR, U, 1/31, Dz. XIX, p. 13.— Cenniki wyrobów huty Urzeczckiej z 1747—1829; Kameńska Z. Manufaktura szklana..., s. 98.

[25] Кантор А. О стилях.— М., 1962, с. 38.

[26] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 68, 74.

рэестры шліфаваных і гравіраваных работ Урэцкай мануфактуры за 1820 г.[27] З'яўленне масонскіх эмблем на ўрэцкім шкле было невыпадковым. Буйным заказчыкам такога шкла была мінская масонская ложа «Чырвоная паходня», якая размяшчалася на тэрыторыі Верхняга горада ў Мінску (цяпер Музычны завулак, 5). Сярод шліфаваных дэкораў перавагу атрымаў англійскі від шліфоўкі «ў брыльянт» (рыс. 22, 26, 31). Увогуле ампір характарызаваўся ўмеранасцю дэкаратыўных сродкаў.

Напрамак у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве пад назвай «бідэрмеер» (асобныя даследчыкі яго лічаць самастойным стылем) [28] узнік і сфарміраваўся ў Германіі ў 20—30-х гадах XIX ст. Бідэрмеер характарызаваўся перапрацоўкай манументальных форм ампіру на масіўна-ўстойлівыя, але камерна-інтымныя па зместу і прызначэнню. Бідэрмеер стварыў своеасаблівую сістэму афармлення жылога інтэр'ера, уключаючы мэблю, шкляны посуд, люстэркі, люстры, жырандолі, фарфор, фаянс, вырабы з металу, аранжыроўку букетаў. Гэты стыль адлюстраваў павышаную зацікаўленасць да туалетных прыбораў, убранства спальні, гасцінай і г. д. Гэты напрамак (стыль) не быў разлічаны на эфект, а адпавядаў больш сціпламу адносна знаці ўзроўню жыцця і быту нямецкага гараджаніна [29].

У мастацкім шкле *стыль бідэрмеер* узнік у 30-я гады XIX ст. як негатыўная рэакцыя на зіхаценне і бляск шліфаванага «пад брыльянт» крышталю. У гэты час пачало знікаць захапленне гранёным англійскім крышталём, уплыў якога адбіўся на беларускіх вырабах, шліфаваных «пад брыльянт». Крышталёвае граненне выяўляла толькі адну якасць шкла як матэрыялу — гульню святла, зіхаценне ў дробных гранях, што нагадвала ззянне брыльянтаў. Новы стыль у шкле супрацьпаставіў зіхаценню і бляску пластычныя рэльефныя дэкоры, новыя масіўныя формы, якія падкрэслівалі зусім іншыя якасці шкла: цякучасць, падатлівасць руцэ майстра, мяккасць светлавога праламлення ў глыбокіх і тонкіх слаях крышталю і шкла. Дасягнуць вылучэння гэтых якасцей шкла ў масавай вытворчасці вырабаў можна было толькі ў выніку прымянення тэхналогіі ціхага выдзімання, а таксама ліцця вырабаў у форму. Але прымяненне толькі дэкаратыўных элементаў, атрыманых метадам ціхага выдзімання, па меркаванню майстроў 1-й палавіны XIX ст., збядняла мастацкі выгляд вырабаў, і посуд зноў пачалі дашліфоўваць і гравіраваць добра засвоенымі прыёмамі дэкарыравання, што прывяло да дэкаратыўнай перагрузкі шкляных вырабаў, да так званай «шматслоўнасці» дэкору. Сасуды сталі вельмі груваcткімі і таўстасценнымі.

У шкларобстве час бідэрмееру характарызаваўся шырокім выкарыстаннем каляровага шкла, росквітам вытворчасці новых відаў вырабаў са шкла: флаконаў, табакерак, шкатулак, чашак для чаю і кавы, талерак, бісеру.

---

[27] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 124.
[28] Przewodnik po dziale sztuki zdobniczej.— Warszawa, 1936; Кантор А. О стилях, с. 38.
[29] Там жа, с. 36.

Пальма першынства ў вытворчасці мастацкага шкла ў 2-й чвэрці XIX ст. належала чэшскім прадпрыемствам. Чэшскія майстры супрацьпаставілі англійскаму свінцоваму крышталю сваё — «чэшскае» шкло, у якім дабіліся чысціні колеру і крыштальнай празрыстасці менавіта ў бясколерным шкле. У Беларусі і Расіі яго выраблялі пад назвай «бемскае» шкло. У час панавання стылю бідэрмеер чэшскія шкларобы знайшлі новае мастацкае рашэнне для шкла такой якасці дзякуючы новым тэхналагічным і тэхнічным удасканаленням (з'яўленне новых пнеўматычных станкоў і прыстасаванняў, прымяненне тэхналогіі ліцця, прасавання, маліравання, ціхага выдзімання). Таўстасценны з рэльефнымі дэкорамі посуд, які меў пераважна дэкаратыўнае прызначэнне (ужываўся як памятная рэч), выраблялі і на беларускіх шкляных мануфактурах. Менавіта з 2-й чвэрці XIX ст. на гэтых мануфактурах з'явіўся новы асартымент вырабаў: чашкі са сподкамі для чаю, флаконы парфюмерныя, табакеркі, сальніцы, шкатулкі з крышталю і каляровага шкла, у тым ліку накладнога двухслойнага.

У мастацкім шкле Беларусі бідэрмеер характарызуецца падкрэсленай масіўнасцю форм чаш і ножак бакалаў, кілішкаў, а таксама іх стоп, прымяненнем у дэкорах акруглых рэльефных плоскасцей (рыс. 42, 45). Вызначылася тэндэнцыя да падкрэслівання пластычных уласцівасцей шкла. У гэты час формы страцілі сваю класіцыстычную чоткасць і сталі «рыхлымі». Шырока выкарыстоўвалі каляровае шкло і асабліва накладное двухслойнае (рыс. 46, сл. 8) пераважна чырвонага колеру, які атрымліваўся пры афарбоўцы шкляной масы селенам. Такое шкло называлі селенавым. Ва Урэччы ў сярэдзіне XIX ст. вытворчасць вырабаў з селенавага шкла пераўзыходзіла ў 20 разоў выпуск вырабаў са шкла бясколернага [30].

Адначасова выдзімалі посуд з марганцавага шкла, афарбаванага ў фіялетавы колер, а таксама са шкла сіняга, жоўтага, жоўта-зялёнага (салатнага) колеру.

Беларускі посуд у стылі бідэрмеер аздабляўся медальёнамі, у якіх зрэдку размяшчаліся гравіраваныя партрэтныя выявы, краявіды, гербы заказчыкаў, часцей букеты.

Замест накладнога каляровага шкла часта прымянялі люстраное пакрыццё чырвонага, фіялетавага, зялёнага, сіняга і жоўтага колеру. Рысункі на такіх вырабах выконваліся гравіроўкай і шліфоўкай. Сярод гравіраваных кампазіцый пераважалі сцэны палявання, краявіды, выявы вінаграднай лазы, манаграмы (рыс. 45).

Найбольш папулярнымі сярод посуду ў стылі бідэрмеер былі дэкаратыўныя келіхі, бакалы і шклянкі, формы якіх рэзка адрозніваліся ад класіцыстычных і ампірных. У бакалах і кілішках рэзка падкрэслівалася лінія дна чашы выпуклым, шліфаваным у грані кальцом (рыс. 42). Шклянкі мелі плаўнае расшырэнне пры набліжэнні да венчыкаў і часта ўзвышаліся на масіўных паддонах, якія шліфаваліся вертыкальнымі «гладкімі» гранямі. Донцы, ножкі і стопы келіхаў, бакалаў, шклянак, графінаў, чар аздабляліся шэрагам шліфаваных кабюшонаў накшталт

[30] Kameńska Z. Manufaktura szklana..., s. 79.

гатычных контрфорсаў у архітэктуры, якія надавалі рэчам моц, масіўнасць і ўстойлівасць (рыс. 50—52). Вырабляючы посуд сталовы, прытрымліваліся форм функцыянальных, аднак і тут лінія сілуэта была ломанай, яна парушалася выпуклымі шліфаванымі кольцамі з кабюшонамі (рыс. 51).

Галоўнае значэнне пры аздобе посуду мела шліфоўка. Простая геаметрычная англійская шліфоўка «ў брыльянт» набыла большую глыбіню, краі граней сталі больш вострымі, што прывяло да ўзнікнення глыбокага шліфавання. Гэтай тэхнікай на выпуклых крывалінейных формах ствараліся рэльефныя пластычныя дэкоры, асноўнымі элементамі якіх былі то авальныя медальёны, то сігмападобныя завіткі з паўсферычнымі завяршэннямі, зрэдку выкарыстоўваліся стылізаваныя раслінныя матывы (рыс. 43, 44, 45). Звычайна глыбокай шліфоўкай дэкарыраваўся посуд і падсвечнікі з накладнога шматслойнага шкла, а таксама крышталя і добра асветленага бемскага шкла. У гэты перыяд зноў пачалі выкарыстоўваць старыя тэхнікі дэкарыравання: шліфоўку і гравіроўку паверх пластычных дэкораў, закладзеных у форму. Гэта прывяло да эклектызму ў мастацкім шкларобстве, да перагрузкі дэкорам.

Такім чынам, у формах і дэкорах беларускага мастацкага шкла знайшлі адлюстраванне стылістычныя плыні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Заходняй Еўропы XIX ст. Але беларускія майстры па-свойму інтэрпрэтавалі агульнапрынятыя формы і дэкоры, выбіраючы тыя, што адпавядалі іх уяўленням аб прыгажосці, таму гэтыя вырабы можна вылучыць з агульных калекцый заходнееўрапейскага і рускага мастацкага шкла.

# АТРЫБУТАВАННЕ ЎРЭЦКА-НАЛІБОЦКАГА ШКЛА

Праведзены аналіз форм і дэкораў урэцка-налібоцкага шкла на падставе вядомых узораў, даследаваных К. Бучкоўскім, апублікаваных А. Ельскім і А. Урбанскім, дазваляе правесці далейшае атрыбутаванне яшчэ шэрагу вырабаў у калекцыях шкла музеяў Варшавы, Кракава, Масквы, Ленінграда, Львова, Мінска і тым самым пашырыць нашы ўяўленні аб шкляных вырабах гэтых мануфактур у XIX ст.

Інвентары Урэцкай мануфактуры ад 1802 г. і Налібоцкай ад 1823 г. сведчаць аб вырабе ў пачатку XIX ст. графінаў (карафінаў), бутэлек, фляш[31]. К. Бучкоўскі ў сваёй манаграфіі не дае ўяўлення аб форме гэтых вырабаў. У публікацыях А. Ельскага маюцца рысункі графінаў і бутэлек, якія называліся на беларускіх мануфактурах то «карафінкі», то «бутлікі»[32] (рыс. 1, 2). Асаблівую цікавасць уяўляе бутэлька-графін, якая мае форму сучаснай бутэлькі і аздоблена шліфоўкай: горлачка і плечыкі— «у ромбы», а сценкі вакол донца — вертыкальна пастаўленымі авaламі. На тулаве бутэлькі-графіна размешчаны гравіраваныя кветкавыя гірлянды і манаграма WB, акаймаваная вянком. Вянкі з манаграмамі і гірляндамі — гэта элементы дэкору, характэрнага для класіцыстычных твораў рускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пачатку XIX ст. Даная манаграма магла быць на вырабах у той час, калі Урэцкай мануфактурай валодаў Багуслаў Вітгенштэйн, — пасля 30-х гадоў. Значыць, такой формы бутэлькі («карафіны», графіны) выраблялiся ва Урэччы ў 1-й трэці XIX ст.

Па аналогіі можна атрыбутаваць як урэцкія вырабы XIX ст. яшчэ некалькі бутэлек падобнай формы з Кракаўскага Нацыянальнага музея, але з іншымі дэкорамі. Бутэлька № IV-Sz-705 паўтарае тую ж форму, але прапарцыянальна яна больш вузкая. Аб урэцкім паходжанні сведчыць і дэкаратыўнае рашэнне: шліфаваныя выцягнутымі авaламі горлачка, плечыкі і донца,

---

[31] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 9028, с. 8, 11, 12; спр. 4282, с. 2.

[32] Jelski A. Wiadomość historyczna o fabryce szkeł..., s. 24.

а тулава апаясвае арнаментальны шлячок «з оўсікаў» (рыс. 23).

Дзевятнаццатым стагоддзем можна датаваць бутэльку-графін № IV-Sz-1330, блізкую па форме да апублікаванай А. Ельскім, але прапарцыянальна з больш шырокім дыяметрам тулава. У Кракаўскім музеі яна лічыцца вырабам Урэцкай мануфактуры, але датавана XVIII ст. (рыс. 24). Горлачка і донца яе шліфаваны ромбамі, а вакол тулава таксама ўецца арнаментальны шлячок «з оўсікаў». Вышыня без корка 16,2 см, дыяметр дна 6,7 см. Паступіла ў музей з калекцыі Урсына Русецкага. Вядома, што асноўная колькасць урэцка-налібоцкіх вырабаў паступіла ў Кракаўскі Нацыянальны музей у якасці дара У. Русецкага, бацька якога С. Русецкі вядомы калекцыянер шкла.

Мяркуючы па тым, што шліфаваны дэкор тут адыгрывае галоўную ролю і пераважае над гравіраваным, гэту бутэльку можна датаваць XIX ст. Па свайму мастацкаму вобразу яна больш блізкая да вырабаў першай чвэрці XIX ст., але гэта не значыць, што яе не маглі зрабіць у апошнім дзесяцігоддзі XVIII ст. Традыцыйнасць форм і дэкораў тут існавала дзесяцігоддзямі і не было рэзкай грані пераходу ад аднаго стылю ці стагоддзя да другога.

Да Урэцкай вытворчасці можна аднесці і бутэльку-графін з Варшаўскага Нацыянальнага музея (№ 19513 MNW), якая цалкам паўтарае форму і прапорцыі бутэлькі, апублікаванай А. Ельскім. Магчымасць урэцкага паходжання пацвярджаецца і гравіраваным дэкорам «у сухарыкі» («у шашачкі»), які неаднаразова ўпамінаецца ў інвентарах Урэцкай і Налібоцкай мануфактур да 30-х гадоў XIX ст. Графін такой формы і з такім дэкорам быў апублікаваны С. Каменскай як выраб Урэчча [33]. Але, мяркуючы па інвентарах Налібоцкай мануфактуры за 1823 г., арнамент «у шашачкі» гравіравалі і ў Налібоках [34]. Паходжанне бутэлькі-графіна з Варшаўскага музея (№ 19513) не было высветлена. Арнамент «у сухарыкі» выкарыстоўваўся таксама і на шкляной гуце ў Чуднове (УССР). Аднак урэцкая форма і характэрны для ўрэцкіх вырабаў дэкор — шліфоўка горлачка шырокімі авальнымі плоскасцямі, на наш погляд, дае падставу лічыць і гэту бутэлькуграфін урэцкім вырабам XIX ст.

Такую ж форму і прапорцыі маюць і дзве аднолькавыя па дэкору бутэлькі з Варшаўскага музея (№ MNW 19488, рыс. 25, і № 18780, рыс. 41), атрыбутаваныя даволі шырока — «Польшча, XVIII ст.». Вышыня адной 24,5 см, дыяметр донца 8,3 см; вышыня другой 28,5 см. Абедзве паступілі ў музей таксама з калекцыі У. Русецкага, што сведчыць у карысць іх беларускага паходжання. Акрамя характэрнай для Урэчча формы, маецца агульнасць і ў дэкоры. Донцы і верх бутэлек шліфаваны выцягнутымі ў вышыню аваламі, пры гэтым уверсе шырокімі, вакол донцаў — вузейшымі.

Урэцкі інвентар за 1802—1803 гг. таксама падкрэслівае магчымасць іх вырабу там у XIX ст., таму што

[33] Kameńska Z. Manufaktura szklana..., s. 111, фота 33.

[34] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 4282, с. 2.



*Рыс. 22. Бутэлька-графін. Урэчча. 1800—1810. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1623. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 23. Бутэлька-графін. Урэчча. 1-я пал. XIX ст. Кракаў, НМ, № IV-Sz-705. Публікуецца ўпершыню*

ў ім пералічваюцца вырабленыя бутэлькі такой жа вышыні: 24,5 см, 28,5 см [35], акрамя таго ўпамінаюцца бутэлькі і вышынёй 16,5 см, якія мелі розны кошт без уліку дэкору, г. зн. кошт за так званае «гладдзё» [36]. З інвентароў Урэцкай мануфактуры XIX ст. відаць, што, акрамя бутэлек такой формы з названым вышэй дэкорам, яшчэ выраблялі бутэлькі, шліфаваныя «ў брыльянт» і «ў паскі», г. зн. шліфаваныя паяскамі-шлячкамі.

К. Бучкоўскі называе, але не публікуе шліфаваныя «ў брыльянт» вырабы, атрыбутаваныя як урэцканалібоцкія, хоць піша, што звесткі аб выкарыстанні такой шліфоўкі ў Польшчы маюцца толькі ў інвентарах Урэцкай мануфактуры: за 1779 г. — бутэлькі, шліфаваныя «ў

[35] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 9028, с.

[36] Гладдзём і цяпер называецца выдзіманы але не дэкарыраваны посуд.

брыльянт», за 1781 г. — шклянкі, шліфаваныя «ў брыльянт», і асабліва ў вялікай колькасці выраблялі ва Урэччы вырабы з такім дэкорам у 1820 г.[37] Бутэлькі — «карафінкі ў фасоне англійскім» упамінаюцца ў інвентары Урэчча за 1799 г.[38]

У Кракаўскім Нацыянальным музеі захоўваюцца вырабы з падобным дэкорам, атрыбутаваныя як выраб Урэчча, але са знакам пытання — «Урэчча?» Гэта—крышталёвыя шклянка № IV-Sz-1692, якая паходзіць з калекцыі У. Русецкага, а таксама чара № IV-Sz-1737 (рыс. 26), датаваныя 1800—1810 гг. Вышыня чары 11 см, дыяметр вусця 23 см. У атрыбуцыі падкрэслена, што яе хімічны састаў шкла, які вызначаўся спектральным аналізам, тыповы для Урэчча.



*Рыс. 24. Бутэлькі-графіны. Урэчча. 1800—1810 гг. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1330; № IV-Sz-1623. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 25. Фрагмент сервіза. Урэчча — Налібокі. 1790—1820 гг. Варшава, НМ, бутэлька-графін № 19488; кілішак № 18780*

З такім жа дэкорам (шліфоўка «ў брыльянт») у гэтым жа музеі ёсць крышталёвыя бутэлька-графін (рыс. 22) і квадратны ў плане флакон (рыс. 28), які паўтарае форму квадратных квартаў. Улічваючы, што пералічаныя вырабы маюць форму і дэкор, характэрныя для Урэцкай мануфактуры ў 1799—1823 гг.[39], можна атрыбутаваць іх як выраб урэцкі. Тым больш, што тут выраблялі такі крышталёвы посуд і «белае» шкло вельмі высокай якасці [40].

Ёсць яшчэ некалькі вырабаў, не памянёных у публікацыях, але атрыбутаваных са знакам пытання супрацоўнікамі Кракаўскага Нацыянальнага музея як вырабы

[37] Buczkowski K. Downe szkła..., s. 141.
[38] Там жа, с. 174.
[39] AGAD, Dz. XIX, U, 1/III, R., p. 13.
[40] Журнал мануфактур и торговли, 1831, № 9, с. 86.



*Рыс. 26. Чара для садавіны. Урэчча. 1800—1810 гг. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1737. Вышыня 11 см. Публікуецца ўпершыню*

Урэцкай мануфактуры. Гэта сферычнай формы чара са шкла ружовага адцення з вельмі лаканічным дэкорам, № IV-Sz-1741 (рыс. 27). З «фасаднага» боку размешчан класіцыстычнай формы шчыт з выявай герба Радзівілаў «Трубы», а над ім узвышаецца царская карона, якую польскія даследчыкі атрыбутуюць як княжацкую мітру. Але пры параўнанні стылізаваных выяў царскіх карон на фарфоры імператарскага завода ў Пецярбургу з выявай княжацкай мітры відаць, што гэта карона адлюстроўвала дзяржаўную падуладнасць роду Радзівілаў ужо рускаму цару. Карона адначасова з'яўляецца і даціруючым элементам, таму што падобная дэкаратыўная кампазіцыя магла ўзнікнуць толькі пасля далучэння ўсёй тэрыторыі Беларусі да Расіі, г. зн. пасля 1795 г. (трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай). З 1829 г. мануфактурамі валодаў Л. Вітгенштэйн [41] — былы ад'ютант рускага цара Аляксандра I. Таму з'яўленне царскай кароны на ўрэцкіх вырабах было заканамерным. Вышыня чары 13 см, дыяметр тулава 17,5, а вусця — 11,2 см. Паступіла яна ў музей з калекцыі У. Русецкага, публікуецца ўпершыню. Вусце яе шліфавана паўкругамі, якія нібы паўтараюць форму самой чары.

Са шкла такой якасці і колеру выраблена яшчэ адна чара той жа формы і памераў, але з іншым гравіраваным дэкорам (рыс. 27). На геральдычным шчыце мудрагеліста выгнутай формы размешчан герб «Ліс», увенчаны такой жа царскай каронай. Акрамя таго, абапал геральдычнай кампазіцыі размешчаны дзве стылізаваныя галінкі. Дэкор вусця гэтай чары таксама крыху адрозніваецца: форма шліфаваных паўкругоў падкрэсліваецца хвалістай лініяй, з паглыбленняў якой звісаюць «флеурэткі» (так іх называлі майстры).

Да вытворчасці гэтай жа мануфактуры адносіцца і невысокая міска (рыс. 27) са шкла такога ж ружовага колеру, дэкарыраваная ўверсе такімі ж шліфаванымі паўкругамі, а па перыметру яе сценак выгравіраван матавы шлячок, які з «фасаднага» боку пераходзіць у ме-

---

[41] Россия.— М., 1905, т. IX, с. 527, 528; Powiat Oszmiański.— Petersburg, 1900, Cz. 4, s. 19. Пасля смерці ў 1813 г. апошняга наследніка нясвіжскага роду Радзівілаў па мужчынскай лініі Дамініка адзіная яго дачка Стэфанія Радзівіл выйшла замуж у 1829 г. за былога ад'ютанта рускага цара Аляксандра I Льва Вітгенштэйна, які пасля яе смерці ў 1832 г. стаў адзіным уладальнікам дзвюх буйнейшых шкляных мануфактур Беларусі. Пазней мануфактуры перайшлі да яго сыноў Пятра ад жонкі Стэфаніі Радзівіл, а потым да Багуслава ад жонкі княгіні Баратынскай, у сярэдзіне XIX ст.—дачцэ Марыі, па мужу Гогэнлоэ. Такім чынам, апошнімі ўладальнікамі мануфактур былі баварскія князі Гогэнлоэ. На працягу XVIII і XIX стст. усе ўладальнікі аддавалі мануфактуры ў арэнду розным прадпрымальнікам.



*Рыс. 27. Чары і міска. Урэчча. 1820—1830 гг. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1741, № IV-Sz-1743, № IV-Sz-1740. Публікуецца ўпершыню*

дальён. На матавым фоне шлячка выдзяляюцца шліфаваныя бліскучыя авалы, якія былі папулярным дэкаратыўным элементам урэцка-налібоцкіх шліфоўшчыкаў XVIII—XIX стст. і называліся «ў ямкі». Гэты дэкор на вырабе XIX ст. свайго роду даніна традыцыям XVIII ст. У цэнтры ж медальёна размешчан герб «Равіч» (выява жанчыны, якая сядзіць на ідучым мядзведзі, рукі падняты ўверх і павернуты далонямі да гледача). Вышыня міскі 14,5 см, дыяметр вусця 16 см, дна — 5,5 см. Дно міскі ўпрыгожвае шліфаваная разетка.

Да гэтай жа групы вырабаў з ружовага шкла адносіцца трохграннае наверша (№ IV-Sz-1736) ад кандэлябра (рыс. 29, публікуецца ўпершыню). Такія навершы таксама выраблялiся на гэтых мануфактурах у XVIII—XIX стст.[42] Уверсе і ўнізе наверша шліфавана гарызантальнымі палоскамі, якія гравіраваны касымі лініямі. На адным баку размешчан гравіраваны медальён з гербам «Равіч» і графскай каронай над ім. Вянчаюць зубцы кароны ззяючыя шліфаваныя кругі. У XVIII ст. на месцы гэтых кругоў у княжацкіх каронах гравіраваліся стылізаваныя выявы трылiснікаў. Вышыня наверша 19,4 см. Усе гэтыя вырабы таксама паступілі ў музей як дар У. Русецкага.

Ідэнтычнасць формы і шліфаваных дэкораў (арнаментальны шлячок з «оўсікаў») дна, ножкі і стапы ўрэцкага эліпсападобнага кілішка № 30034 MNW (вышыня 11,8 см, дыяметр вусця 7 см), датаванага XVIII—XIX стст., з Варшаўскага Нацыянальнага музея і кілішка № 18780 MNW (вышыня 14 см, рыс. 25), паходжанне якога ў музеі не вызначана, дазваляе і гэты кілішак залічыць да варшаўскай калекцыі ўрэцка-налібоцкіх вырабаў.

Вытворчасць вядомых на Беларусі з XIV—XV стст. «флетаў» асаблівага росквіту дасягнула ў XVIII ст. на Урэцкай і Налібоцкай мануфактурах[43]. К. Бучкоўскі не

---

[42] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 9021, с. 9.

[43] Яніцкая М. М. Беларускае мастацкае шкло (XVI—XVIII стст.).— Мн., 1977, рыс. 73—78.



*Рыс. 28. Флакон. Урэчча. 1800—1810 гг. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1622, вышыня 17,5 см, донца 7×7 см. Публікуецца ўпершыню*

апублікаваў ні аднаго флета XIX ст., А. Ельскі апублікаваў рысункі трох флетаў (рыс. 4, 6)[44], якія па дэкаратыўных рашэннях блізкія да вырабаў XIX ст. Чашы іх цэльналітыя з ножкай. У цэлым формы чаш флетаў не падвергліся зменам. Памянялася тэхналогія іх вырабу ў выніку яе развіцця ва ўсім свеце. Калі раней чаша флета выдзімалася асобна, ножка злучалася ўручную з чашай і адначасова фармавалася шчыпцамі ў гарачым стане, пасля чаго да яе далучалі стапу, зробленую асобна, то цяпер працэс вырабу спрасціўся: чашу і ножку выдзімалі адначасова ў форму і потым далучалі да ножкі толькі стапу, выробленую ўручную. Гэта прывяло да змянення архітэктонікі формы. Зніклі прафіляваныя ножкі, якія былі ўласцівы гэтым сасудам у XVIII ст.: балясінападобныя, а таксама складзеныя з балясіны і «яблыка»; з аднаго «яблыка»; «яблыка» і «денежки». Працэс змянення ножак у флетаў, бакалаў і кілішкаў пачаўся яшчэ ў канцы XVIII ст. Па сутнасці, ножка ў флетаў XIX ст. як такая адсутнічае. Яна стала звужаным працягам чашы. Бывае кароткая і крыху даўжэйшая. Часам яе абхватваюць шліфаваныя грані ў месцах пераходу ножкі ў дно чашы (рыс. 30).

Да атрыбутаваных А. Ельскім флетаў XIX ст. неабходна далучыць флет з Кракаўскага Нацыянальнага музея, № IV-Sz-1691, які сведчыць, што формы стоп флетаў таксама падвергліся стылістычным уплывам XIX ст. Стапа гэтага флета квадратная, як і ў большасці кілішкаў і бакалаў гэтага часу, і прафілявана на два аб'ёмы (больш шырокі — ніжні, вузейшы — верхні). Ножка пераходзіць у чашу паступова, што збліжае гэты флет з двума папярэднімі (рыс. 6). Яна шліфавана вузкімі вертыкальна пастаўленымі аваламі, а ў месцы пераходу ножкі ў дно авалы гравіраваны дзвюма гарызантальнымі лініямі. Гравіраваны фрыз чашы ўяўляе сабой гірлянду з ромбікаў з шасціканцовай зорачкай у цэнтры. Вышыня флета 20,4 см, дыяметр вусця 5,1 см.

Разгледжаныя намі формы і дэкоры ўрэцка-налібоцкіх флетаў дазваляюць зрабіць вывад, што іх ча-

[44] Jelski A. Wiadomość historyczna..., рыс. 14, 30.

шы былі лейкападобнымі і канічнымі, ножкі — цэльнапрадуўнымі з чашай, стопы — круглымі і квадратнымі. У якасці дэкораў выкарыстоўвалі граненне ножак пры пераходзе да чашы, а таксама арнаментальныя гравіраваныя кампазіцыі па вусцях чаш. Сярод арнаментальных матываў сустракаюцца шлячкі «з оўсікаў», гірлянды «з сухарыкаў». Вышыня флетаў вагалася ад 20 да 25 см, дыяметры вусцяў — ад 5 да 8 см.

Па блізкасці арнаментальных кампазіцый вышэй пералічаных флетаў да некалькіх флетаў з фондаў Музея этнаграфіі і мастацкага промыслу АН УССР (г. Львоў) можна вызначыць прыналежнасць апошніх да ўрэцка-налібоцкіх вырабаў.

Флет № 13408 (рыс. 30) мае агульнасць з вышэй названымі ў прапорцыях: вышыня 20 см, дыяметр вусця 6,3 см, квадратная стапа 5,5×5,5 см. Вусце дэкарыравана раслінным арнаментам са стылізаваных галінак, нібы вырастаючых з мудрагеліста выгнутага рога дастатку. Падобны матыў сустракаўся на ўрэцка-налібоцкіх вырабах XVIII ст.[45] Ножка і донца флета шліфаваны «ў сценкі», авальна завершаныя ўверсе, што было вельмі характэрна для вырабаў гэтых мануфактур у канцы XVIII — пачатку XIX ст. Улічваючы, што памеры флета, колер і якасць шкла, дэкор і форма супадаюць з урэцка-налібоцкімі вырабамі XIX ст., лічым магчымым атрыбутаваць яго як выраб гэтых мануфактур XIX ст.

У Музеі этнаграфіі і мастацкага промыслу АН УССР звярнуў на сябе ўвагу яшчэ адзін флет №13439, які мае ідэнтычныя з урэцка-налібоцкімі флетамі форму і дэкор «у сухарыкі» (рыс. 31, публікуецца ўпершыню). Лейкападобная чаша пастуова пераходзіць у шасціграннную ножку, апошняя ў сваю чаргу пераходзіць у круглую стапу, размешчаную на квадратным подыуме. Вусце чашы апаясвае шырокі арнаментальны шлячок з шліфаваных бліскучых авалаў («кулькі»), а сценкі гравіраваны «сухарыкамі», якія ўпамінаюцца ў інвентарах Урэчча за 1820 г.[46] Але ёсць у яго



*Рыс. 29. Наверша кандэлябра. Урэчча. 1820—1830 гг. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1736. Публікуецца ўпершыню*

[45] Яніцкая М. М. Беларускае мастацкае шкло..., рыс. 17, 47.

[46] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 130.

дэкоры і адрозненні ад пералічаных вышэй урэцка-налібоцкіх флетаў. Акрамя гравіроўкі, шліфоўкі і гранення прыменен роспіс золатам. Ім напісаны шасціканцовыя зорачкі, размешчаныя на бліскучых плоскасцях ромбаў — «сухарыкаў», абведзены контуры граней па донцу, ножцы і стапе, зроблены шлячок па вусцю і напісаны чатыры сямілістковыя галінкі па вуглах квадратнага подыума. Урэцкія інвентары з 1.06.1801 г. па 1.06.1802 г. даюць звесткі, што там карысталіся золатам для роспісу шкляных вырабаў [47]. Значыць, роспіс золатам у XIX ст. быў уласцівы ўрэцкім вырабам. Прапорцыі данага флета (вышыня 27 см, дыяметр вусця 7,3 см, стапа 7,5×7,5 см) адпавядаюць прапорцыям урэцка-налібоцкіх флетаў. Такім чынам, ёсць падставы лічыць гэты флет вырабам урэцкай мануфактуры 1-й чвэрці XIX ст.

Флет такіх жа прапорцый знаходзіцца ў Кракаўскім Нацыянальным музеі пад № IV-Sz-1594. Вышыня яго 20,4 см, дыяметр вусця 5,1 см (рыс. 30, публікуецца ўпершыню). Яго вобразная стылістыка таксама адпавядае ўрэцка-налібоцкім вырабам: лейкападобная чаша плаўна пераходзіць у ножку, шліфаваную «ў сценкі», авальна завершаныя ўверсе; стапа квадратная, прафіляваная на два аб'ёмы. Гравіраваны дэкор вусця чашы — мудрагеліста выгнутыя ўвысь раслінныя лісткі, якія чаргуюцца са стылізаванымі кветкавымі галінкамі. Флет паступіў у музей як дар У. Русецкага. Па ўсіх даных гэты флет таксама можа быць залічан да ўрэцка-налібоцкіх вырабаў XIX ст.

На мануфактурах Урэчча і Налібок у канцы XVIII ст. выраблялі бакалы для шампанскага, якія мелі цыліндрычную форму чашы. Іх вытворчасць працягвалася і ў XIX ст. У фондах Кракаўскага Нацыянальнага музея (дакладней, у адным з яго філіялаў—музеі Чартарыйскіх) сустрэты бакал цыліндрычнай формы № XIII/2378, які лічыцца ўрэцка-налібоцкім пад пытаннем. Вышыня яго 24,2 см, дыяметр вусця 4,4 см, квадратная стапа 5,7×5,7 см.

Дакладна атрыбутаваны ўрэцкі бакал гэтай жа формы № IV-Sz-871, датаваны XVIII ст., мае вышыню 30 см, дыяметр вусця 7,5 см, стапа 9×9 см (захоўваецца таксама ў Кракаўскім Нацыянальным музеі). Калі ў памерах данага бакала і вышэй названага маюцца значныя разыходжанні, то форма чашы, дэкор, канструкцыя ножкі ў выглядзе шліфаванага «яблыка», размешчанага паміж дзвюма «денежками», і агульная архітэктанічная пабудова аб'ёмаў ідэнтычныя. Мяркуем, што бакал з музея Чартарыйскіх з'яўляецца вырабам XIX ст. і гэта розніца ў памерах і дэкаратыўным афармленні чашы абумоўлена змяненнем стылю ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве пачатку XIX ст.

Чаша атрыбутаванага намі бакала XIX ст. сціпла дэкарыравана па вусцю не традыцыйным шліфаваным, а залатым шлячком. Адхіленні ў памерах таксама былі вынікам агульнай тэндэнцыі посуду XIX ст. да зменшаных памераў, што наглядаецца і ў кілішках, кубках, квартах, «карафінах».

У Музеі этнаграфіі і мастацкага промыслу АН УССР захоўваецца

[47] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 1161, с. 19.

ваць львоўскую шклянку як урэцка-налібоцкі выраб XIX ст.

Вырабам XIX ст. неабходна лічыць бакал № XIII/2378 (рыс. 31) з Кракаўскага музея (захоўваецца ў фондах яго філіяла — музеі Чартарыйскіх), які там атрыбутаваны як «Урэчча, XVIII ст.» У неабходнасці перагляду дацiроўкі нас пераконвае масіўная форма подыума і канічнай ножкі, ампірная форма чашы, вельмі блізкая да форм рускага фарфору і шкла XIX ст. Вусце бакала гравіравана рытмічна паўторанымі букецікамі кветак, што нібы вырастаюць з рога дастатку. Падобны дэкаратыўны матыў ха-



*Рыс. 30. Флеты. Урэчча — Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Львоў, МЭіМП АН УССР, № 13408, вышыня 20 см, дыяметр вусця 6,3 см; Кракаў, НМ, № IV-Sz-1594, вышыня 21,2 см*

шклянка цыліндрычнай формы (№ 14157), дэкарыраваная «шашачным» арнаментам («у сухарыкі») з распісанымі золатам зорачкамі на паверхні бліскучых ромбаў (рыс. 32). Вышыня 8,7 см, дыяметр вусця 6,5, донца — 6,2 см, што амаль адпавядае памерам атрыбутаванай урэцка-налібоцкай шклянкі № 170512 з Варшаўскага Нацыянальнага музея, якая мае вышыню 9,2 см, дыяметр вусця 6,5, дна — 6,2 см. Вусце атрыбутаванай шклянкі апаясвае матавы шлячок, на якім вертыкальна размешчаны бліскучыя шліфаваныя авалы. Такі ж дэкаратыўны шлячок агінае вусце і львоўскай шклянкі. Прыведзеныя аргументы дазваляюць атрыбута-



*Рыс. 31. Урэцка-налібоцкія вырабы. 1-я пал. XIX ст.: флет, Львоў, МЭіМП АН УССР, № 13439, вышыня 27 см, дыяметр вусця 7,3 см; бакал, Кракаў, НМ, № XIII/2378, вышыня 24,2 см, дыяметр вусця 4,4 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 32. Урэцка-налібоцкія вырабы. 1-я пал. XIX ст. Львоў, МЭіМП АН УССР: шклянка № 14157, вышыня 8,7 см; кілішак № 13355, вышыня 13 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 33. Кухаль і кілішак. Урэчча. Канец XVIII — пачатак XIX ст. Варшава. НМ, кухаль, № 19791, вышыня 17,2 см; кілішак № 30034, вышыня 11,8 см*

рактэрны для ўрэцка-налібоцкіх флетаў і кілішкаў XIX ст., якія разглядаліся вышэй. Трэцяй вызначальнай прыкметай гэтага бакала з'яўляецца шырокі шліфаваны «пад брыльянт» шлячок, размешчаны ў ў ніжняй частцы чашы, а таксама шліфаванае шырокімі авальнымі гранямі дно.

У Кракаўскім Нацыянальным музеі захоўваецца масіўны бакал з накрыўкай (№ IV-Sz-1696, рыс. 39), які мае цыліндрычную чашу з авальным дном, на шырокім гранёным дыску, устаноўленым на квадратнай стапе. Дно чашы, як у большасці ўрэцка-налібоцкіх бакалаў і кілішкаў, шліфавана шырокімі авaламі ў выглядзе пялёсткаў. Між лункамі авалаў «вырастаюць флеурэткі». Нягледзячы на масіўнасць, якую ствараюць тоўстыя сценкі, бакал прапарцыянальны і зграбны. Вусце чашы ўпрыгожана характэрным для ўрэцка-налібоцкіх вырабаў гравіраваным арнаментальным шлячком з ромбікаў. На фасадным баку размешчана стылізаваная выява герба графа Плятара [48] пад графскай каронай. Герб і карону фланкіруюць раслінныя галінкі «з флеурэткамі», абапал якіх выгравіраваны лацінскія літары — J і P уверсе, H і J унізе. Падобная стылізаваная выява кароны ўжо сустракалася на трохгранным навершы кандэлябра, атрыбутаванага польскімі даследчыкамі «Урэчча, сярэдзіна XIX ст.» (рыс. 29). Гэты бакал па вобразнай пабудове вельмі падобны да атрыбутаваных масіўных урэцка-налібоцкіх бакалаў і кілішкаў першай палавіны XIX ст. (рыс. 7, 8, 17). Ён з'яўляецца дарам У. Русецкага і датуецца ў музеі вельмі прыблізна: «Польшча, 1780 г.» Пералічаныя вышэй аргументы дазваляюць аднесці гэты бакал да ўрэцка-налібоцкай вытворчасці XIX ст.

Па манеры гравіроўкі, яе глыбі-

[48] Плятары — вядомы на Беларусі графскі род, які меў значныя зямельныя ўладанні на тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобл.

ні, шырыні калейкі, выразнасці лінейных контураў і якасці шкла да гэтага бакала далучаецца шклянка № IV-Sz-1692, якая захоўваецца ў Кракаўскім Нацыянальным музеі і атрыбутавана «Польшча, XVIII ст.» (рыс. 40). Аднак яна аздоблена стылістычнымі дэкаратыўнымі элементамі, якія выкарыстоўваліся не толькі ў канцы XVIII, але і ў пачатку XIX ст. Герб «Астоя» размешчан свабодна на паверхні шклянкі, а не на геральдычным шчыце, як гэта было характэрна для дэкору XVIII ст., абапал фланкіраван стылізаванымі раслiннымі галінкамі «з флеурэткамі», перавязанымі ў цэнтры стужкай. У XVIII ст. падобныя галінкі «з флеурэткамі» трактаваліся больш рэалістычна, кожны лісцік імкнуліся выгравіраваць так, каб ён нагадваў натуральны лісток на галінцы. А ў XIX ст. гэтыя ж раслінныя галінкі пачалі гравіраваць стылізавана. Гравёры ўжо не імкнуліся да рэальнага падабенства лісця. Да таго ж ініцыялы ўладальніка выгравіраваны не ў выглядзе вензеля ў медальёне, а ў ніжняй частцы гравіраванай кампазіцыі. Дно шклянкі шліфавана шырокімі аваламі, што збліжае яе з іншымі ўрэцка - налібоцкімі шклянкамі XIX ст. Вышыня шклянкі — 9,5 см і дыяметр вусця — 7,6 см адпавядаюць памерам урэцка-налібоцкіх шклянак цыліндрычнай формы, напрыклад пад № 1705/2, якая мае вышыню 9,2 см, дыяметр вусця 6,2 см. Шклянка, якую мы атрыбутуем, паступіла ў музей як дар У. Русецкага.

Сярод новага асартыменту Урэцкай мануфактуры ў інвентарах за 1817, 1823 і 1824 гг. называюцца талеркі [49]. Але няма ніякіх звестак аб



*Рыс. 34. Бакалы. Урэчча — Налібокі. XIX ст. Прыватная калекцыя. Вышыня 10,1 см. Публікуецца ўпершыню*

тым, як выглядалі гэтыя вырабы. У фондах Кракаўскага Нацыянальнага музея знойдзены дзве талеркі (№ IV-Sz-1654 і № IV-Sz-1655), атрыбутаваныя «Польшча, XIX ст.», дэкаратыўныя элементы якіх указваюць на іх блізкасць да ўрэцка-налібоцкага посуду. На адной талерцы — шліфаваны дэкор у выглядзе трох васьміканцовых зорачак, якія чаргуюцца з трыма радамі авальных граней. Наклон граней шліфоўкі на талерцы такі ж, як і на кухлі і кілішку, апублікаваных С. Каменскай (рыс. 33). Аб паходжанні талеркі, кухля і кілішка з аднаго цэнтра сведчыць і адценне бясколернага ледзь задымленага на выгляд шкла, што вызначалася якасцю мясцовага дрэнна ачышчанага пяску. Асабліва прыкметны гэты адценак на вырабах масавага прызначэння.

Другая талерка аздоблена па краю двума арнаментальнымі шляч-

[49] Buczkowski K. Dawne szkła..., c. 174; AGAD, Dz. XIX, U, 1/III, p. 13; Kameńska Z. Manufaktura szklana..., s. 108.

камі: адзін у выглядзе вянка са стылізаваных гравіраваных галінак (у цэнніку Урэцкай мануфактуры за 1817 г. дэкор называўся «шлячок з хвойкамі»)[50], размешчаны бліжэй да краю талеркі, другі складаецца з вертыкальна пастаўленых «флеурэтак». Шкло бясколернае з ледзь ружовым адценнем, якое было вельмі характэрна для ўрэцка-налібоцкіх вырабаў. Паступілі талеркі ў музей з калекцыі У. Русецкага. Ідэнтычнасць адценняў колеру шкламасы, арнаментаў і характару шліфавання («у значэнні ў брыльянт») дазваляе ставіць пытанне аб магчымасці вырабу гэтых талерак на Урэцкай мануфактуры ў 1-й палавіне XIX ст.

Як урэцка-налібоцкі выраб XIX ст. у Варшаўскім Нацыянальным музеі захоўваецца кухаль з накрыўкай, апублікаваны С. Каменскай[51] (рыс. 33). Форму мае цыліндрычную, дэкор — шліфаваныя алмазнай гранню «ў значэнні ў брыльянт» шлячкі вакол вусця і донца, шліфаваныя «ў авалы» сценкі донца і вертыкальная шліфоўка гранямі «ў сценкі» ўсёй паверхні кухля па перыметру да перасячэння з гарызантальна размешчанымі шлячкамі.

Вобразнае рашэнне дэкору кухля асацыіруецца са звычайным бандарным посудам, складзеным з вертыкальна пастаўленых дошчачак і апаясаным металічнымі абручамі. І асацыяцыя гэта невыпадковая. У інвентарах Урэчча за 1801—1802 гг. упамінаюцца шкляныя вырабы, назвы якіх паходзяць ад бандарнага посуду — «цабэрак» ці ад керамічнага — «барыльца»[52]. У дэкоры гэтага кухля шліфоўка спалучаецца з алмазнай гранню. На ім трохвугольныя грані значна ўзбуйненыя і ўяўляюць сабой пераходны від шліфоўкі і гранення ад шлячкоў «у ромбы» да дэкораў пад назвай «у брыльянт», якія мы бачылі на разгледжаных вышэй шклянках, бутэльках (графінах, «карафінах»), місках, флаконах, бакалах. Відавочна, гэты від дэкору меўся на ўвазе, калі пісалі ў справаздачах Налібок «у значэнні ў брыльянт». Розныя віды шліфоўкі «ў брыльянт» добра відаць на адной з бутэлек (рыс. 24).

На падставе аналізу мастацкіх асаблівасцей урэцка-налібоцкага посуду XIX ст., атрыбутаванага польскімі даследчыкамі, мы знайшлі ў музеях Варшавы і Кракава яшчэ шэраг вырабаў, якія па сваіх мастацкіх асаблівасцях (формах, арнаментальных дэкорах і матывах) могуць быць аднесены да вытворчасці Урэцкай і Налібоцкай мануфактур XIX ст.

Увагу прыцягнуў кілішак (№ IV-Sz-1628, вышыня 18 см), чаша якога мае характэрную для ўрэцка-налібоцкага шкла цюльпанападобную форму. Чаша гравіравана характэрным раслінным арнаментам з буйных лісцяў і выгнутых сцяблінак з кветкамі (рыс. 36). Ножка і стапа шліфаваны характэрным для гэтых мануфактур відам грані «ў сценкі», вусце распісана залатым шлячком. Выдзьмуты кілішак з бясколернага шкла з ледзь зеленкаватым адценнем. Форма, дэкор, тэхніка аздаблення і адценне шкла да-

---

[50] Kameńska Z. Manufaktura szklana..., s. 98.

[51] Там жа, с. 36, рыс. 35.

[52] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 9028, с. 35 аб і 36.



*Рыс. 35. Урэчча — Налібокі. XIX ст. Прыватная калекцыя. Вышыня 14 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 36. Бакал. Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Кракаў, НМ № IV-Sz-1628, вышыня 18 см. Публікуецца ўпершыню*

зваляюць атрыбутаваць кілішак як выраб урэцка-налібоцкі 1-й палавіны XIX ст.

Некалькі вырабаў урэцкай і налібоцкай мануфактур гэтага перыяду ўдалося адшукаць у дамах жыхароў Беларусі. Выклікаюць цікавасць два кілішкі (рыс. 34, публікуецца ўпершыню) з празрыстага бясколернага шкла з дробнымі паветранымі пузыркамі ў сценках. Дэкаратыўнае рашэнне сценак і донцаў такое ж, як у вядомых урэцка-налібоцкіх бакалах XVIII ст. з трайнымі выпуклымі абручамі вакол донцаў [53]. Гэта даніна вынаходству менавіта беларускіх гутнікаў XVIII ст., таму што падобнай формы і дэкору бакалы і кілішкі ў вядомых цэнтрах Заходняй Еўропы і Расіі не вырабляліся.

Адначасова выяўлены вялікі кухаль (рыс. 35) з алавянай накрыўкай; форму мае ўсечанага конуса, шкло бясколернае; на ім выгравіраваны папулярны для беларускага шкла сюжэт — алень ля балота ў лясной пушчы. Сюжэт гэты часта ўпамінаецца ў інвентарах Урэчча і Налібок [54]. Кухлі выраблялiся тут і ў XIX ст. Але спецыяльны цэх па вырабу металічных аздоб для посуду, люстраў, люстэркаў, куфэркаў

[53] Яніцкая М. М. Беларускае мастацкае шкло..., рыс. 30—32.

[54] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 172.

для кварт, кандэлябраў і жырандолей меўся толькі пры Урэцкай мануфактуры, што дае падставу лічыць гэты кухаль урэцкім.

З інвентароў Урэчча і Налібок відаць, што ў XIX ст. там выраблялі чашкі і сподкі, талеркі, сальніцы, маслёнкі, чарнільніцы і г. д.[55]

Сярод атрыбутаваных урэцка-налібоцкіх вырабаў гэтага асартыменту ў Кракаўскім Нацыянальным музеі ёсць толькі чашка і сподак XIX ст. (рыс. 37, публікуецца ўпершыню). З улікам новага стылю ў мастацтве XIX ст. яны дэкарыраваны выключна шліфоўкай буйнымі рэльефнымі ромбамі («у значэнні ў брыльянт»), унутры якіх размешчана шліфаваная алмазнай гранню чатырохканцовая зорка. На паверхні чашкі і на сценках сподка размешчана па два рады такіх буйных ромбаў. Дно сподка ўпрыгожана шматпялёсткавай шліфаванай разеткай. Гэтыя віды шліфоўкі былі характэрны для Урэцкай мануфактуры[56]. Вышэй упаміналіся кілішкі з падобным дэкорам.



*Рыс. 37. Чашка і сподак. Урэчча — Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Кракаў, НМ, № XIII/2355, вышыня чашкі 6,3 см, дыяметр сподка 14,3 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 38. Фрагмент сервіза. Урэчча — Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Варшава, НМ, шклянка і кілішак*

У Варшаўскім Нацыянальным музеі захоўваюцца шклянка і кілішак (рыс. 38), аздобленыя гравіраваным арнаментам «ламбрыкены» ў спалучэнні са шлячком «з оўсікаў», атрыбутаваныя як «шкло польскае», без удакладнення мануфактуры, на якой яны былі зроблены. Але яны маюць характэрны для вырабаў урэцка-налібоцкіх мануфактур гравіраваны дэкор, шліфаваныя дэкаратыўныя элементы — шлячок з вертыкальных авалаў вакол донцаў шклянкі і чашы кілішка, плоскую «денежку», якая падтрымлівае чашу на круглай прафіляванай стапе кілішка, размешчанай на плоскім квадратным пастаменце. Цыліндрычная форма шклянкі і эліпсападобная форма чашы ў кілішка адпавядаюць формам вырабаў гэтых мануфактур. Па прыве-

[55] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 9028, с. 7; AGAD, Dz. XIX, U, 1/3, p. 13.

[56] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 56, 141.

дзеных прыкметах шклянка і кілішак аднесены намі да ўрэцка-налібоцкіх вырабаў XIX ст.

У Варшаўскім Нацыянальным музеі маюцца атрыбутаваныя ўрэцка-налібоцкія бакал і кілішак № 18473, якія датуюцца канцом XVIII ст. Кілішак мае лейкападобную форму чашы, што плаўна пераходзіць у суцэльную літую ножку, і круглую стапу. Бакал жа па сваёй архітэктоніцы нагадвае ўрэцка-налібоцкія флеты, аднак ножка яго прапарцыянальна крыху вышэйшая, чым у флетаў. Чаша таксама лейкападобная, ножка прафіляваная на два аб'ёмы, складаецца з «яблыка» і балясіны, стапа круглая.



*Рыс. 40. Шклянка. Урэчча — Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1652, вышыня 9,5 см, дыяметр вусця 7,6 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 39. Бакал. Урэчча—Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Кракаў, НМ, № IV-Sz-1696. Публікуецца ўпершыню*

Па падабенству з гэтымі атрыбутаванымі бакалам і кілішкам мы лічым магчымым атрыбутаваць як урэцка-налібоцкі выраб бакал № 18416 MNW, які захоўваецца ў Варшаве (рыс. 41, публікуецца ўпершыню). Ён мае такую ж лейкападобную форму чашы, шліфаваны аваламі шлячок вакол донца і шліфаваную «ў ромбы» ножку, што было характэрна для вырабаў і XIX ст. Цалкам адпавядае гравіраваным дэкорам Урэчча і Налібок XIX ст. і арнаментальны шлячок «з оўсікаў» вакол вусця бакала і звісаючыя са шлячка гірлянды з шліфаваных бліскучых кругоў і гравіраваных шасціканцовых зорачак. Месцы «прымацавання» гірлянд да шлячка нібы перахвачаны доўгімі шнурамі з кутасікамі на канцах. Вышыня бакала 25,3 см.

Пры параўнанні прапорцый і форм кілішка № IV-Sz-801, упрыго-



*Рыс. 41. Фрагмент сервіза. Урэчча — Налібокі. 1790—1820. Варшава, НМ, бутэлька-графін № 18780, вышыня 24,5; бакал № 18416, вышыня 24,3; кілішак № 18417, вышыня 14 см*

жанага арнаментам «ламбрэкенаў» і атрыбутаванага ў Кракаўскім Нацыянальным музеі як «шкло ўрэцка-налібоцкае, XVIII ст.», з кілішкам з Варшаўскага Нацыянальнага музея № 18417 MNW (рыс. 41), паходжанне якога не высветлена, адзначаецца адпаведнасць не толькі форм і дэкораў чаш, стоп і ножак, але і памераў. Вышыня кракаўскага кілішка 14,4 см, дыяметр вусця 8,8 см, вышыня варшаўскага 14 см, дыяметр вусця 8,2 см. Адхіленні ў некалькі міліметраў пры свабодным выдзіманні чашы і заробцы вусця— рэч натуральная нават для ідэнтычных вырабаў аднаго гутніка. У гэтых кілішках маецца розніца толькі ў гравіраваных кампазіцыях, якія маглі вар'іравацца нават на адных і тых жа формах вырабаў. На варшаўскім кілішку мы бачым шлячок «з оўсікаў» па вусцю, гірлянды з бліскучых шліфаваных кругоў і гравіраваных зорачак, арнамент «кутасоў», ужо сустракаемы на іншых вырабах. Такія форма, дэкор і прапорцыі дазваляюць лічыць і варшаўскі кілішак № 18417 урэцка-налібоцкім вырабам канца XVIII — пачатку XIX ст.

Згодна з архіўнымі данымі Урэцкай і Налібоцкай мануфактур, там у XVIII ст. [57] выраблялася шмат рэчаў у якасці падарункаў і па заказах для царскага двара, калі мануфактуры былі ў складзе Рэчы Паспалітай. Яшчэ больш заказаў выраблялі для сталічных і ўвогуле расійскіх пакупнікоў у XIX ст., калі гэтыя мануфактуры развіваліся ў складзе Расіі і ўладальнікамі былі прыбліжаныя да цара князі Вітгенштэйны. Шмат рэчаў выраблялі з гербамі і манаграмамі рускіх і ўкраінскіх вяльмож, графаў, памешчыкаў, вайскоўцаў. Вырабы гэтыя можна знайсці ў музеях РСФСР і УССР. Так, у Дзяржаўным Гістарычным музеі намі выяўлен шэраг урэцка-налібоцкіх вырабаў, якія мелі агульную атрыбуцыю «Расія» або «Польшча».

Сярод іх тры крышталёвыя (два бакалы і кухаль) былі атрыбутаваны як вытворчасць Польшчы XIX ст., а два (кухаль і бакал) — як вытворчасць невядомых прадпрыемстваў. Усе вырабы аб'ядноўвае ледзь фіялетавае адценне бясколернага шкла, у іх адзінае мастацкае рашэнне ў стылі бідэрмеер, і ўсе яны паступілі з былога музея П. І. Шчукіна. Перш за ўсё ўвагу прыцягнулі на бакалах, атрыбутаваных «Польшча, XIX ст.», над-

[57] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 61, 96, 122.

піс лацінкай і два геральдычныя шчыты з выявамі гербаў Польшчы і герба Вялікага княства Літоўскага (рыс. 42, 43, публікуецца ўпершыню). Шчыты размешчаны з аднаго боку бакалаў, адзін побач з другім. Над шчытамі замест каралеўскай кароны (а яна ў XVIII ст. размяшчалася над гербамі Польшчы і Літвы) дадзена ў промнях сонца распаўсюджаная ў рэлігійным мастацтве Беларусі (каталіцкае і уніяцкае веравызнанне) выява «ўсебачнага вока», акаймаваная трохвугольнікам [58]. На бакалах выгравіраваны дэвіз і эмблема нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863 г., якое ахапіла Беларусь, Літву і Польшчу [59]. Пад геральдычнымі шчытамі размешчан якар, абапал шчыта выгравіраваны лаўровая і дубовая галінкі. Уся кампазіцыя выгравіравана на невялікім узвышаным над сценкамі чашы медальёне. Бакалы таўстасценныя, масіўныя, выраблены метадам «ціхага» выдзімання, г. зн. пластычныя дэкоры ўжо былі закладзены ў сценках нерухомай формы. Уся архітэктанічная пабудова бакала



*Рыс. 43. Бакал. Урэчча — Налібокі. 30—60-я гады XIX ст. Масква, ДГМ, № 1214щ/451 ст, вышыня 13,5 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 42. Бакал. Урэчча — Налібокі. 30—60-я гады XIX ст. Масква, ДГМ, № 8529щ/475 ст, вышыня 14,5 см. Публікуецца ўпершыню*

[58] Жывапіс Беларусі XII—XVIII стагоддзяў.— Мн., 1980, рыс. 87.

[59] БелСЭ, т. 8, с. 351. Хтосьці з удзельнікаў паўстання мог заказаць такія бакалы на Урэцкай ці Налібоцкай мануфактурах, якія ў 1863 г. ужо належалі мясцовым купцам (Урэцкая — Г. Ляйбовічу, Налібоцкая — І. Асоўскаму).



*Рыс. 44. Кухаль. Урэчча — Налібокі. 30—40-я гады XIX ст. Масква, ДГМ, № 88915щ/2830 ст, вышыня 10 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 45. Кухаль. Урэчча — Налібокі 30—40-я гады XIX ст.. Масква, ДГМ, № 88219 щ/606 ст, вышыня 13 см. Публікуецца ўпершыню*

№ 8529щ/475ст (рыс. 42) — эліпсападобная форма чашы, донца, якое падтрымлівае гранёная «денежка», масіўная прафіляваная на два аб'ёмы стапа, але не квадратная, а шасцібаковая — зближае яго з урэцка-налібоцкімі кілішкамі і бакаламі XIX ст. Вышыня 14,5 см, дыяметр вусця 7,3 см адпавядаюць прапорцыям урэцка-налібоцкіх бакалаў і кілішкаў XIX ст. Навізна ў тым, што бакал па вертыкалі дэкарыраван шасцю шырокімі гранямі, якія пераходзяць на «денежку», кароткую ножку і стапу.

Шырокія шліфаваныя грані былі характэрны для заходнееўрапейскага і беларускага шкларобства другой трэці XIX ст.

Другі бакал № 1214Щ/451ст (рыс. 43) з такой жа кампазіцыяй у медальёне, але без надпісу, мае цыліндрычную форму чашы і другое дэкаратыўнае рашэнне «тыльнага» боку бакала, кароткую ножку без дэкору. Стапа круглая, масіўная, шліфаваная шырокімі жалабкамі, якія дзеляць яе на восем трохвугольнікаў. Вышыня 13,5 см, дыяметр вусця 9 см, стапы — 7,5 см. На «тыльным» боку знаходзяцца выпуклы медальён з выгравіраванымі лацінскімі літарамі S і M, акаймаваны тоўстым рэльефным кальцом, і два выгнутыя сігмападобныя рэльефы абапал медальёна, якія размешчаны па дыяганалі адносна вусця. У ніжняй частцы адной і зверху другой рэльефнай «сігмы» ззяюць дзве круглыя плоскасці, дашліфаваныя пасля выдзімання. Абодва бакалы аб'ядноўвае адзінства тэхнік выдзімання і дэкарыравання: пластычныя дэкоры, атрыма-

ныя ў працэсе ціхага выдзімання, і наступная дапрацоўка іх шліфоўкай і гравіроўкай. Улічваючы ідэнтычнасць гравіраваных кампазіцый на фасадным баку чашы, што выдае руку аднаго майстра, і паступленне з адной калекцыі, гэты бакал, як і папярэдні, можна атрыбутаваць вырабам Урэцкай або Налібоцкай мануфактуры.

У ціхавыдзіманым дэкоры трэцяга вырабу з ДГМ — кухлі № 88915/2830 (рыс. 44) рытмічна паўтараюцца элементы сігмападобнага рэльефу папярэдняга бакала, што зближае гэтыя сасуды і сведчыць аб вырабе іх у адным цэнтры. У кухлі таксама выкарастаны тыя ж тры тэхнікі дэкарыравання. Уся



*Рыс. 46. Бакал. Урэчча. Канец XVIII — пачатак XIX ст. Масква, ДГМ, № 52980/1883 ст, вышыня 19 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 47. Кілішак. Урэчча — Налібокі. 1-я пал. XIX ст. Масква, ДГМ, № 62101/1838 ст, вышыня 15 см. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 48. Флакон. Урэчча. XIX ст. Мінск, ДМ БССР, № 17257, вышыня 35,5 см*

гравіраваная кампазіцыя чотка акрэслена шырокімі і глыбокімі гранямі: гарызантальнымі ўздоўж вусця і па перыметру дна, вертыкальнымі — абапал ручкі. Увесь гравіраваны дэкор нібы заключаны ў прамавугольную рамку. Верхні і ніжні пояс дэкаратыўнай кампазіцыі складаецца з «сеткавага» гранення, якое нагадвае «вастраверхае», але тут яно больш дробнае. Мяккія, плаўна-акруглыя лініі пяці сігмападобных рэльефаў, якія чаргуюцца з гравіраваным калоссем, размешчаны па дыяганалі паміж паясамі сеткавага гранення.

Ужо ішла гаворка аб размяшчэнні па дыяганалі на ўрэцка-налібоцкіх кілішках і флетах XIX ст. розных варыянтаў кветкавых кампазіцый, нібы «вырастаючых» з рога дастатку (рыс. 30). Граненне ў выглядзе дробнай сетачкі («кратэсак») у атрыбутаваных урэцка-налібоцкіх вырабах таксама сустракаецца, але ў выглядзе фрыза вакол чаш кубкаў і бакалаў XVIII—XIX стст. На стапе разглядаемага кухля маецца шматпялёсткавая разетка, атрыманая ў выніку ціхага выдзімання ў адпаведную нерухомую форму. Усе лініі плаўныя, акруглыя. Агульны мастацкі вобраз, тэхніка дэкарыравання, вар'іраванне адных і тых жа элементаў у дэкоры дазваляюць аднесці гэты кухаль да вытворчасці таго ж прадпрыемства, што і вышэй разгледжаныя бакалы.

Па колеру шкла і характару дэкору, атрыманага ў выніку ціхага выдзімання, да папярэдніх вырабаў далучаецца вялікі кухаль у форме пашыранага ўверсе цыліндра (№ 88219 щ/606 ст, рыс. 45). Паступіў у музей з калекцыі П. І. Шчукіна. Вышыня амаль такая ж, як і ў бакала № 1214щ/451ст, — 13 см, дыяметр вусця 9,5 см, стапы — 7,8 см. Паверхня чашы кухля раздзелена на тры часткі. На цэнтральнай размешчан медальён, які рэльефна ўзвышаецца над сценкамі. На двух бакавых — сігмападобныя рэльефы, што змыкаюцца ўверсе і раз'ядноўваюцца ўнізе. Месца далучэння ручкі акрэслена, як і ў папярэднім кухлі, глыбокімі гранёнымі плоскасцямі. На медальёне змешчана гравіраваная кампазіцыя — лацінскія літары TDV, якія нібы падтрымліваюцца дубовай і лаўровай галінкамі, звязанымі стужкай. Уверсе кампазіцыю вянчае карона.

Тэхнікай шліфоўкі выкананы шырокія грані вакол вусця кухля, па ручцы, у месцах яе злучэння з чашай. Пяцігранныя шліфаваныя пальмэткі запаўняюць паверхню між плаўных рэльефных ліній медальёна і сігмападобных рэльефаў. Паддон кухля шліфаваны глыбокімі жалабкамі, што ўтвараюць шматпялёсткавую разетку. У тэхніцы шліфоўкі выкананы таксама выявы дзвюх шышак між сігмападобнымі рэльефамі. Кухаль атрыбутаваны ў музеі як «Польшча, XIX ст.»

Гэты кухаль, як і вышэй разгледжаныя рэчы, выкананыя ў тэхніцы ціхага выдзімання, можна аднесці да ўрэцка-налібоцкіх вырабаў XIX ст. Дарэчы, з інвентароў Урэцкай і Налібоцкай мануфактур XIX ст. вынікае, што там выраблялі ў вялікай колькасці і піўныя кухлі[60].

Да гэтага часу быў вядомы ўсяго адзін атрыбутаваны кухаль гэтых мануфактур, датаваны XVIII—XIX стст. (рыс. 33).



*Рыс. 50. Графін і кілішак. Урэчча — Налібокі. 1830—1840 гг. Мінск, ДМ БССР*

Агульная мастацкая стылістыка разгледжаных вырабаў — таўстасценнасць сасудаў, плаўныя лініі сігмападобных рэльефаў, спалучэнне ў дэкоры трох розных тэхнік (гранення, шліфоўкі, гравіроўкі) і ціхага выдзімання, акрэсленыя рамачныя або медальённыя кампазіцыі, масіўнасць ножак і стоп — сведчыць, што вырабы былі зроблены ў 60-я гады XIX ст. Менавіта гэтымі рысамі адзначан у шклароберстве стыль бідэрмеер. Атрыбутаваныя намі рэчы вельмі падобны да чэшскіх сувенірных вырабаў, пад уплывам якіх яны зроблены, але адрозніваюцца



*Рыс. 49. «Бутлікі». Урэчча. Сярэдзіна XIX ст. Мінск, ДМ БССР*

[60] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 9028, с. 12, 15, 36.

ад сваіх першаўзораў. Іх прапорцыі прысадзістыя, больш масіўныя сценкі, донцы і стопы, ножкі занадта ўкарочаны. Замест шліфаванага яблыка пад чашай меншага беларускага бакала размешчана «денежка», замест разетападобнай формы стапы зроблена 8-гранная. У большага бакала пераход ад чашы да стапы аформлены круглай, а не шліфаванай кароткай ножкай, у той час як у чэшскіх—чаша непасрэдна пераходзіць у стапу за кошт перахвату ў дне. Варта напомніць, што ўладальнікам мануфактур у гэты час быў баварскі князь Гогэнлоэ, які ажаніўся на дачцэ Л. Вітгенштэйна Марыі і атрымаў за жонкай пасаг — шкляныя мануфактуры. Такім чынам, сувязі з Германіяй, а значыць, і Чэхіяй і іх уплывы былі самыя непасрэдныя. Па запрашэнню гаспадароў у налібоцкі маёнтак Радзівілаў наведаўся нават прускі кайзер Вільгельм І, які любіў паляваць у Налібоцкай пушчы.

Пры вывучэнні шкляной калекцыі вырабаў Дзяржаўнага Гістарычнага музея было выяўлена яшчэ некалькі пасудзін беларускіх цэнтраў. Напрыклад, бакал № 52980/1883 ст, зроблены з накладнога чырвонага (рубінавага) шкла па бясколернаму, чаша якога аздоблена выявай вінаграднай лазы з гронкамі (рыс. 46). Трактоўка дэкору рэалістычная. У тэхніцы матавай гравіроўкі выкананы галінкі і лісце, у тэхніцы шліфоўкі — гронкі вінаграду. Кантрастнае супрацьпастаўленне матавых і бліскучых плоскасцей шкла было ўлюбёным дэкаратыўным прыёмам урэцка-налібоцкіх майстроў усіх пакаленняў, г. зн. на працягу ўсяго XVIII і XIX стст. Форма чашы цюльпанападобная, дно плоскае, што было характэрна для пэўнага віду кілішкаў гэтых мануфактур у XVIII—XIX стст.[61] Ножка высокая, канструюецца з двух балясін. Стапа круглая, прафіляваная на два аб'ёмы. Па яе перыметру ўецца шлячок таксама з вінаграднай лазы. Гэты дэкаратыўны прыём аздобы стапы (у выглядзе вянка вакол ножкі) ужываўся на працягу XVIII ст.[62] На ніжняй кромцы чашы выгравіраван надпіс: «На Pamiątku КochaНemu ojcu i Się mnie rzychiemy od S. A i М». Зробленая ў тэксце памылка (замест лацінскай літары N выгравіравалі кірыліцай Н) сведчыць, што надпіс гравіраваў майстар, які прывык пісаць кірыліцай. Інвентары Налібок у гэты час часцей пісаліся на рускай мове, чым на польскай. Падобны надпіс безумоўна быў зроблен па просьбе заказчыка.

У інвентарах Урэчча пачынаючы з 1780 г. рэгулярна сустракаюцца звесткі аб гравіраваных дэкорах з вінаграднымі лісцямі і гронкамі[63]. У 1802—1803 гг. гэтым дэкорам упрыгожвалі бакалы з накрыўкамі пад нямецкай назвай «deckelpokal» (у інвентарах іх называлі «дэкінгляс»), шклянкі, бутэлькі, флеты і кілішкі. У 1823 г. гэтым дэкорам упрыгожвалі толькі шклянкі, бутэлькі, карафкі і кілішкі. На рыс. 4 мы бачым бакал-«дэкінгляс», апублікаваны А. Ельскім. Прапорцыі данага бакала (вышыня 19 см, дыяметр вусця 11 см, стапы — 12,5 см)

---

[61] Яніцкая М. М. Беларускае мастацкае шкло..., с. 64.

[62] Там жа, рыс. 9—12, 34—38, 40, 43, 44—48.

[63] Buczkowski К. Dawne szkła..., s. 129; ЦДГА БССР, ф. 694; воп. 2, спр. 9028, с. 7, 10, 11; спр. 4272, с. 2.

адпавядаюць прапорцыям урэцка-налібоцкіх бакалаў XIX ст. Аднак ножка падобнага профілю пакуль што не сустракалася.

З інвентару налібоцкай мануфактуры ад 23 мая 1799 г.[64] відаць, што там выраблялі бакалы з чырвонага, фіялетавага, сіняга і зялёнага шкла з выкарыстаннем гравіроўкі і шліфоўкі. Такім чынам, гэты бакал можа паходзіць з названых мануфактур.

Вельмі нагадвае формай і дэкорам урэцка-налібоцкія вырабы XIX ст. кілішак № 62101/1838 ст з Дзяржаўнага Гістарычнага музея, датаваны канцом XVIII ст. (рыс. 47). Паходжанне кілішка ў музеі пакуль не вызначана. Форма чашы эліпсападобная, ножка цэльнафармаваная з чашай. Дно чашы і ножка шліфаваны «ў ромбы», стапа круглая. Понція не зашліфавана, значыць, кілішак вырабляўся свабодным выдзіманнем. Вакол вусця шлячок «з оўсікаў». Гравіраваная кампазіцыя мае фасаднае рашэнне: манаграма з лацінскіх літар J і S пад княжацкай каронай размешчана між дзвюх стылізаваных пальмавых галінак, лісці якіх чаргуюцца з дробнымі трыліснікавымі галінкамі. Унізе галінкі перавязаны стужкай, завязанай бантам. Спосаб завязвання банта сведчыць аб стылістычных прыкметах XIX ст. Ледзь фіялкавае адценне шкла і не зашліфаваная понція таксама збліжаюць гэты кілішак з урэцка-налібоцкімі вырабамі канца XVIII — пачатку XIX ст. Гравіраваная кампазіцыя, шліфаваныя «ў ромбы» ножка і дно цалкам адпавядаюць мастацкаму абліччу вырабаў гэтых мануфактур. Памеры кілішка (вышыня 15 см, дыяметр вусця 5,7, стапы — 7,2 см) паўтараюць прапорцыі іншых беларускіх кілішкаў. Прыведзеныя вышэй аргументы даюць падставу залічыць яго да калекцыі ўрэцка-налібоцкіх вырабаў XVIII—XIX стст.

Можа ўзнікнуць пытанне: як трапілі ў ДГМ вырабы беларускіх шкляных мануфактур? Існуе некалькі шляхоў і магчымасцей для паступлення ўрэцка-налібоцкіх вырабаў у ДГМ.

Адразу агаворымся, што вырабы беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у тым ліку і мастацкага шкла, розных стагоддзяў папалі ў ДГМ з калекцыі П. І. Шчукіна, аб чым ёсць звесткі ў салідным дарэвалюцыйным выданні «Художественные сокровища России»[65]. Вядома, што П. І. Шчукін меў багатую калекцыю беларускіх твораў розных галін мастацтва і перадаваў яе ў ДГМ, куды трапіла таксама калекцыя Румянцаўскага музея ў Маскве. М. П. Румянцаў быў актыўным збіральнікам усіх відаў помнікаў культуры і мастацтва Беларусі, з 1814 г. жыў у бацькаўскім палацы ў Гомелі, удзельнічаў у першых археаграфічных экспедыцыях па Беларусі, сабраў у Беларусі і спачатку размясціў у Гомельскім палацы значныя калекцыі нумізматыкі, этнаграфіі і беларускіх старажытных дагавораў і грамат; апошнія выдаў у 1824 г. — «Белорусский архив древних грамот»[66]. Яго гомельская калекцыя стала асновай для ства-

[64] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 174.

[65] Художественные сокровища России.— СПб., 1902, № 6, с. 120.

[66] Очерки истории исторической науки в СССР.— М., 1955, т. 1; БелСЭ, т. 9, с 182.



*Рыс. 51. Фрагмент сервіза. Урэчча — Налібокі. 1830—1840 гг. Ленінград, ДРМ. Публікуецца ўпершыню*

рэння Румянцаўскага музея ў Маскве.

Маюцца звесткі, што ў ДГМ трапіла і частка калекцыі мастацкіх каштоўнасцей Беларусі, якія былі сабраны ў Віленскім музеі старажытнасцей [67]. Яна была вывезена па загаду М. М. Мураўёва (генерал-губернатара Паўночна - Заходняга краю) у 1865 г. пасля закрыцця Віленскай археаграфічнай камісіі і здадзена ў Румянцаўскі музей [68]. А з Румянцаўскага музея ўвайшла ў калецыю сучаснага ДГМ, які ўзнік галоўным чынам на базе Румянцаўскага музея [69].

Некалькі шкляных вырабаў беларускіх мануфактур выяўлена ў музеях Ленінграда. У Дзяржаўным Рускім музеі знойдзены набор посуду, аздоблены авальнай формы шліфаванымі кабюшонамі (рыс. 51, 52), аналогіі якому маюцца сярод

[67] Каталог предметов музея древностей, состоящего при Виленской публичной библиотеке.— Вильна, 1885; Виленский музей древностей.— Вильна, 1892. Музей створан беларускім графам Я. П. Тышкевічам, ураджэнцам г. Лагойска (Мінская вобл.) на аснове яго ўласнай калекцыі сусветных і беларускіх старажытнасцей (зброі, слуцкіх паясоў, шкла, жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, археалагічных находак з Беларусі, старажытных рукапісаў і г. д).

[68] Бекетов П. Т. Русские бары.— Старые годы, 1908, с. 112.

[69] Государственный исторический музей: Путеводитель.— М., 1964.



*Рыс. 52. Фрагмент сервіза. Урэчча — Налібокі. 1830—1840 гг. Ленінград, ДРМ. Публікуецца ўпершыню*

беларускага шкла з калекцыі Дзяржаўнага музея БССР (рыс. 50).

У Дзяржаўным Эрмітажы захоўваюцца кілішкі № 1263 Э/рс і № 1258 Э/рс і бакал № 1260 Э/рс, па форме і дэкаратыўнаму рашэнню вельмі блізкія да ўрэцка-налібоцкіх вырабаў XIX ст. Формы чаш кілішкаў лейкападобныя, а бакала — цыліндрычная. Ножкі масіўныя, кароткія, шліфаваныя чатырма гранямі. Стопы квадратныя, прафіляваныя на два аб'ёмы. Донцы чаш шліфаваны вертыкальнымі аваламі, якія, нібы пялёсткі, абхватваюць чашу. Вакол вусця ідуць шырокі і вузкі шлячкі. Шырокі — аздоблены дыяганальна пастаўленымі аваламі, унутры якіх размешчаны зорачкі і раслінныя галінкі. К. Бучкоўскі лічыць гэты арнамент характэрным для польскіх шкляных вырабаў, галоўным чынам урэцка-налібоцкіх, у 1780—1820 гг.[70] Пад шырокім шлячком размешчан вузейшы, на якім чаргуюцца невялікія авалы і шасціканечныя зорачкі. Донцы чаш шліфаваны вузкімі гранямі. Гравіраваны дэкор верхняй часткі кілішкаў аддзелен глыбокай гравіраванай лініяй ад дэкору шліфаванага. Вышыня кілішкаў 15,8 см і 12 см, бакала — 17,5 см, дыяметры вусцяў кілішкаў 9,2, бакала — 5,6 см, што адпавядае памерам урэцка-налібоц-

[70] Buczkowski K. Dawne szkła..., s. 139.

кіх вырабаў падобнага асартымен-ту.

Мастацкае аблічча і архітэктоніка гэтых кілішкаў блізкія да ўрэцка-налібоцкага кілішка № XIII/2400 (Кракаўскі музей), які мае вышыню 15,2 см, дыяметр вусця 9,2 см. Дэкаратыўнае афармленне дна чаш, формы ножак і стоп, гравіраваныя кампазіцыі вакол вусцяў кілішкаў і бакала паўтараюць формы, а таксама дэкаратыўныя элементы і многіх іншых урэцка-налібоцкіх вырабаў, што дае падставу залічыць іх да вытворчасці гэтых мануфактур XIX ст.

Існуе некалькі шляхоў пранікнення ўрэцка-налібоцкіх вырабаў у Пецярбург. У 1825 г. майстры Урэчча выканалі па загаду Аляксандра I заказ на вырабы для імператарскага палаца, за што імператар узнагародзіў іх 50 рублямі [71].

Акрамя таго, неабходна ўлічваць і факт пражывання самога ўладальніка Вітгенштэйна, яго сям'і і нашчадкаў у Пецярбургу на працягу 1-й палавіны XIX ст. Натуральна, яны імкнуліся выкарыстаць такі вялікі рынак збыту для шкляных вырабаў, якім быў Пецярбург у XIX ст.

Даследчык рускага мастацкага шкла I. Лазарэўскі адзначаў вялікі ўплыў польскага шкларобства пры Аляксандры I на формы рускага крышталю (1801—1825 гг.) «Шмат польскага крышталю разам з іншымі рэчамі раскошы было прывезена ў Расію і паслужыла ўзорам для рускіх майстроў, — пісаў ён. — Адкуль як не з Польшчы прыйшло захапленне флаконамі, у корках якіх мудрагеліста былі выраблены маленькія флаконы? Адкуль як не з польскіх замкаў прыйшлі да нас двайныя келіхі — адзін на адным, разлапістыя флягі, «рэпчатыя» флаконы і многае іншае мілае па формах і чароўнае па арнаментацыі» [72].

Фактычна I. Лазарэўскі аналізаваў не столькі працэс уплыву «польскага шкла» на формы і дэкоры рускага шкла і крышталю, колькі само паступленне ўрэцка-налібоцкіх вырабаў як у гандлёвыя рады Санкт-Пецярбурга, так і для ўжытку ў імператарскім палацы і палацах прыдворных вяльмож. Па звестках С. Каменскай [73], Урэцкая мануфактура спыніла сваю дзейнасць у 1846 г., а па звестках М. Болбаса, нешырокі асартымент вырабаў — галоўным чынам кілішкі і шклянкі — на ёй выраблялі і ў 1866 г.[74] Таму гэтых «мілых па формах і чароўных па арнаментацыі» вырабаў I. Лазарэўскі ўжо і не наглядаў у калекцыях рускага шкла і крышталю пасля закрыцця мануфактур.

Вяліся пошукі ўрэцка-налібоцкага шкла і ў музеях БССР. Але беларускія музеі былі разрабаваны ў час Вялікай Айчыннай вайны, і ў іх выяўлена вельмі мала вырабаў гэтых мануфактур. Да таго ж калекцыі шкла ўвогуле вельмі маленькія і скамплектаваны пасля Вялікай Айчыннай вайны з той нязначнай колькасці музейных рэчаў, якія былі вернуты ў Беларусь. Некалькі вырабаў XIX ст. урэцка-налібоцкіх мануфактур выяўлены ў Дзяржаўным музеі БССР.

---

[71] Jelski A. Wiadomość historyczna..., s. 232.
[72] Лазаревский И. Заметки о русском цветном хрустале и стекле.— Среди коллекционеров. Пб., 1917, изд. 2, с. 215.
[73] Kameńska Z. Manufaktura szklana w Urzeczu (1737—1846).— Warszawa, 1964.
[74] Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 157.

Да ўрэцка-налібоцкіх вырабаў XIX ст. новага асартыменту неабходна далучыць флакон (№ 17257, рыс. 48) з бясколернага шкла з ледзь дымчатым адценнем, дакладна такім, як у адной талерկі, кухля і кілішка, разгледжаных вышэй. Флакон мае цыліндрычную форму, пакатыя акруглыя «плечыкі», прыцёрты корак. Вышыня яго без корка 35,5 см, з коркам — 38 см, дыяметр дна 11 см, верх корка мае дыяметр 6 см, унутраны дыяметр горлачка 4,5 см, вонкавы — 6,5 см. Выраблен метадам свабоднага выдзімання. Понція зашліфавана гладка ў форме круглай «аптычнай ямкі». Уся цыліндрычная паверхня флакона члeніцца на тры гарызантальныя паясы, дэкарыраваныя шырокімі двайнымі гранямі «ў сценкі», што чаргуюцца ў шахматным парадку з прамавугольнымі плоскасцямі, шліфаванымі «пад буйны брыльянт». Верхні рад двайных гладкіх «сценак» сутыкаецца ў ніжнім радзе з вастраверхім шліфаваннем «у значэнні ў брыльянт». Плечыкі флакона па перыметру дэкарыраваны шліфаванымі плоскімі кругамі, якія рытмічна паўтараюцца. Шырокія плоскія прамавугольныя грані «ў сценкі» падкрэсліваюць чысціню і празрыстасць шкла, а шліфаванне «пад буйны брыльянт» — яго ззянне.

Горлачка ў флакона цыліндрычнае, вышыня 3,5 см. З фасаднага боку флакона ў цэнтры шліфаванага вертыкальнымі аваламі прамавугольніка размешчан медальён з гравіраванай манаграмай з лацінскіх літар К і Р, што ўказвае на імя ўладальніка гэтага флакона. Знойдзен флакон выпадкова ў час земляных работ у г. п. Хойнікі Гомельскай вобл. У ім знаходзілася пісьмо К. Празароўскага, адрасаванае маці. Празароўскія—памешчыкі Беларусі, якія мелі ўладанні ў Віцебскай і Гомельскай абласцях. Прыватныя архівы роду Празароўскіх захоўваюцца ў Варшаўскім архіве старажытных актаў.

Блізкасць мастацка-дэкаратыўных шліфаваных элементаў флакона да такіх жа дэкораў кухля і кілішка, апублікаваных С. Каменскай, ідэнтычнасць адцення бясколернага шкла дазваляюць лічыць гэты флакон вырабам Урэцкай мануфактуры XIX ст.

Акрамя таго, у ДМ БССР захоўваецца бутэлька і графін (рыс. 49) з шарападобнымі тулавамі і доўгімі горлачкамі. У гэтых вырабаў формы традыцыйных урэцка-налібоцкіх бутлікаў XVIII ст.[75] У адрозненне ад сваіх прататыпаў яны аздоблены тэхнікай краклe, якая стала папулярнай у XIX ст. Падобнай формы бутлікі надрукаваў А. Ельскі (рыс. 1). На гэтай падставе бутэлька і графін атрыбутуюцца як вырабы ўрэцка-налібоцкія сярэдзіны XIX ст.

Там жа выяўлены крыштальны графін (з коркам), зроблены ў тэхніцы ціхага выдзімання. Яго сценкі аздоблены буйнымі медальёнамі і кабюшонамі (рыс. 50). Вернуты ў БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны як беларускі музейны экспанат, вывезены фашыстамі ў 1941—1944 гг. Гэтыя пластычныя дэкаратыўныя элементы характэрны для вырабаў сярэдзіны XIX ст. і адлюстроўваюць уплывы стылю бідэрме-

[75] Яніцкая М. М. Беларускае мастацкае шкло..., рыс. 58—62.

ер. Посуд з такім дэкорам сустракаецца на палотнах беларускіх жывапісцаў XIX ст., што сведчыць аб яго шырокім распаўсюджанні ў побыце беларускай шляхты. Створан падобны посуд пад уплывам чэшскіх майстроў шкла. Цэлыя сервізы з такім дэкорам (шклянкі, кілішкі, чашы, вазы для садавіны і дэсерту і г. д., рыс. 51, 52) выяўлены ў Дзяржаўным Эрмітажы і атрыбутаваны як вырабы ўрэцка-налібоцкія сярэдзіны XIX ст.

Нягледзячы на тое што на вырабах Налібоцкай і Урэцкай шкляных мануфактур прыкметны ўплывы англійскіх, чэшскіх і нямецка-аўстрыйскіх цэнтраў шкла ў выніку распаўсюджання мастацкіх стыляў у шклаþобстве ўсіх краін, мастацкі ўзровень вырабаў вызначалі мясцовыя майстры. Амаль стапяцідзесяцігадовы час дзеяння гэтых мануфактур ва ўмовах розных дзяржаў дазваляе разглядаць урэцка-налібоцкае шкло як з'яву нацыянальную, абавязаную сваім развіццём мастацкай культуры беларускага народа. Беларускія майстры змаглі надаць урэцка-налібоцкаму шклу самабытныя рысы.

Мастацкі ўзровень шкляных вырабаў буйных крышталёвых мануфактур графа Салагуба (пазней П. Салтыкова) у в. Ілья, графа М. П. Румянцава ў г. п. Беліцк, графа З. Чарнышова ў г. Чачэрску, князя Р. А. Пацёмкіна ў вв. Ушакі, Усвяты і г. Крычаве, якія ўзніклі ў XVIII ст. і дзейнічалі на працягу 1-й палавіны XIX ст., яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў.

# Мастацкае шкло Беларусі апошняй чвэрці XIX– пачатку XX ст.



У КАНЦЫ XIX І ПАЧАТКУ XX ст.
МАСТАЦКАЕ ШКЛО БЕЛАРУСІ
ЗНАХОДЗІЛАСЯ Ў АГУЛЬНЫМ
РЭЧЫШЧЫ ПОШУКАЎ
НОВЫХ СРОДКАЎ ВЫРАЗНАСЦІ,
ЯКІЯ Б АДПАВЯДАЛІ
ЗМЕНЛІВЫМ УМОВАМ ЖЫЦЦЯ
ГЭТАГА ЧАСУ.
НА ГЭТЫМ ЭТАПЕ ЎЗНІК І ЗАВАЯВАЎ
ВЯДУЧЫЯ ПАЗІЦЫІ
СТЫЛЬ МАДЭРН,
З ЯКОГА ПАЗНЕЙ
ВЫЛУЧЫЛІСЯ СТЫЛЯВЫЯ НАПРАМКІ
КАНСТРУКТЫВІЗМУ
І ФУНКЦЫЯНАЛІЗМУ

# СТАН РАЗВІЦЦЯ ШКЛАРОБСТВА І АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ВЫРАБАЎ

У 60-я гады XIX ст. Урэцкая і Налібоцкая мануфактуры спынілі сваю дзейнасць. Аднак шкларобства Беларусі працягвала развівацца, нягледзячы на тое, што ў гэты час не было створана такіх значных прадпрыемстваў па вырабу мастацкіх шкляных рэчаў, якімі ў свой час славіліся вышэй разгледжаныя мануфактуры. Вырасла колькасць шклозаводаў, якія выпускалі масавыя вырабы — графіны, бутлі, бутлікі, бутэлькі, кварты, шклянкі, кілішкі, кухлі, бакалы, лямпавае і аптэчнае шкло, слоікі для саленняў і варэння і г. д. На шасці заводах вырабляліся шкляныя лямпы, таму што ў гэты час на іх быў вялікі попыт. Ліставое аконнае шкло выраблялі на сямі заводах, аптэкарскі і хімічны посуд — на сямі заводах, люстраное шкло — на двух заводах. Крышталёвы посуд выраблялі Целяханскі, усе нёманскія, Старэўскі, Ільянскі, Чарнянскі, Нова-Барысаўскі і Нараўскі шклозаводы. Пералік шклозаводаў і іх асноўны асартымент прыведзены ў дадатку.

Разам з тым некаторыя заводы выпускалі мастацкі посуд з крышталю, каляровага і бясколернага шкла, захоўваючы ўчасткі па вырабу сталовага, аптэчнага і тарнага посуду з зялёнага неасветленага шкла. Посуд з неасветленага шкла быў танны і больш даступны простаму люду.

Да ліку такіх прадпрыемстваў адносіліся Ільянская мануфактура, шкло-крышталёвыя заводы ў гг. Чачэрску, Барысаве, г. п. Целяханы і Бярозаўка, вв. Чарняны, Залессе, Старэва, хутарах Устрынь-Боркі і Новая Гута, маёнтку Нараўка.

Асабліва інтэнсіўны рост шклозаводаў пачаўся з 80-х гадоў, калі вінная дзяржаўная манаполія запатрабавала продажу гарэлкі і віна толькі ў шкляной тары. Узнік вялізны попыт на бутэлькі, і заводчыкам стала яшчэ больш выгадна ўкладваць капіталы ў шкляную прамысловасць.

У апошняй чвэрці стагоддзя ў Навагрудскім павеце, куды па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму дзяленню раней уваходзіла і Налібоцкая мануфактура, узніклі новыя шкляныя прадпрыемствы на аснове выкарыстання паліўнай базы ўсё той жа Налібоцкай пушчы, але ўжо з другога яе боку.

Мясцовыя памешчыкі пачалі будаваць тут гуты, на базе якіх узнік су-



*Рыс. 53. Бакалы. Беларусь. Апошняя чвэрць XIX ст. Мінск, ДМ БССР. Публікуецца ўпершыню*

часны шклозавод «Нёман». Мастацкія вырабы завода — гэта старонка гісторыі мастацкага шкла Беларусі канца XIX — пачатку XX ст. У сувязі з гэтым гісторыя ўзнікнення і фарміравання шклозавода «Нёман» уяўляе пэўную цікавасць для нашага даследавання.

У 1875 г. ва ўрочышчы Устронь (цяпер хутар Устрынь-Боркі), у 4 км ад сучаснай чыгуначнай станцыі Бярозаўка, узнікла гута, якую пазней назвалі шклозавод «Нёман-А» (дадатак, п. 111). Па дакументах завода, у 1885 г. гута належала графу Зянону Ленскаму — уладальніку маёнтка і лясных масіваў. Між тым у ЦДГА ЛітССР ёсць звесткі, што ў лістападзе 1883 г. З. Ленскі прасіў дазволу пабудаваць гуту ва ўрочышчы «Устроўня». Дазволу ён не атрымаў, таму што не прадставіў тэхнічнай дакументацыі. Але супрацоўнікі шклозавода «Нёман», вывучаючы яго гісторыю, прынялі гэту дату за час узнікнення гуты на хутары Устронь. Назву «Устроўня» ўспрынялі як скажоную ад «Устронь» і лічаць 1883 год часам заснавання шклозавода «Нёман». На наш погляд, З. Ленскі прасіў у 1883 г. дазволу будаваць яшчэ адну гуту ва ўрочышчы Устроўня (цяпер в. Астроўна), таму што гута ва ўрочышчы Устронь дзейнічала з 1875 г., аб чым ён паведаміў у Мануфактур-калегію, паслаўшы справаздачу аб яе дзейнасці за 1885 г. На карысць нашай думкі сведчыць і прашэнне А. Ф. Квіцінскага ад 1896 г. дазволіць пабудаваць гуту ва ўрочышчы Устроўня (дадатак, п. 94).

З 1 мая 1891 г. гуту З. Ленскага арандавалі шляхціц В. А. Краеўскі і майстар роспісу па шкле Ю. Столе. Яны значна рэканструявалі гуту і пашырылі выраб сталовага крышталёвага посуду. Энергічныя прамыслоўцы ўлічылі попыт на мастацкае шкло і праз тры гады (у 1894 г.) заснавалі ўласны «паравы шклозавод» ва ўрочышчы Маладзіна на арандаванай імі зямлі ў памешчыцы Ганны Смальян і ў 1896 г. назвалі яго «Нёман-Б», а гуту ва ўрочышчы Устронь — «Нёман-А» як узнікшую значна раней. Для свайго часу шклозавод «Нёман-Б» быў добра абсталяваны найноўшымі машынамі і прыстасаваннямі, якія дазвалялі вырабляць мастацкія шкляныя рэчы нават па мадэлях, чарцяжах і эскізах заказчыкаў. У справаздачах завода яны называліся «прадметы раскошы». Але прамыслоўцы В. Краеўскі і Ю. Столе гэтымі прадпрыемствамі не абмежаваліся і ў 1899 г. набылі яшчэ гуту, якая была заснавана ў 1896 г. купцамі ва ўрочышчы Бярозаўка (дадатак, п. 98), і шклозавод у маёнтку Ганцавічы (дадатак, п. 4). Пасля таго як новая гута (ур. Маладзіна) згарэла ў 1914 г., асноўная вытвор-

часць мастацкіх шкляных вырабаў была сканцэнтравана на гуце ў Бярозаўцы. Такім чынам, Столе і Краеўскі з 1899 г. валодалі 4 шклозаводамі. З 1908 г. уладальнікам гэтых гут стаў Ю. Столе. В. Краеўскі ў 1885 г. заснаваў шклозавод у Барысаве [1], а ў 1899 г. стаў уладальнікам і шклозавода ў пасадзе Нова-Барысаў. Пасля яго смерці, у 1908 г., шклозавод у Нова-Барысаве называўся «Крышталёвая фабрыка т/д Панкевіча і Н (аследні) кі Краеўскага» (дадатак, пп. 168, 169). Такім чынам, у канцы XIX ст. самымі буйнымі шклозаводчыкамі ў Беларусі былі Ю. Столе і В. Краеўскі, якія сканцэнтравалі ў сваіх руках вытворчасць мастацкіх шкляных вырабаў.

К 1900 г. у Беларусі налічвалася 32 буйныя шкляныя прадпрыемствы. Па аб'ёму шкляных вырабаў і колькасці рабочых шклаpобства Беларусі стаяла на трэцім месцы ў Расіі [2].

Менавіта шкларобы складалі перад рэвалюцыяй значную частку



*Рыс. 54 Кілішкі. Беларусь. Апошняя чвэрць XIX ст. Мінск, ДМ БССР. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 55. Бакал і крэманкі. Беларусь. Апошняя чвэрць XIX ст. Публікуецца ўпершыню*

рабочага класа Беларусі. А забастоўкі ў 1905—1907 гг. на шклозаводах «Ноўка», у вв. Целяханы, Старэва, у 1908 г.— у в. Сярковіцы, у 1910 г.— у м. Смалявічы, у 1911 г.— «Нёман-Б», у 1912 г.— «Піна» ў г. Пінску, у 1913 г.— «Труды» ў м. Жэльцы Гарадокскага п., у Нова-Барысаве [3], Барысаве [4] і іншых сведчаць, што ўмовы працы на гэтых прадпрыемствах былі вельмі дрэннымі. Не выпадкова пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі (у 1929 г.) драматургам Рыгорам Кобецам на матэрыяле дзейнасці Мінскай гуты была напісана п'еса «Гута» і пастаўлена ў БДТ-1 у маі 1930 г. [5], якая адлюстравала станоў-

---

[1] Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 53; ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 204, л. 5/10.

[2] Документы и материалы..., т. 3, с. 56.

[3] Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг.— Мн., 1955, с. 213; Документы и материалы..., т. 3, с. 421, 454, 457, 676, 688, 689, 704; Борисовский стекольный.— Мн., 1974, с. 8.

[4] Революционное движение в Белоруссии..., с. 243.

[5] БелСЭ, т. 6, с. 42.



*Рыс. 56. Жбаночак для вяршкоў. Беларусь. Канец XIX ст. Прыватная калекцыя. Вышыня 14,5 см. Публікуецца ўпершыню*

чыя змены ў развіцці шкляной прамысловасці ў БССР і паляпшэнні ўмоў працы.

У канцы XIX ст. наглядаецца прыкметнае перамяшчэнне шклозаводаў з паўднёвага ўсходу Беларусі (сучасныя Магілёўская і Гомельская вобласці) у цэнтральныя і паўночныя раёны (сучасныя Мінская, Гродзенская і Віцебская вобласці).

Самымі буйнымі шклянымі заводамі, па даных на 1910 г., былі «Нёман-А» (454 рабочыя), «Нёман-Б» (552), Целяханскі (471), шклозаводы «Ноўка» (285) і «Барысаў» (255), Равяціцкі (274), «Труды» (390), Чарнянскі (250 рабочых) [6] і інш., якія мелі паравыя шліфавальні і ванныя шклоплавільныя печы, механізаваныя цэхі, дзе складвалася шыхта і механічна драбілася фрыта, з якіх варылі шкло. Паравыя рухавікі, механічныя драбілкі, шаравыя млыны, газавыя генератары пачалі ўстанаўліваць з 80-х гадоў XIX ст. [7] У газагенератарных печах можна было выкарыстоўваць адыходы лясной гаспадаркі (сухастой, ламачча, гарбылі, абрэзкі), што садзейнічала стварэнню пры шкляных заводах лесапільных, як, напрыклад, у в. Старэва (цяпер Мінская вобл.).

Пераход заводаў на новае мінеральнае паліва дазволіў размяшчаць іх не ў глухіх вёсках, што губляліся ў лясах паблізу ад рачулак, а ў гарадах. Так, у канцы апошняй чвэрці XIX ст. узніклі два шклозаводы ў Мінску і Нова-Барысаўскі шкло-крышталёвы завод, якія працавалі на каменным вугалі і нафце.

Першая спроба механізацыі працэсу фармавання была зроблена яшчэ ў 2-й палавіне XIX ст., калі пачалі выкарыстоўваць розныя пнеўматычныя прыстасаванні, каб замяніць працэс выдзімання сілай лёгкіх гутніка. Але гэтыя прыстасаванні толькі часткова замянілі цяжкую працу шкловыдзімальшчыка, бо паўтаралі той жа ручны працэс і таму не давалі значнага павелічэння прадукцыйнасці працы. У канцы веку павелічэнне прадукцыйнасці працы пры фармаванні дасягалася часткова за кошт укаранення тэхналогіі ручнога прасавання, для чаго шклозаводчыкам прыйшлося змя-

---

[6] БелСЭ, т. 11, с. 332.

[7] Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 61.

ніць састаў шкламасы з мэтай павышэння вязкасці шкла ў гарачым стане. Але прадукцыйнасць ручных прэсаў была таксама невялікай. Праблема павелічэння прадукцыйнасці працы ў шкларобстве была вырашана ў пачатку XX ст. дзякуючы стварэнню аўтаматычных машын для выдзімання вырабаў са шкла пры дапамозе пары [8].

Прасаванае шкло і крышталь у канцы XIX ст. сталі першымі ў сучасным разуменні масавымі вырабамі. Прэс у той час імітаваў не толькі ручны характар працы, але і формы і дэкоры вырабаў, якія атрымліваліся пры свабодным ручным фармаванні, шліфаванні і гравіраванні. Часта металічныя прэс-формы ствараліся без уліку магчымасцей новай тэхналогіі. Майстры імкнуліся як можна дакладней перанесці ў формы для прэса ўсе парэзкі і грані ўручную шліфаванага каштоўнага крышталю, які карыстаўся вялікім попытам (рыс. 61, 62). Але гарачая шкламаса пры сутыкненні з металам не давала такой гладкай паверхні, як пасля ручнога шліфавання і паліравання, у выніку памяншалася праламленне святла ў гранях, зніжаўся бляск, грані былі аплыўшымі. Сляды стыкоўкі раскрываемых форм і матрыц нельга было знішчыць. Аднак сабекошт прасаваных вырабаў быў ніжэйшы, а прыбыткі большымі. Шклозаводчыкі ўжо маглі знізіць цану на вырабы і тым самым павысіць збыт. Пашырэнне тэхнікі прасавання стымулявала творчую актыўнасць тэхнолагаў і інжынераў-механікаў. Тэхнолагі атрымалі магчымасць распрацоўваць новыя больш вязкія саставы шкламасы, якая б лягчэй падавалася прасаванню, а інжынеры-механікі павінны былі ствараць новыя станкі і прыстасаванні для іх, а таксама металічныя формы, у якіх прасавалі вырабы. Інжынеры часта станавіліся і аўтарамі форм рэчаў, якія дыктаваліся тэхналогіяй іх вырабу (прасаваннем).



*Рыс. 57. Крэманка. Беларусь. Канец XIX ст. Прыватная калекцыя. Вышыня 11,7 см. Публікуецца ўпершыню*

У пачатку XX ст. сталі паяўляцца больш складаныя аўтаматычныя прыстасаванні для выrabу тысячнымі «тыражамі» чайных шклянак, кілішкаў, сподкаў, талерак і іншых відаў посуду, попельніц, асвятляльных прыбораў, галоўным чынам рэзервуараў лямп і абажураў для іх.

Механізацыя вытворчасці закранула не толькі формаўтварэнне вырабаў, але і тэхніку іх дэкарыравання. Гравіравальныя і шліфавальныя станкі, якія дзейнічалі здаўна, пачалі працаваць ад электрапрывадаў, што павялічыла прадукцыйнасць і аблегчыла працу шліфоўшчыкаў і

[8] Ланцетти А. Г., Нестеренко М. Л. Изготовление художественного стекла.— М., 1972, с. 113.

гравіроўшчыкаў. Механізацыя аказала значны ўплыў і на мастацкі ўзровень шкляных вырабаў канца XIX — пачатку XX ст., асабліва ў параўнанні з вырабамі XVIII і першай палавіны XIX ст. Пераважаў выраб прасаваных рэчаў, якія аздабляліся нізкарэльефнымі дэкаратыўнымі элементамі, што атрымліваліся пры прасаванні.

У створаных абставінах з'яўленне мастака на шклозаводзе было заўчасным, а раздзяленне працы выдзімальшчыка на прасаўшчыка і фармаўшчыка адняло ў яго дзейнасці творчы пачатак. Узоры вырабаў закупляліся на лепшых шкляных прадпрыемствах Заходняй Еўропы, а мясцовыя «кулібіны» стваралі на аснове гэтых узораў уласныя прэс-формы з нязначнымі зменамі і ўдакладненнямі. Узровень дэкаратыўнай арнаментацыі прасаваных вырабаў знізіўся да набору спрошчаных трафарэтных арнаментаў (рыс. 73, 74). Формы вырабаў вызначаліся тым запасам металічных і драўляных форм, якія меліся на заводзе і былі зацверджаны ўладальнікам.

Цікавай навізной з'явілася ўкараненне на шклозаводах Беларусі пантографаў і гільяшырных станкоў, якія дазволілі наносіць рысункі з прамых і хвалістых ліній (сл. 8) адначасова на 12—24 аднолькавыя вырабы. Гільяшырныя машыны прадрапвалі іголкамі на тонкім слоі воску, нанесенага на шкляныя вырабы, контуры розных лінейных рысункаў, якія былі загадзя выгравіраваны на металічнай пліце. Пасля гільяшыравання вырабы апускалі на 5—15 хвілін у плавіковы састаў, які разбураў на невялікую глыбіню бліскучую паверхню шкла толькі па контурах прадрапанага рысунка. Другая назва гэтага метаду дэкарыравання — «светлае траўленне».

Не кожны шклозаводчык меў капіталы, каб набываць новае абсталяванне, якое ў канчатковым выніку павышала яго прыбыткі. Выстаяць у канкурэнтнай барацьбе маглі толькі буйныя прадпрыемствы, сабекошт адзінкі прадукцыі якіх зніжаўся дзякуючы ўкараненню новай тэхнікі прасавання і гільяшырнага гравіравання, пнеўматычных станкоў для выдзімання танкасценных вырабаў у рухомыя формы. Таму многія шклозаводчыкі Беларусі, як і ўсёй Расіі, пачалі аб'ядноўвацца ў акцыянерныя таварыствы.

Канцэнтрацыя шкляной прамысловасці ў руках некалькіх прамыслоўцаў прывяла да стварэння шэрагу таварystваў і акцыянерных устаноў для пабудовы і эксплуатацыі шклозаводаў. Першае падобнае таварыства па эксплуатацыі Целяханскага шкло-крышталёвага і Міхлінскага шклянога заводаў арганізавалася ў 1896 г. У 1908 г. былі створаны акцыянернае прадпрыемства «Нараўка», якое кіравала і шклозаводам «Зубр», і таварыства ў складзе Когана, Ліберсона і Годэса, якое эксплуатавала Гальбейскі завод на станцыі Варапаева (цяпер Пастаўскі р-н); у 1910 г.— таварыства «Залессе» ў складзе Б. Ш. Цілеса, Я. Б. Ашкіназі і Х. З. Грытгаўза, якія эксплуатавалі шклозавод «Залессе» (цяпер вёска Вілейскага р-на Мінскай вобл.); у 1916 г.— таварыства ў складзе Клёцкіна, Нусінава і М. Лейсона па эксплуатацыі Старэўскага шкло-крышталёвага і лесапільнага заводаў; акцыянернае таварыства крышталёвага завода «Чарняны» (дадатак). У 1912 г. узнікла акцыянернае таварыст-

ва шкло-крышталёвых і лесапільных заводаў «Заходняя Дзвіна» па эксплуатацыі шклозавода «Ноўка» (цяпер Віцебскі р-н) і крышталёвага завода на тэрыторыі сучаснай Смаленскай вобл. У 1908 г. створана Удзельнае ведамства па эксплуатацыі шклозавода «Міхлін»; у пачатку XX ст. (дакладней невядома) — Галоўнае праўленне шкляных і крышталёвых заводаў братоў Чарніховых у складзе Турука, Розенблюма і братоў Чарніховых [9].

Шклозаводчыкі Беларусі ўдзельнічалі таксама ва Усерасійскім аб'яднанні шклозаводчыкаў, якое ўзнікла ў 1906 г. і збіралася на штогадовыя з'езды. Задача гэтага аб'яднання шклозаводчыкаў Расіі заключалася ў тым, «каб перашкодзіць той неразумнай і ўбытачнай канкурэнцыі, якая прымушае зніжаць выгаднасць прадпрыемстваў» [10]. Пастаянным органам з'ездаў было бюро, якое выступала перад урадам Расіі па ўсіх пытаннях, ад рашэння якіх залежала развіццё шкляной прамысловасці ў краіне. Пры з'ездзе расійскіх шклозаводчыкаў было створана таварыства «Шкло», якое рабіла аптовыя закупкі сыравіны і абсталявання, арганізоўвала аптовы гандаль шклянымі вырабамі, трымала аптовыя склады і спрыяла выдачы ссуд шклозаводчыкам. Буйныя шклозаводчыкі Беларусі В. Краеўскі і Ю. Столе, якія валодалі шасцю шклозаводамі (Барысаўскім, трыма нёманскімі, Целяханскім і Ганцавіцкім), выкарыстоўвалі нават банкаўскія крэдыты.

У пачатку XX ст., таксама як і ў XVIII—XIX ст., мелі месца выпадкі пранікнення ў шкляную прамысловасць Беларусі іншаземнага капіталу. Напрыклад, Сярковіцкі шкляны завод А. М. Мерліса, які часова спыніў сваю дзейнасць з-за крызісу 1900—1903 гг., у 1909 г. стаў уласнасцю памешчыка Н. І. Курчы і бельгійскага інжынера Л. К. дэ Бэра [11].



*Рыс. 58. Графін. Беларусь. Канец XIX ст. Прыватная калекцыя. Вышыня 20,5 см. Публікуецца ўпершыню*

[9] Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 54, 57, 77.
[10] Стеклозаводчик, 1912, № 3, с. 7.
[11] Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 59.



*Рыс. 59. Ваза. Шклозавод «Барысаў». Канец XIX ст. В. Сталовічы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл., касцёл Іаана Хрысціцеля. Публікуецца ўпершыню*

Шклозаводы Беларусі карысталіся мясцовымі пяскамі, якія ў асноўным мелі вялікі працэнт жалеза і былі не прыгоднымі для вырабу высакаякаснага бясколернага шкла, таму што нават пасля асвятлення шкламаса захоўвала блакітнаватае, жаўтаватае ці ружаватае адценне. Але паблізу Целяханскага, Ялізаўскага, Старэўскага, нёманскіх, Барысаўскага і Парэцкага шклозаводаў былі пяскі, якія пасля двайной прамыўкі давалі добра абясколераную шкламасу. Яна была прыгоднай для выдзімання лямпавых вырабаў, аптэкарскага посуду, аконнага шкла. Пасля чатырохразовай прамыўкі пяску з яго нават варылі крышталёвую масу. Тыя заводы, якія выраблялі сартавы посуд і бемскае шкло, завозілі пясок з-пад беларускіх гарадоў Ваўкавыск і Старобін. Большасць заводаў Беларусі ў XIX ст. карысталася мясцовымі мелам і вапнай, толькі з 90-х гадоў пачалі завозіць белгародскі мел (цяпер г. Белгарад, РСФСР).

На працягу XIX ст. усе шклозаводы (акрамя Чачэрскага, Талачынскага і Усвяцкага) карысталіся шчолачамі, неабходнымі для варкі якаснага шкла, у выглядзе драўнянага і саламянага попелу і паташу, на вырабе якіх спецыялізаваліся мясцовыя прамыслоўцы ці асобныя цэхі пры шклозаводах. Толькі ў самым канцы XIX ст. шклозаводчыкі паступова перайшлі на выкарыстанне шчолачаў, вырабленых хімічнай прамысловасцю, соды і сульфату. Прыродную салетру ўсе шкло-крышталёвыя заводы атрымлівалі з Чылі. Фарбавальнікі шкла паступалі з Германіі, Аўстраліі, Англіі.

Прадукцыя беларускіх шклозаводаў адпраўлялася на Каўказ, у Крым, Туркестан, Сібір, Паволжа, закаспійскія гарады, Растоў-на-Доне, Баку, Маскву, Саратаў, у гарады Польшчы, Прыбалтыкі [12].

Мастацкі ўзровень вырабаў вызначалі самі ўладальнікі шклозаводаў, многія з якіх мелі не толькі тэхнічную і тэхналагічную падрыхтоўку, але і мастацкую. Напрыклад, Ю. Столе, да таго як стаў уладаль-

[12] Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 60, 65.

нікам гуты, быў не толькі выдзімальшчыкам, але і займаўся роспісам шкла. Ён працаваў выдзімальшчыкам на гуце на хутары Устрынь-Боркі. Гута належала Ленскаму, а В. Краеўскі па найму кіраваў вытворчасцю. Потым яны сталі арандатарамі гуты. Саўладальнікам гэтай гуты Ю. Столе стаў пасля жаніцьбы сваіх сыноў на дочках В. Краеўскага [13]. В. Краеўскі да таго, як стаў арандатарам і ўладальнікам, працаваў тэхнічным кіраўніком шкляной вытворчасці ў чэшскага шклароба Хрдлічкі [14], які ў канцы XIX ст. валодаў гутай «Чэхі» ў Польшчы [15]. Такія шклозаводчыкі самі рашалі, якія шкляныя вырабы неабходна заводу вырабляць, і ўлічвалі магчымасці механізацыі шкляной вытворчасці.

Блізкасць форм і дэкораў барысаўскага шклянога посуду канца XIX і пачатку XX ст., апублікаванага ў прэйскуранце «Хрустальной фабрики товарищества братьев Краевских «Борисов» у 1904 г., з формамі і дэкорамі заходнееўрапейскага шкла гэтага часу сведчыць, што майстры завода, якія стварылі гэтыя формы і дэкоры, былі добра знаёмы з творчасцю французскіх мастакоў па шклу Я. Русо і Э. Гале. Значны ўплыў на ўзровень барысаўскага шкла канца XIX — пачатку XX ст. аказвалі іншаземныя майстры, якія працавалі ў той час на заводзе,— палякі, аўстрыйцы, чэхі, немцы, сербы і мадзьяры [16].

Усё большая магчымасць перамяшчэння людзей у выніку з'яўлення цягніка, паяўленне мноства новых мастацкіх часопісаў, выданне ўсімі буйнымі шклозаводамі ўласных каталогаў спрыялі збліжэнню мастакоў і шклозаводчыкаў розных краін,



*Рыс. 60. Кілішак. Шклозавод «Барысаў». Канец XIX ст. Прыватная калекцыя. Вышыня 8,3 см. Публікуецца ўпершыню*

а таксама распаўсюджванню новых плыней і стыляў у мастацтве, у тым ліку ў галіне мастацкага шкла.

Вялікі ўплыў на развіццё беларускага мастацкага шкла аказала таксама Міжнародная мастацкая

---

[13] Па звестках старэйшага работніка шклозавода «Нёман» эканаміста Ф. Ф. Браслаўскага.

[14] З гісторыі шклозавода «Нёман».— Матэрыялы заводскага музея.

[15] Polskie szkło do połowy 19 wieku.— Wrocław, Warzsawa, Kraków, Gdańsk, 1974, s. 109, 111.

[16] Борисовский стекольный, с. 6.



*Рыс. 61. Цукарніца. Гута «Нёман». Канец XIX ст. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

выстаўка, арганізаваная С. П. Дзягілевым у 1899 г. у Пецярбургу [17]. Значную ролю ў распаўсюджванні ў беларускім шкле мастацкіх напрамкаў Заходняй Еўропы адыгралі іншаземныя выстаўкі, якія праводзіліся ў Расіі ў канцы 90-х гадоў XIX ст., асабліва выстаўкі французскага мастацтва. Так, з 1896 па 1899 г. французскае мастацтва чатыры разы дэманстравалася ў Маскве і Пецярбургу [18]. Гэтыя выстаўкі з'явіліся вынікам трывалых сувязей руска-беларускіх шклозаводчыкаў з французскімі. Раней, у 1878 і 1889 гг., на выстаўках у Парыжы было прадстаўлена мастацтва Расіі.

Значнай была і роля Першай выстаўкі бельгійскага мастацтва ў Расіі, якая адбылася ў 1898—1899 гг. у Пецярбургу і Маскве. Яе асаблівасць у тым, што побач з творамі станковага мастацтва больш трэці яе экспанатаў складалі творы прыкладнога мастацтва, якія дэманстраваліся ў асобным раздзеле «Мастацкія творы ў прымяненні да прамысловасці». Менавіта ў гэтым раздзеле былі выстаўлены тыповыя творы «прыкладнога» мадэрна—вазы ў выглядзе архідэй, ірысаў, лілей, бронзавыя макі-падсвечнікі, попельніцы, чарнільніцы, прэс-пап'е ў выглядзе жаночых галовак з волава, што сімвалізавалі сабой вядомыя кампазіцыі «Тайна», «Маўчанне» і г. д. [19] Прыкметна, што выстаўка выяўляла і падкрэслівала важную заканамернасць мастацкага развіцця эпохі — хутка ўзрастаючую ролю мастацкай індустрыі.

Беларускія шклозаводчыкі мелі цесныя кантакты таксама з бельгійскімі шклозаводчыкамі і інжынера-



*Рыс. 62. Цукарніца. Шклозавод «Барысаў». Пачатак XX ст. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

[17] Стернин Г. Ю. Художественная жизнь России на рубеже XIX—XX веков.— М., 1970, с. 121.
[18] Там жа, с. 98.
[19] Там жа, с. 120.

мі шкларобства, якія, напэўна, аказалі ўплыў на мастацкі ўзровень шкляных вырабаў Беларусі. Ужо адзначалася, што Сярковіцкі шклозавод з 1909 г. стаў уласнасцю Н. І. Курчы і бельгійскага інжынера Л. К. дэ Бэра. На Старэўскім шклозаводзе працавалі мясцовыя майстры (сярод іх нашчадкі ўрэцкага роду гравіроўшчыкаў XVIII ст. Рымашэўскіх — Іосіф Іванавіч са сваім сынам) і іншаземныя, сярод якіх былі чэхі, немцы, бельгійцы. Значны і хуткі ўплыў заходнееўрапейскае мастацтва стылю мадэрн аказвала на рускае і беларускае шкларобства і праз публікацыю артыкулаў у спецыялізаваных часопісах «Revue blanche» (Парыж, 1891), «The Studio» (Лондан, 1893), «Jugend» (Мюнхен, 1896), «Deutsche Kunst und Dekoration» (Дармштадт, 1897), «Ver Sacrum» (Вена, 1898). У Расіі гэты напрамак прапагандаваў часопіс «Мир искусства» (Пецярбург, 1898/99) і інш.



*Рыс. 64. Вазы. Гута «Нёман». 1900—1950 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 63. Вазы. Гута «Нёман». 1900—1950 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*

Відавочна, беларускія шклозаводчыкі ездзілі на замежныя выстаўкі, бралі з сабой лепшых майстроў, якія, узбагаціўшыся ўбачаным і асэнсаваўшы асноўныя напрамкі ў мастацтве шкла, хутка наладжвалі вытворчасць вырабаў з улікам новых тэхналагічных метадаў і механізацыі вытворчасці.

Менавіта імкненне знайсці гарманічнае спалучэнне новых машынізаваных метадаў вытворчасці шкляных вырабаў і традыцыйных ручных прыёмаў дэкарыравання шкла ляжала ў аснове ўкаранення стылю мадэрн у шкларобстве. Увогуле ў канцы XIX ст. склаліся ўмовы для стварэння новага стылю, які б адпавядаў машыннай эпосе. Гэтым стылем быў мадэрн (ад французскага moderne — навейшы, сучасны). Эстэтыка мадэрна развівала



*Рыс. 65. Ваза для садавіны. Гута «Нёман». 1900—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 66. Ваза для садавіны. Гута «Нёман». 1910—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

ідэі сімвалізму і эстэтызму. Мадэрн стаў універсальным стылем свайго часу, закрануўшы формы і канструктыўныя сістэмы архітэктуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Новы стыль у мастацтве ўкараняўся цяжка, у сутычках ідэй, у спрэчках і дыскусіях. Амаль паўстагоддзя мастакі Еўропы займаліся эклектычнай імітацыяй гістарычных стыляў мінулых эпох і прапанавалі розныя канцэпцыі выхаду мастацтва з тупіка, сярод якіх утапічная крытыка машынізацыі вытворчасці з пазіцый «добрай рамеснай работы» была найбольш ваяўнічай, але асуджанай на правал, таму што яна выступала супраць тэхнічнага прагрэсу. У выніку станаўлення і развіцця новых канцэпцый у мастацтве мастакі стылю мадэрн упершыню ў гісторыі мастацтва стварылі прынцыпова новыя формы і дэкоры, якія не пераймалі ніякіх стыляў мінулых эпох. Значная роля ў складванні новага стылю належала мюнхенскаму таварыству «Сэцэсіон», якое ўзнікла ў 1892 г. як супрацьпастаўленне акадэмічнаму мастацтву. З творчасцю мюнхенскіх сэцэсіяністаў было звязана развіццё «югендштылю», які стаў у цэнтры агульнаеўрапейскага мадэрна [20].

На распаўсюджанне ідэй і прынцыпаў мадэрна ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Еўропы, і ў прыватнасці ў шкларобстве, значны ўплыў аказаў «Венскі сэцэсіон»— таварыства радыкальных венскіх мастакоў (узнікла ў 1897 г.). Адным з стваральнікаў быў

[20] Рожанковский В. Ф. Стекло и художник.— М., 1971, с. 13.

Ёзэф Хофман, які пазней стаў заснавальнікам ранняга функцыяналізму. Творчасць і погляды мюнхенскіх сэцэсіяністаў цесна перапляталіся з поглядамі і ідэямі мастакоў Расіі, у тым ліку і беларускіх — А. Ромера, Б. Тамашэвіча, Ф. Рушчыца і інш. Сярод рускіх мастакоў іх погляды падзялялі А. Бенуа, К. Сомаў і Я. Лансерэ — члены таварыства «Свет мастацтва». Гэтыя мастакі, акрамя жывапісу, займаліся праектаваннем твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і ўвогуле імкнуліся да «еўрапеізацыі» рускай мастацкай культуры [21], у тым ліку і культуры асобных нацыянальных меншасцей Расіі, напрыклад Беларусі. На прыкладзе вырабаў беларускіх шклозаводаў гэты працэс вельмі прыкметны, і неабходна падкрэсліць, што мэта таварыства была дасягнута менавіта ў «еўрапеізацыі» мастацкага шкла. Інакш нельга абгрунтаваць значны экспарт у канцы XIX — пачатку XX ст. беларускага шкла ў дзесяткі краін. Усе новыя веянні Заходняй Еўропы ў галіне новых форм і дэкораў стылю мадэрн у 1900—1902 гг. былі ўкаранёны ў масавай вытворчасці нёманскіх шклозаводаў і заводаў у вв. Старэва [22], Целяханы [23], пасадзе Нова-Барысаў [24], дзе выпрацоўваліся шклянкі «мадэрн» і «венскія», чаркі «венскія», лямпы «берлінскія» і «венскія», «кветнікі барока», «графіны залачоныя баккара» і г. д.



*Рыс. 68. Масленіца з дэкорам «Нёман» і кілішак з дэкорам «грань». Гута «Нёман». 1900—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 67. Вазы. Гута «Нёман». 1900—1939 гг. Музей старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АН БССР. Вышыня 38 і 40 см.*

---

[21] Стернин Г. Ю. Художественная жизнь России..., с. 121.
[22] ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 176, л. 104—117.
[23] Там жа, спр. 261 (ч. 1), л. 38, 62.
[24] Там жа, спр. 204, л. 6—10, 16.

Укараненне ў шкляную вытворчасць станкоў, механізмаў і новай тэхналогіі варкі шкла ў ванных печах стварыла ўсе ўмовы для масавага вырабу шкляных рэчаў па ўзорах вядомых заходнееўрапейскіх мастакоў, якія спраектавалі ўласныя прэтэнцыёзна-мудрагелістыя і вытанчаныя формы ў шкле, удала спалучыўшы іх з дэкорамі. Між тым у іншых відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мастакі мадэрна звялі ўсю праблематыку да пытанняў арнаментацыі, да распрацоўкі новых прыёмаў дэкарыравання, асабліва ў мэблі, фарфоры і фаянсе.



*Рыс. 70. «Карзінкі». Гута «Нёман». 1900—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 69. Ваза. Гута «Нёман». 1900—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

Аналіз форм і дэкораў беларускіх шкляных вырабаў гэтага часу сведчыць, што многія вырабы былі творчымі перапрацоўкамі па матывах французскіх мастакоў Я. Русо (1827—1891) і Э. Гале (1847—1904).

З 80-х гадоў XIX ст. упершыню ў гісторыі мастацкага шкла паяўляюцца мастакі-універсалы, якія пачалі займацца праектаваннем новых форм і дэкораў шкляных вырабаў. Яны спалучалі ў адной асобе графіка, жывапісца, праекціроўшчыка і тэарэтыка. Францыя выйшла к гэтаму часу ў лік вядучых краін па вытворчасці мастацкага шкла. Я. Русо праектаваў вазы простых абрысаў з празрыстага шкла з мяккім жаўтаватым адценнем з каляровымі «эфектамі паверхні», якія нагадвалі пацёчныя палівы, і з рэльефна-пластычнымі фігуратыўнымі і ландшафтнымі дэкорамі. Для дэкарыравання танкасценных свабодна выдзіманых сасудаў выкарыстоўваў гравіроўку, роспіс эмалямі і золатам, траўленне. У таўста-



*Рыс. 71. Масленіца. Гута «Нёман». 1900—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 72. Блюда (паднос). Гута «Нёман». 1900—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

сценных сасудах устаўляў металічную фольгу між двума слаямі празрыстага шкла, прымяняў тэхніку кракле[25]. Але самы значны ўклад Я. Русо ў мастацтва шкла — стварэнне ваз з празрыстага шкла, якія маюць эфекты накладнога колеру і пластычную апрацоўку паверхні. Уплывы Я. Русо прыкметны ў вырабах шклозавода «Нёман-А» і гуты на хутары Маладзіна.

Апошняя чвэрць XIX ст. — гэта час эклектызму, які заўсёды папярэднічае з'яўленню ў мастацтве новага стылю або напрамку, калі мастакі асэнсоўвалі дасягненні сусветнага мастацтва ўсіх часоў. У 1878 г. на Парыжскай выстаўцы ўпершыню былі выстаўлены шкляныя вырабы яшчэ маладога мастака па шклу Эміля Гале. Ён прадэманстраваў высокі тэхнічны ўзровень уласнымі рукамі зробленых вырабаў з празрыстага шматслойнага шкла, дэкарыраванага эмалямі, шліфоўкай і гравіроўкай. Адчуваліся свабодныя запазычанні з сярэдневяковай геральдыкі, кітайскага фарфору, горнага крышталю XVII ст., багемскага і сілезскага шкла XVIII ст. Ад інтэрпрэтацыі мастацтва розных народаў і гістарычных стыляў Э. Гале ў канцы 90-х гадоў пераключаецца на распрацоўку ўласнага «натурстылю». Э. Гале пачынае ствараць дэкоры ў разным і траўлёным накладным шматслойным шкле, імкнучыся даць самыя разнастайныя выявы кветак і дрэў, дакладна захоўваючы пры гэтым батанічныя віды, без якой-небудзь стылізацыі. Ён лічыў прыродныя формы і колер зыходнымі пунктамі мастака ў час праектавання ўзораў шкляных вырабаў. Менавіта таму яго творчы метад атрымаў назву «натурстыль». Пры гэтым Э. Гале знаходзіў арганічную сувязь паміж вырабам, яго формай, дэкорам і тэхналогіяй. У час калі дэкаратыўна-прыкладное мастацтва разглядалася як непасрэдны дада-

[25] Рожанковский В. Ф. Стекло и художник, с. 13.

так жывапісу, графікі або скульптуры да бытавой рэчы, якую яны прызваны былі аздобіць, пазіцыя Э. Гале была прагрэсіўнай. Мастак вырабляў таксама сталовыя шкляныя вырабы простых форм без ніякіх дэкораў. Ён працаваў сам з матэрыялам і выкарыстоўваў вельмі шырокі дыяпазон тэхнічных сродкаў і мастацкіх прыёмаў шкларобства розных часоў і народаў: слабаафарбаванае шкло, свабодна выдзіманую тэхніку, ляпныя дэкоры і формы, шматлікія тэхнікі дэкарыравання — непразрысты і празрысты наклад, глыбокае і мелкае траўленне, эмалевы роспіс, глыбокую контрразьбу па шклу, гравіроўку. Вырабам Э. Гале наследавалі ў Францыі і ва ўсім свеце.

Беларускія шклаapplicationробы па-свойму інтэрпрэтавалі развіты Э. Гале «натурстыль», які імпанаваў ім, таму што даваў магчымасць адлюстраваць у шкле родную прыроду, яе флору і фауну. Да таго ж беларускае мастацтва заўсёды прытрымлівалася рэалістычных напрамкаў, адлюстроўваючы густы народа.

Беларускія шкларобы з усіх тэхналагічных дэкаратыўных прыёмаў Э. Гале выбралі толькі наклад і глыбокае траўленне, роспіс эмалямі на глушоным (у Э. Гале толькі на празрыстым), апакавым і празрыстым шкле, атрымліваючы пры гэтым падобныя дэкаратыўныя эфекты.

Прыкладам прымянення тэхнікі гале (трохслойнага траўлення) у Беларусі могуць служыць дзве вазы, выраблены на шклозаводзе «Нёман». Формы ваз аваідальныя. Адна ўстаноўлена на балясіне з круглым пляскатым паддонам, мае прафіляванае на тры аб'ёмы дно, што зближае яе з урэцка-налібоцкімі бакаламі, другая — без паддона, выраблена з накладнога трохслойнага шкла (бясколернага, апакавага і каляровага). Першая — з чырвоным накладам, другая — з кобальтавым. Чырвоным накладам па апакаваму шклу выкананы рэалістычна трактаваныя выявы гронак рабіны (рыс. 63), кобальтавы наклад больш адпавядаў адлюстраванню мясцовага краявіду — некалькі дрэў, якія нагадваюць бярозкі, з сядзячымі на іх птушкамі (захоўваецца ваза ў Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі). У дэкорах гэтых ваз назіраецца перапрацоўка запазычанага «натурстылю», якая праявілася ва ўвядзенні ў дэкор мясцовай флоры і фауны, краявіду, у больш абагульненай трактоўцы выяўленчых форм. Яшчэ адна ваза, вырабленая на шклозаводзе «Барысаў», адлюстроўвае ўплывы мастака Э. Гале ў прымяненні тэхнікі эмалевага роспісу (сл. 4). У гэтай вазе рысы стылю мадэрн адчуваюцца ўжо ў самой форме. Чатырохгранная ў донцы ваза празмерна выцягнута ўверх, выгнутыя цякучыя лініі злёгку перакручаных сценак то разыходзяцца, то зліваюцца, манерна выгінаючыся вакол уяўляемай асі. Падзяляючы погляд Э. Гале аб мэтазгоднасці прымянення некалькіх тэхнік дэкарыравання на адным вырабе, беларускі майстар напісаў на дынамічна выгнутых сценках вазы з апакава-салатнага шкла бела-сінімі эмалямі і золатам буйныя кветкі, якія асацыіруюцца з ірысамі. На першы погляд здаецца, што тут дэкаратыўная перагрузка, але дэкор арганічна лёг на форму, знойдзен у маштабе.



*Рыс. 73. Прыборы для вады і шклянкі. Шклозавод «Барысаў» і гута «Нёман». 1890—1939 гг. Рысункі з каталогаў*

Менавіта тэхніка роспісу шкла эмалевымі фарбамі атрымала ў гэты час асаблівае распаўсюджанне. Беларускія майстры ўводзілі ў дэкоры рэалістычна трактаваныя выявы мясцовых раслін, дрэў, птушак, найбольш папулярных у народзе. Умоўна матывы роспісаў можна падзяліць на кветкавыя, садавінныя і краявідныя. Сярод кветкавых — сустракаюцца выявы вертыкальна размешчаных і манерна выгнутых сцяблінак з ірысамі, браткамі, званочкамі, васількамі, ландышамі, цюльпанамі, макамі, галінкамі бэзу. Сярод садавінных — пераважаюць выявы галінак з вішнямі, чарэшнямі, парэчкамі, агрэстам, сланечнікам, вінаградам, яблыкамі. Рысуючы краявіды, мастакі адлюстроўвалі знаёмыя з дзяцінства карціны: возера ў лесе, грыбы пад бярозкай, бярозы, птушкі на галінках, яловы лес, групу бяроз на фоне курганоў, курганы ў яловым лесе, хату і млын каля лесу, хату на фоне лісцёвага лесу, хату на фоне яловага лесу і інш. (рыс. 73, 104, 105).

Размеркаванне малюнкаў на крывалінейнай паверхні посуду рабілася так, каб уся кампазіцыя роспісу была ў полі зроку і тым самым падкрэслівала форму. Трактоўка кампазіцыі і манера пісьма носяць

народны характар і светаўспрыманнем майстроў набліжаюцца да роспісаў алеем беларускіх народных дываноў.

Хоць большасць форм шкляных вырабаў канца XIX—пачатку XX ст. стваралася ў адпаведнасці з існуючымі стылямі і напрамкамі ў прыкладным мастацтве Заходняй Еўропы, самабытнасць беларускага мастацкага шкла вызначалася дэкорамі, іх тэматыкай, матывамі, характарам кампаноўкі эмалевых малюнкаў на плоскасці, каларытам шкла і роспісаў. Распрацоўкай узораў роспісу, напрыклад, на шклозаводзе графа Ленскага на хутары Устрынь-Боркі з 1880 г. займаўся Міхал Людвіцкі, які працаваў там мастаком, а пазней да 1920 г. працаваў на шклозаводзе «Нёман»[26].

Уплывы стылю мадэрн асабліва выразна праявіліся ў вытанчаных прапорцыях і крыху манерных формах ваз для кветак, так званых «кветнікаў». Візітнай карткай мадэрна ў Беларусі можна лічыць вазы квадратныя і масіўныя ў дне з вузкімі стромкімі сценкамі, якія ўверсе ледзь пашыраліся (рыс. 67, сл. 1). Выраблялі іх у Беларусі з 1890 па 1950 г. з каляровага шкла метадам заліўкі донца ў пэўную форму і выцягваннем сценак на розную вышыню (ад 20 да 120 см). Венчыкі некаторых з іх заканчваліся накшталт кветкавых пялёсткаў (рыс. 67). Ваза вышынёю 120 см сустрэта ў хаце выдзімальшчыка, які працаваў у пачатку XX ст. на гуце в. Астраўно Лідскага р-на. Адна з такіх высокіх ваз гутніка з в. Астраўно захоўваецца ў БДМ. Выраблена яна з накладам рубінавага шкла па бясколернаму крышталю. Выраб такіх ваз патрабаваў ад выдзімальшчыка вялікага майстэрства, спрытнасці і фізічнай сілы. Папулярнымі былі і танкасценныя цiхавыдзіманыя ў формы вазы, якія мелі выгляд жаночай рукі, трымаючай кубак; вазы з рэльефным малюнкам на сценках, які адлюстроўваў мясцовы пейзаж — чапляў на фоне забалочанага азярца з лілеямі, гарлачыкамі і асакой; вазы з хвалістым накшталт рушы венчыкам (сл. 10). Шмат выраблялася ваз, што складаліся з двух аб'ёмаў — цыліндра і шара ў верхняй частцы, цыліндра і конуса ў верхняй частцы, завершанага перфарыраваным венчыкам, цыліндра і біканічнага завяршэння ў верхняй частцы. Многія вазы ўзвышаліся на розных форм паддонах (рыс. 63, сл. 6), чым майстры падкрэслівалі вертыкальнасць, якая была характэрнай рысай шкляных вырабаў у стылі мадэрн.

Формам мадэрна адпавядалі вытанчаныя ў прапорцыях графіны для лікёру з пластычна выгнутымі і выцягнутымі па вертыкалі ручкамі, высокімі ножкамі і коркамі (сл. 7). Большасць з іх выраблялася з накладнога каляровага шкла, шліфавалася авальнай і шырокай гранню, аптычнымі ямкамі і зверху распісвалася каляровымі эмалямі. Многія вырабы ў стылі мадэрн вабяць вынаходніцтвам і нечаканасцю мастацкага рашэння. Гэта былі вырабы сапраўды новыя, асабліва па формах, у якіх дамінавала вертыкальная лінія. Нават шарападобныя тулавы

[26] Прыношу ўдзячнасць былому чаканшчыку шклозавода «Нёман» Э. Л. Тэрасаніну за звесткі аб мастаках і майстрах, якія працавалі на заводзе да 1939 г.

лікёрных прыбораў імкнуліся зрабіць кроплепадобнымі і моцна выцягнутымі. Класічны арнамент мадэрна — манерна выгнутыя, амаль графічна выпісаныя сцяблінкі ўюнка з грамафончыкападобнымі кветкамі і канічнай формы лісточкамі— не атрымаў развіцця на беларускім шкле гэтага перыяду.

Па мастацкаму ўзроўню шкляны посуд беларускіх заводаў не ўступаў вырабам лепшых шклозаводаў Расіі, што адзначалася Камітэтам усерасійскіх сельскагаспадарчых выставак, які ўзнагародзіў Целяханскі завод Залатым медалём «За трудолюбие и искусство» за вырабы з крышталю і каляровага шкла, а Барысаўскі шкло-крышталёвы завод — Вялікім Залатым медалём за высокую якасць вырабаў [27].

Вырабы Старэўскага шкло-крышталёвага завода, які выпрабляў крышталёвы посуд і лямпы, былі ўдастоены вышэйшай узнагароды «Grand-Prix» у 1908 г. на Міжнароднай выстаўцы мастацтва ў Марселі (Францыя) [28]. У 1910 г. вырабы крышталёвай фабрыкі «Барысаў» былі ўдастоены Залатога медаля на выстаўцы шкла ў Парыжы [29].

Усе шкляныя рэчы, што выпрабляліся на шклозаводах Беларусі ў канцы XIX ст., у залежнасці ад тэхнікі фармавання дзяліліся на прасаваныя, выдзіманыя ў рухомыя і нерухомыя формы (ціхавыдзіманыя) і свабодна фармаваныя.

Прасаваныя і выдзіманыя вырабы ў металічных формах называліся «форменнымі» ў «Прейскуранте хрустальной фабрики «Борисов», відавочна, ад таго, што іх форма і дэкор атрымліваліся дзякуючы прасаванню і выдзіманню ў загадзя прыгатаваную форму ў адрозненне ад рэчаў, створаных свабодным фармаваннем.

Сценкі многіх прасаваных вырабаў у 1880—1914 гг. густа пакрываліся вытанчаным нізкарэльефным дэкорам, які наследаваў неагатычныя матывы і матывы неаракако. «Віці аканту», ракайлявыя грабеньчыкі і краты, выявы анёлаў мудрагеліста кампанаваліся на паверхні ваз, шклянак, кілішкаў, лампад, чаш, графінаў. Фрагменты сасудаў з такім дэкорам выяўлены мастаком шклозавода «Нёман» В. Дзівінскай на месцы былой «Новай гуты», якая згарэла ў час першай сусветнай вайны. Паколькі дробнарэльефнымі рысункамі, як карункамі, укрывалі сценкі посуду, каб схаваць матаванасць паверхні пасля прасавання, такія дэкоры атрымалі назву «карункавы стыль». Выяўленыя В. Дзівінскай рэчы сведчаць, што выпрабляліся і танкасценныя прасаваныя вырабы з далікатнымі рэльефнымі «карункавымі» дэкорамі і што яны дадаткова дэкарыраваліся гутнымі пластычнымі аздобамі (фігуркамі людзей, жывёл, птушак, каляровымі ніцямі, сл. 11). Спалучэнне прасавання з гутнымі тэхнікамі значна ўзбагачала мастацкае аблічча вырабаў.

У прасаваных вырабах, якія наследавалі дэкоры шліфаванага шкла, выкарыстоўвалі тонкі слой сульфідна-цынкавага накладу, што дапаўняла каляровую палітру вырабаў апалавымі адценнямі. Для прасаваных вырабаў звычайна ўжывалі шкло вельмі прыгожых адцен-

[27] Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 64.
[28] ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 176, л. 113.
[29] Борисовский стекольный, с. 9.

няў — блакітнае, ружовае, аранжавае, чырвонае, малочнае, чорнае. Прымяняліся і вельмі незвычайныя дэкоры: танюткімі накладнымі жгуцікамі з каляровага глушонага шкла аздаблялі вырабы з бясколернага шкла.

Метадам прасавання выраблялі-ся: 20 відаў шклянак, якія называліся «роўныя», «падцёс», «двайныя», «пальцы», «адмірал», «пейсах», «дзясень»; чаркі і 3 віды ракавін; 15 відаў кілішкаў (рыс. 60, 68, 78, *а*); 9 відаў кружак; 1 від малочнікаў; 8 відаў сальніц; 4 віды масленіц (рыс. 71); 22 віды цукарніц без накрывак і 3 віды з накрыўкамі (рыс. 99); 22 віды ваз на ножцы для садавіны і дэсерту (рыс. 66, 96), у тым ліку 1 від такіх ваз з ручкамі; 2 віды куфэркаў для цукерак і цукру (рыс. 61, 62); 3 віды лампад, 2 віды падносаў (рыс. 96, 100), 2 віды падсвечнікаў (рыс. 90, 91), 12 відаў талерак, у тым ліку 5 відаў на трох ножках.

Кілішкі ў залежнасці ад форм і дэкаратыўных элементаў называліся «адэскія», «з ямкай», «двайныя», «карчмовыя», «дэсертныя», «для каньяку» і інш.

*«Адэскія»* мелі дзесяцігранную чашу, якая ўзвышалася на чатырохгранным подыуме. Кілішкі *«з ямкай»* мелі дзесяціграннае вусце і паўсферычнае донца чашы, якая дэкарыравалася «ў ямкі», г. зн. авальнымі па форме плоскасцямі. У *«двайных»* кілішках была біканічная чаша, аздобленая дванаццаціграннымі плоскасцямі, якія «стыкаваліся» на самай шырокай частцы тулава (рыс. 50). *«Карчмовыя»* мелі дзесяцігранную канічную чашу, устаноўленую на круглым пастаменце (рыс. 68). *«Дэсертныя»* вылучаліся вузкай цыліндрычнай формай чашы, якая дэкарыравалася ў стылі ампір і ўзвышалася на разеткападобным у плане пастаменце.

Формы двух відаў бакалаў паўтаралі формы кілішкаў, толькі бакалы былі большых памераў. Формы і дэкоры гэтых кілішкаў і бакалаў адпавядалі тэхналогіі вырабу прасаванага шкла, таму што яны не былі падробкамі пад вырабы разнога і шліфаванага крышталю.

Сярод прасаваных вырабаў некаторыя вылучаюцца асабліва ўдала знойдзенымі формамі і дэкорамі: некалькі відаў кілішкаў (рыс. 60), масленіц (рыс. 71), ваз для садавіны, цукерак і пячэння (рыс. 66), якія ў каталогу называюцца «карзінамі», сальніц, сухарніц, талерак, усе віды кружак, адзін від падноса.

У 90-я гады шкляныя прадпрыемствы засвоілі агнявую паліроўку, якая здымала матаванасць са сценак прасаваных вырабаў. Іх эстэтычная годнасць залежала ад праекціроўшчыка вырабу, а тэхнічная дасканаласць — ад чаканшчыка металічнай формы, у якой выраб прасаваўся. Чысціня паверхні прэсформ дазваляла прасаваць вырабы са складанымі рысункамі паверхні (рыс. 61, 62, 69, 70). Пры гэтым якасць граней практычна не ўступала сучасным прасаваным вырабам, якія пасля прасавання дашліфоўваюцца ўручную. Увогуле для прасаваных вырабаў таго часу характэрны высокі тэхналагічны і мастацкі ўзровень. Акрамя таго, гэта быў асноўны від шкла, які маглі купляць бяднейшыя слаі грамадства, таму што прасаваныя вырабы былі вельмі таннымі і цана вызначалася за 100 шт., у той час як на рэчы «гладкія» вызначалася за штуку.

Аўтары праектаў прасаваных вырабаў не толькі беларускіх шклозаводаў, але і вядомых заходнееўрапейскіх, такіх, як «Бакара», гута ў г. Валь-Сант-Ламбер [30], невядомы. Часта шклозаводчык купляў рэч, якая яму падабалася, і перадаваў яе свайму чаканшчыку. Калі ўзору не было, каб па ім зрабіць форму, то карысталіся ілюстрацыямі з ілюстраваных цэннікаў, якія выдаваліся з 1820 г. (першы быў выдадзены гутай «Бакара»). Акрамя таго, гатовыя формы для прасавання вырабаў купляліся адной гутай у другой [31].

Акрамя «форменных» прасаваных вырабаў з нізкарэльефнымі дэкорамі на сценках, выраблялiся выдзіманыя ў формы гладкасценныя вырабы, асартымент якіх быў вельмі разнастайны. Шклянкі рабілі 18 відаў, у тым ліку 3 віды шклянак карманных (мелі плоскую форму); графіны 14 відаў для розных він і каньякоў, вады, пуншу, шампанскага пад назвамі «бакара», «сербскія», «нацыяналь», «адэскія», «з трайнымі абручамі», «з 4 абручамі», «з шарам», «з жылкай», у тым ліку 6 відаў начных графінаў (рыс. 74); туалетныя прыборы 20 відаў (рыс. 93, сл. 3); вазы для садавіны (карзіны) 3 відаў (рыс. 65); вазы для кветак 30 відаў (рыс. 59, 63, 64, 67, сл. 1, 4, 10); лікёрныя прыборы 36 відаў (рыс. 78, сл. 7); судкі для хрэну 5 відаў; чайніцы 2 відаў (сл. 8); некалькі відаў судкоў для перцу, гарчыцы і воцату, сальніцы, масленіцы 16 відаў; ампулкі (літургічны посуд) 2 відаў; чашкі для чаю са сподкамі 3 відаў; шклянкі са сподкамі 2 відаў; каўпакі для сыру 17 відаў; попельніцы 2 відаў; кілішкі «стэмпкаўскія», «бакара», «бачонкам» — 34 размераў для віна, каньяку, шампанскага і крэму (рыс. 53, 57, 60), шампанкі розных відаў (рыс. 53, 55, 108, *б*), кружкі піўныя 2 відаў, бакалы і шклянкі піўныя 18 відаў; чарнільніцы, арміраваныя металам, 6 відаў; талеркі на 3 ножках 6 размераў, прыборы для крушону 19 відаў, жбаны 3 відаў, паласкацельніцы для пальцаў 5 відаў, міскі для малака 13 відаў; падносы для лікёрных набораў (рыс. 72) і г. д.

На аснове адной формы пэўнага асартыменту (графіна, бакала, кілішка, жбана і г. д.) выдзіманага ў формы гладкасценнага посуду ствараліся адзінаццаць відаў сервізаў, што прызначаліся галоўным чынам для сервіроўкі стала. Разнастайнасць дасягалася за кошт розных відаў уручную выкананых сціплых дэкораў. Выдзіманы посуд дэкарыраваўся гравіроўкай, шліфоўкай, гільяшырнай тэхнікай, траўленнем, пескаструйкай, роспісам эмалямі.

Дэкор пад назвай *«лентачны»* ўяўляў сабой дзве гравіраваныя паралельныя лініі, выкананыя на гільяшырным станку. Дэкор *«лента з зярном»* — дзве гравіраваныя лініі, між якімі размяшчаўся рад шліфаваных авальных лінз. Дэкор *«грань»* уяўляў сабой шліфаваную шырокую вертыкальную грань, якой дэкарываліся ўсе рэчы сервіза (рыс. 60, 77, 78).

У дэкоры *«алівіер стары фасон»* галоўным рытмічным элементам з'яўляліся вертыкальна пастаўленыя авальныя лінзы, якія памерам

---

[30] Polak A. Szkło i jego historia, s. 297.
[31] Там жа, с. 298.

і формай нагадваюць «алівы». Звычайна гэтыя алівы апаясвалі рэч па перыметру (рыс. 56—58, 65).

У гравіраваных дэкорах выкарыстоўваліся розныя раслінныя матывы, а таксама геаметрычныя арнаменты *(«зорачкі», «пірамід»* і *«зоркі прарэз»)*. Пры ўпрыгожанні посуду «зорачкамі» шасціканцовыя гравіраваныя зорачкі, больш буйныя, чым у 1-й палавіне XIX ст., размяшчаліся на посудзе то свабодна, то ў шахматным парадку. Дэкор «пірамід» уяўляў сабой чаргаванне вузкіх і больш шырокіх вертыкальных ліній, утвараючых сілуэт пірамідкі. Шэраг такіх пірамідак размяшчалі ў выглядзе шлячка вакол посуду. Дэкор «зоркі прарэз» атрымліваўся пры чаргаванні гравіраваных шматвугольных зорачак са шліфаванымі вертыкальна пастаўленымі вузкімі аваламі, што напаміналі вузкія прарэзы.

Пералічанымі дэкорамі аздаблялі сервізы на Барысаўскім, Целяханскім, Нёманскім, Старэўскім шклозаводах. Сервізы атрымлівалі назвы, адпаведныя назвам дэкораў.

Частка сервізаў і асобных выдзіманых вырабаў аздаблялася золатам, у тэхніцы дэколі, люстрам, ручным роспісам эмалямі[32]. У сервіз «Алівіер стары фасон» уваходзілі графін з ручкай (рыс. 58), графін без ручкі, шклянкі «роўныя» і шклянкі «падцёс», кілішкі (фужэры), бакалы для шампанскага, кілішкі для крэму (рыс. 57), шампанкі, паўшампанкі, кілішкі для каньяку, сподкі, талеркі на трох ножках, ваза для садавіны («карзіна»), масленіца, малочнік (рыс. 56), жбан, кілішак для лімона. Паступова колькасць рэчаў, якія ўваходзілі ў склад сервізаў, скарачалася. Так, у сервіз «Алівіер новы фасон» ужо не ўключалі шклянкі, шампанкі, сподкі, талеркі, масленіцу, малочнік, жбан.

Самыя складаныя і прывабныя формы і дэкоры мелі вырабы, што выдзімаліся ў нерухомыя формы. У гэтых вырабах прыкладнога мастацтва яшчэ спалучаліся такія розныя ў сучасным асэнсаванні паняцці, як масавае і індывідуальнае, таму што кожная рэч, якая выконвалася нават не свабодным выдзіманнем, а ў нерухомую форму, мела адхіленні, хоць і нязначныя, у сілуэце, рысунку рэльефа, таўшчыні слою шкла. Гэтыя рэчы сёння ўспрымаюцца як індывідуальныя, непаўторныя.

У канцы XIX ст. шліфаванае шкло зноў набыло папулярнасць. Гэта былі вырабы пераважна з цяжкага свінцовага крышталю, таўстасценныя, уся паверхня якіх шліфавалася «ў брыльянт», а таксама глыбокімі двух-, трох- і чатырохграннымі паліраванымі гранямі (рыс. 59). З граней утвараліся розныя геаметрычныя рысункі — «зоркі», «кусты», «розы», «разеты», «рускі камень». Выкарыстоўвалася і плоскае шліфаванне «алівіер», з якога асабліва вылучаўся дэкор «алівіер маскоўскі», а таксама выемчатае шліфаванне пад назвай «Прага», «грант» і інш. Адзін від шліфаваных дэкораў называўся «Нёман» (рыс. 68).

Рытмічнае паўтарэнне пэўных элементаў дэкораў на крывалінейных сценках сасудаў давала вельмі

---

[32] ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 261, л. 37 аб, 38; ф. 311, воп. 1, спр. 204, л. 5—7.



*Рыс. 74. Прыборы для вады. Шклозавод «Барысаў» і гута «Нёман». 1890—1939 гг. Рысункі з каталогаў*

эфектныя вынікі. Дробныя шліфаваныя грані зіхацелі на сасудах нібы брыльянтавыя россыпы. Гэта фаза ў развіцці шкла атрымала ў Амерыцы назву «брыльянтавы стыль» [33], у Расіі — «мальцаўскі стыль».

У тэхніцы шліфоўкі выконвалі шырокую грань і авальныя лінзы, якія таксама, як і ва Урэччы, называліся «ў ямкі» і «стары алівіер».

Акрамя крышталю шліфаваннем дэкарыраваліся і выдзіманыя вырабы з добра асветленага высокай якасці і чысціні колеру шкла без якіх-небудзь адценняў, так званае бемскае шкло (рыс. 56—58, 60, 65, 66). Шліфаванае шкло трактавалася як цякучая маса, што імгненна застыла і стала моцнай, як камень, які можна рэзаць, шліфа-

[33] Polak A. Szkło i jego historia, s. 298.

ваць, паліраваць. Сціплыя ўзоры шліфавання, напрыклад «алівіер», наносіліся на найбольш выпуклую частку сасуда, астатняя паверхня заставалася гладкай іззяючай, падкрэсліваючы прыгажосць шкла як матэрыялу. У такіх вырабах дэкор тактоўна падкрэсліваў форму. Яны сёння ўспрымаюцца як сучасныя.

Шматслойнае каляровае шкло выдзімалася і дэкарыравалася па метаду чэшскіх майстроў і метаду Э. Гале. Асноўнае мастацкае значэнне мелі ў першым — працэс шліфоўкі верхняга слою і выяўленне ніжніх слаёў шкла, у другім — працэс вытраўлівання на знешнім накладзе пераважна раслінных і сюжэтных рысункаў (рыс. 63).

Пад уплывам амерыканскага мастака па шклу Луі Камфара Ціфані (1848—1933) на шкло-крышталёвых заводах «Барысаў», Старэўскім, Целяханскім і на нёманскіх выраблялі разнастайныя рэчы з пакрыццем серабрыстай плёнкай (бакалы, кілішкі, вазы для кветак, цукарніцы, падсвечнікі, садовыя шары)[34]. Адзін такі падсвечнік захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным музеі БССР.

У разглядаемы перыяд замест гравіравання і разьбы па шклу шырока прымянялася траўленне кіслотамі. З 30-х гадоў XIX ст. рысункі наносілі іголкай па тонкім слоі воску, якім пакрывалі посуд перад пагружэннем яго ў ванну з кіслатой. Гэты працэс у 80-я гады ўжо крыху спрасцілі — узоры пачалі наносіць на воск пры дапамозе шаблонаў з тонкай бляхі. У 90-я гады геаметрычныя ўзоры на воск наносілі пры дапамозе гільяшырнага станка і рысуючага аўтамата, які замяніў разьбу карундавым калёсікам. Сярод рысункаў тэхнікі гільяшыравання больш усяго сустракаліся арнаменты «кляймёны», які ўяўляў сабой выявы стылізаваных манаграм, і «косы грант»[35]. Апошні складаўся з дыяганальна размешчаных гравіраваных ліній, што апаясвалі выраб уверсе, у самым шырокім месцы (сл. 8) ці пасярэдзіне.

Асноўную масу прадукцыі шклозаводаў у Барысаве і Бярозаўцы складалі прасаваныя вырабы, якія выпускаліся ў шырокім асартыменце. Формы і дэкоры лепшых прасаваных вырабаў канца XIX — пачатку XX ст. сталі асноўнымі ў мастацкім шкле Заходняй Беларусі 30-х гадоў XX ст. У гэты час на змену мадэрну пачатку веку прыйшлі новыя вельмі рацыянальныя стылістычныя плыні, якія ўзніклі ўнутры мадэрна як вынік яго эвалюцыйнага развіцця,— канструктывізм і функцыяналізм. Яны атрымалі найбольш выразнае тэарэтычнае і практычнае здзяйсненне ў дзейнасці нямецкай школы дызайна пад назвай «Баўхаўз», якая аказала значны ўплыў на развіццё дызайнерскага напрамку ў шкларобстве свету, у тым ліку і Заходняй Беларусі. Праекціроўшчыкі шкла пачалі распрацоўваць узоры масавых вырабаў. Прыгажосць рэчы раскрывалася праз чысціню выражэння ўласцівасцей матэрыялу. Форма падкрэслівала канструкцыю і рабіла функцыю рэчы яснай і чот-

[34] ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр, 261, л. 38; Цэннік «Хрустальной фабрики «Борисов».— Мн., 1904.

[35] ЦДГА БССР, л. 311, воп. 1, спр. 261, л. 47 а, б.

кай. Функцыяналізм абапіраўся на здзяйсненні заканамернасцей, якія ўласцівы форме, утворанай машынным спосабам. Раней аб прыгажосці меркавалі зыходзячы з антычных ідэалаў, сутнасцю якіх быў чалавек. У час фарміравання функцыяналізму асэнсавалі, што сутнасць тэхнікі, якая ў працэсе сваёй эвалюцыі адышла ад сувязі з чалавечымі адчуваннямі і формамі яго цела, грунтуецца на ўласцівасцях матэрыялаў і канструкцыйных заканамернасцях. Патрабаванні і законы тэхнікі, а таксама новыя матэрыялы (сталь, бетон) пранікл ў будаўніцтва і потым праз архітэктуру занялі вядучае становішча ў мастацкіх рамёствах. Патрабаванні механізаванай шкляной вытворчасці адлюстраваліся ў навізне форм і дэкораў, якія першымі прапанавалі архітэктары — аматары новага напрамку. Невыпадкова, што асновапаложнікам ранняга функцыяналізму быў венскі архітэктар, які праектаваў рэчы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, Ёзаф Хофман. Ён з самага пачатку XX ст. адстойваў як асноватворныя элементарныя геаметрычныя фігуры — трохвугольнік, квадрат, круг. Менавіта ён прывіў на багемскіх гутах цяжкія «вуглавыя» формы і стаў спалучаць геаметрычную арнаментацыю з грацыёзным рысункам венскага класіцызму. Вялікі ўклад у развіццё ідэй функцыяналізму ў чэшскім шкле пачатку XX ст. унёс Ян Катэра, які стварыў новыя формы посуду з улікам яго функцыі, спецыфікі шкла як матэрыялу, тэхналогіі, адзінства формы і дэкору. Гэтымі рысамі адзначаны яго прыбор для пуншу, які быў выкананы ў 1904 г. [36] і ўвайшоў у лік сусветнай класікі мастацкага шкла.

Водгукі творчасці Яна Катэры вельмі прыкметны ў вырабах нёманскіх заводаў 1910—1930 гг. (рыс. 77, 78). Асабліва шырока нёманцы выкарыстоўвалі шырокую грань, якой карыстаўся Я. Катэра. У пачатку другога дзесяцігоддзя XX ст. у беларускім шкле побач з рэчамі ў стылі мадэрн пачала прывівацца прастата геаметрычных форм ранняга канструктывізму і функцыяналізму, якія прапаведаў Хофман (рыс. 83).

Неабходна падкрэсліць, што працэс гэты меў дыфузны характар, таму што частка вырабаў у стылі мадэрн яшчэ была ў асартыменце заводаў амаль да 40-х гадоў. Іх выраблялі па старых вельмі трывалых металічных формах (рыс. 63, 64, сл. 1). Уладальнікі шклозаводаў улічвалі слабую цікавасць інертнай часткі насельніцтва да ўсяго новага. Але ўжо з 20-х гадоў асартымент вырабаў нёманскіх гут пастулова папаўняўся новымі формамі, што сведчыла аб станоўчых адносінах шклозаводчыка Ю. Столе да новых веянняў у мастацтве шкла — канструктывізму і функцыяналізму, дызайну, які выразна сфарміраваўся як галіна мастацтва намаганнямі нямецкай школы Баўхаўз; вакол яе згрупаваліся дызайнеры многіх краін свету і асабліва Еўропы.

---

[36] Modernes Böhmisches Glas.— Praga, 1963, s. 12.

# ШКЛЯРОБСТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1920—1939 ГГ.)

Паколькі буйнейшы ў БССР шклозавод «Нёман», які вырабляе мастацкае шкло, да 1939 г. знаходзіўся ў складзе буржуазнай Польшчы, то мастацкі ўзровень яго прадукцыі вызначалі стылі і плыні, што складваліся ў гэты час у Заходняй Еўропе.

Важную ролю ў прапагандзе ідэй дызайна адыграла арганізаваная Інстытутам Баўхаўз у 1923 г. першая выстаўка вынікаў яго дзейнасці «Мастацтва і тэхніка, новае адзінства», на якой не толькі экспанаваліся работы, выкананыя ў яго майстэрнях, але і чыталіся даклады аб новых праблемах у архітэктуры і будаўніцтве, у мастацкім мадэліраванні, падрабязна асвятляліся прынцыпы выхавання і навучання ў Баўхаўзе. Першыя гады ў творчасці мастакоў Баўхаўза важную ролю адыгрывалі элементы экспрэсіяналізму і фармалізму. К 1925 г. ідэя функцыянальнай формы са сферы прыкладнога мастацтва перанеслася нават у сферу «свабодных мастацтваў», што спрыяла ўзнікненню сінтэзу архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў гарадскіх архітэктурных комплексах. Выступленні майстроў Баўхаўза ў Германіі і за яе рубяжом, распаўсюджванне кніг аб іх поглядах і праграме, выставачная дзейнасць, часопіс школы, які выходзіў з 1926 г., звярнулі ўвагу сусветнай грамадскасці на дзейнасць гэтай прагрэсіўнай школы. Паступова асновы дзейнасці Баўхаўза ўвялі Мастацкая акадэмія ў Вроцлаве, мастацка-рамесныя школы ў Гале, Штэціне, Гамбургу. Ячэйкі вакол людзей, што скончылі школу Баўхаўз, узніклі ў Венгрыі, Галандыі, Швейцарыі, Японіі.

Мастацкая і выхаваўчая дактрыны Баўхаўза атрымалі сусветнае прызнанне, што сведчыла аб распаўсюджванні перадавых ідэй у архітэктуры і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, якія адпавядалі духу і стылю жыцця XX ст. У 20-я гады ў практыцы Баўхаўза складвалася пэўнае стылістычнае адзінства менавіта архітэктуры і дэкаратыўна-прыкладных мастацтваў. Тэарэтыкі Баўхаўза імкнуліся, каб у мастацтве адбывалася ўзаемаўзбагачэнне і арганічны сінтэз усіх мастацкіх і тэхнічных сродкаў.

Сама мастацкая форма разглядалася імі як вынік сінтэзу навукова-

га пазнання, творчага бачання і здольнасці актыўнага фарміравання прадметнага асяроддзя. У аснове ўнутранай аднароднасці форм, дасягнутай Баўхаўзам у другой палавіне 20-х гадоў, ляжалі прынцыпы новай эстэтыкі, якая прадугледжвала адзінства функцыянальнага прызначэння і прыгажосці, узнікаючых у выніку стварэння мастаком мэтазгоднай формы. Яны імкнуліся аднавіць класічны тэзіс антычнай эстэтыкі, лічыўшай прыгожай тую рэч, што ідэальна адпавядае сваёй функцыі. Класічныя прапорцыі былі галоўнымі мастацка-выразнымі сродкамі дэкаратыўнага мастацтва ранняга функцыяналізму.

Мастацкі рух за эстэтычнае асваенне машыннай тэхнікі і яе форм пракаціўся па многіх краінах свету і рэхам адгукнуўся ў Заходняй Беларусі. Разглядаючы Каталог шкляных гут Ю. Столе «Niemen», які быў выдадзен у 1939 г., мы бачым прасаваныя шкляныя вырабы для сервіроўкі стала — кабарэты, латкі і сырніцы — чоткіх прамавугольных форм (рыс. 75, 76), новага стылістычнага рашэння прасаваныя лыжкі і відэльцы, выробленыя ў поўнай адпаведнасці з ідэямі школы Баўхаўз. Мэтазгоднасць формы, функцыя рэчы і тэхналогія прасавання, а таксама прыхільнасць функцыяналістаў да прамалінейных геаметрычных форм вызначалі і яе мастацкае рашэнне — плоскія падоўжаныя ці кароткія формы многіх кабарэтаў-латкоў з выступаю-



*Рыс. 75. Кабарэты, latkі; лыжка, відэлец і падстаўка для іх. Гута «Нёман». 1920—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман».*



*Рыс. 76. Кабарэт. Гута «Нёман». 1920—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*

чымі па тарцовых баках плоскімі прамавугольнымі ручкамі, за якія іх вельмі зручна браць, паднімаць і пераносіць. Праектуючы гэты посуд, мастакі карысталіся толькі простымі чоткімі лініямі ў адпаведнасці з эстэтычнай канцэпцыяй школы Баўхаўз. Латкі і кабарэты замянілі традыцыйныя блюды і талеркі і прызначаліся для розных салатаў, смажанага мяса з разнастайнымі гарнірамі. Пры гэтым на кабарэтах і латках прадугледжвалася некалькі перагародак, якія аддзялялі мяса і розныя гарніры адзін ад другога. Рытмічна размешчаныя перагародкі, як і ручкі, акрамя таго што маюць функцыянальнае прызначэнне, з'яўляюцца адначасова і дэкорам. Посуд гэты арыгінальны па канструкцыі, форме і функцыі. Ён створан упершыню ў сусветнай практыцы (формы посуду былі стабільна традыцыйнымі на працягу некалькіх тысячагоддзяў) і з'яўляецца дзецішчам XX ст. У гэтых рэчах вабіць бездакорнасць прапорцый, чысціня ліній.

Да вырабаў ранняга функцыяналізму, формы і дэкоры якіх узніклі ў беларускім шкле пад уплывам творчасці чэшскага мастака Яна Катэры і венскага мастака-архітэктара Ёзафа Хофмана, адносяцца прасаваныя і выдзіманыя дэкарыраваныя шырокімі неарнаментаванымі гранямі бакалы (рыс. 78, *а*), туалетныя флаконы (рыс. 78, *б*), туалетныя прыборы (рыс. 93, сл. 3), лікёрныя прыборы (рыс. 78, *г*), судкі для спецый, вазы для кветак (рыс. 78, *в*). Яны вылучаюцца высокай прафесійнай культурай простых геаметрычных форм конуса, цыліндра, шара, падкрэсленых толькі вертыкальнымі рытмамі плоскасцей шырокіх граней. Менавіта грані — адзіны дэ-



*Рыс. 77. Ваза. Гута «Нёман». 1910—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*

кор, які арганічна звязаны з формай. Суразмерныя па маштабу з сасудамі шырокія грані з'яўляюцца арыгінальным з-за сваёй класічнай прастаты і вельмі вытанчаным дэкорам.

Шырокія трохвугольныя, квадратныя і рамбічныя грані, закладзеныя ў формах, удала падкрэслівалі кубістычныя формы туалетных і аптэчных флаконаў, латкоў, пудраніц, ваз (сл. 3, 9).

Разам з тым некаторыя беларускія вырабы часоў ранняга функцыяналізму мелі вуглаватыя, прамалінейныя і груваткія формы (рыс. 80, *а—в*).

У сувязі з тым што ў 1910—1930 гг. увогуле ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Заходняй Еўропы і ў прыватнасці ў мастацкім шкле пачалі праектаваць выра-




*Рыс. 78. Вырабы гуты «Нёман», дэкарыраваныя шырокай гранню: а — кілішак; б — парфюмерныя флаконы; в — вазы; г — прыборы для лікёру і каньяку. 1910—1939 гг. Рысункі з каталога*



*Рыс. 79. Жардзіньера. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Вышыня 23 см, дыяметр вусця 25,8, паддона — 17,4 см. Музей шклозавода «Нёман»*




*Рыс. 80. Прасаваныя вырабы гуты «Нёман»: а і б — жардзіньеры; в і г — вазы; д — цукарніца. Рысункі з каталога*



*Рыс. 81. Ваза. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман»*

часці А. Метэлака, які ў 1924 г. стаў на чале першай чэшскай шклотэхнічнай школы ў Жалезным Бродзе [37]. Згодна з мастацкай праграмай школы, там вывучаліся і прапагандаваліся ў новых узорах тэхналагічныя і мастацка-творчыя ўласцівасці бясколернага і каляровага шкла, якое прасавалі, адлівалі, выдзімалі, шліфавалі, гравіравалі, распісвалі, дэкарыравалі траўленнем і гутным спосабам, з яго выраблялі дэкаратыўную пластыку і ювелірныя вырабы.

Верагодна, што выхаванцы гэтай школы нейкі час працавалі на нёманскіх гутах Ю. Столе. Гэта думка ўзнікае пасля аналізу шэрагу нёманскіх вырабаў 20—30-х гадоў, якія формамі, дэкорамі, агульнай стылістыкай набліжаюцца да твораў А. Метэлака (рыс. 81, 83). Пэўную ролю ва ўзаемаўплывах

бы архітэктары Ё. Хофман, Ян Катэра ў Празе, Алоіз Метэлак у Жалезным Бродзе, у мастацкім шкле 20—30-х гадоў пачалі з'яўляцца рысы канструктывізму і кубізму. Формы вырабаў значна ўскладніліся, яны складаліся з некалькіх аб'ёмаў, якія прасаваліся асобна і потым манціраваліся ў адзіную рэч. Многія вырабы сталі нават шмат'яруснымі (рыс. 79, 80, *а*, 83, *ж*). Асабліва выразна рысы гэтых стылявых напрамкаў праявіліся ў твор-

[37] Glass Review. 1977, № 8, s. 13.



*Рыс. 82. Масленіца. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 1. Вазы «кветнікі». Гута «Нёман». 1910—1939 гг.*
*Музей шклозавода «Нёман»*



*Рыс. 2. Жардзіньера і фрагмент прыбора для лікёру. 1920—1939 гг.*
*Музей шклозавода «Нёман»*



*Рыс. 3. Туалетны прыбор. Гута «Нёман». 1920—1939 гг.*
*Музей шклозавода «Нёман»*



*Рыс. 4. Ваза. Шклозавод «Барысаў». 1900—1910 гг. ДМ БССР*



*Рыс. 5. Посуд для дэсерту і салатнік. Гута «Нёман». 1920—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 6. Вазы. Гута «Нёман». 1910—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман»*



*Рыс. 7. Графін для лікёру. Шклозавод «Барысаў». 1900—1917 гг. ДМ БССР*



*Рыс. 8. Вырабы Гомельскай крышталёвай фабрыкі. 1800—1860 гг. Гомельскі абласны краязнаўчы музей. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 9. Ваза і бакал. Гута «Нёман». 1910—1939 гг. ДМ БССР. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 10. Ваза. Гута «Нёман». 1910—1939 гг. ДМ БССР*



*Рыс. 11. Фрагменты посуду з каляровага шкла. В. Новая Гута (хутар Маладзіна). 1894—1914 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

гэтага часу адыграла і міжнародная Парыжская выстаўка (1925).

Рысы канструктывізму праяўляюцца ў складанай, можна сказаць, архітэктурнай пабудове нёманскіх ваз для кветак, што ўзвышаюцца на трохступеньчатым квадратным у плане пастаменце (рыс. 80, *б*), а таксама ваз-жардзіньер, якія складаюцца з розных аб'ёмаў, выробленых асобна (прасаваных, літых ці выдзіманых) і потым зманціраваных адзін з другім (рыс. 79, 80, *а*, 83, *ж*). Складаную архітэктанічную пабудову мелі таксама жардзіньеры (сасуды для кветак з кароткімі сцяблінкамі, узніклі пад уплывам стылю бідэрмеер), якія ўстанаўліваліся звычайна на трох пілонападобных ножках (рыс. 79). Іх чашы канічныя, нізкія, шырока раскрытыя. Сустракаюцца жардзіньеры, устаноўленыя на пяці пілонападобных ножках, якія ў сваю чаргу размяшчаюцца на высокім паддоне канічнай формы. Дэкор чашы жардзіньеры будуецца нібы з канструк-




*Рыс. 83. Прасаваныя вырабы гуты «Нёман»: а і в — попельніцы; б — жардзіньера; г, д, е — вазы; ж — чаша жардзіньеры. 1930 — 1940 гг. Рысункі з каталога*



*Рыс. 84. Масленіцы. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 85. Фрагмент сервіза. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*

тыўных прамавугольных і трапецападобных элементаў (фактычна гэта рэльефныя размешчаныя па дыяганалі палосы, якія ствараюць зубчасты край па вусцю). Акрамя таго, з двух бакоў чаш прымацаваны арыгінальнай канструкцыі ручкі — у выглядзе дзвюх выгнутых палосак шкла, якія звужаюцца ў месцах злучэння са сценкамі чашы.

Складаная канструктыўная пабудова формы, кубістычнае дэкаратыўнае рашэнне сведчаць, што падобная ваза магла быць створана на стыку аджываючага свой век мадэрна (грацыёзнасць прапорцый і прэтэнцыёзнасць формы) і ўзнікаючага канструктывізму (ускладненасць канструктыўнай пабудовы рэчы) і кубізму (расчлянёнасць так характэрнай для шкла адзінай плоскасці чашы, паддона і ручак на геаметрычныя формы прамавугольніка і трапецыі, якія прыменены ў дэкоры).

Падобныя вырабы, з аднаго боку, уражваюць велічнай манументальнасцю, з другога — тэхнічнай дасканаласцю выканання складаных канструкцый і дэкораў, а ўвогуле падобнае рашэнне здаецца не ўласцівым шклу як матэрыялу. Геаметрызм форм, канструкцый і дэкораў надаў сухаватасць і адначасова яркую, незабыўную выразнасць гэтым творам са шкла. Жардзіньера ў такім рашэнні і выкананні ўспрымаецца як скульптура, а не ваза для кветак. Як бачым, нёманскія вырабы гэтага часу, як і чэшскія, адзначаны небывалай у сусветнай гісторыі шкларобства арыгінальнасцю і свежасцю форм і дэкораў.

Мяркуючы і па іншых вырабах такога стылю, у творчасці іх стваральнікаў адчуваюцца тэндэнцыі надаць манументальную значнасць бытавым рэчам са шкла — вазам для пячэння, вазам для кветак, жардзіньерам, цукерачніцам. Мастакі нібы сцвярджалі за бытавымі рэчамі права быць творамі мастацтва. Усе гэтыя вырабы ўстанаўлі-

валіся на разнастайныя паддоны — круглыя і плоскія, высокія канічныя, плоскія рамбічныя і дванаццацігранныя, у выглядзе чатырох кранштэйнаў, у выглядзе трох круглых кароткіх ножак і г. д.

У 20-я гады на нёманскіх гутах былі дасягнуты вялікія поспехі ў распрацоўцы дэкораў рэчаў з бясколернага і каляровага шкла, якія выраблялiся прасаваннем і ціхім выдзіманнем. Гэтыя рэчы і метады іх вырабу не страцілі актуальнасці і ў нашы дні, калі ўзнікла неабходнасць расшырэння аб'ёмаў вытворчасці мастацкіх шкляных вырабаў. Іх дэкоры і формы і сёння глядзяцца як сучасныя. Размова ідзе аб распрацоўцы і прымяненні разнастайных фактур прасаванага шкла — матавых *(рыфленых, рэльефных)* і бліскучых — у адным вырабе (рыс. 80, *г*, 83, *б*, *е*, 84, 87, 88, 94). Такія дэкоры адпавядаюць і ўласцівасцям ціхавыдзіманых вырабаў (рыс. 89, 92).

Рыфленыя паверхні прасаваных вырабаў пакрываліся дробнымі і буйнымі пухіркамі. Звычайна рыфленыя плоскасці перамяжаліся з бліскучымі вертыкальна або радыяльна размешчанымі палосамі (рыс. 84, 85, 87), кругамі і сігмападобны-



*Рыс. 86. Прыбор для крушону (фрагмент). Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Музей старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АН БССР. Вышыня крушонніцы з накрыўкай 39,6 см, дыяметр вусця 21,3 см*



*Рыс. 87. Фрагмент прыбора для салаты. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 88. Фрагмент прыбора для салаты. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 89. Фрагмент прыбора для лікёру. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Музей старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АН БССР*

мі завіткамі (рыс. 94). На стыку рыфленых і гладкіх палос размяшчалі які-небудзь рэльефны элемент, напрыклад стылізаваны лісток, які аб'ядноўваў кантрастныя па фактуры і рельефу дэкоры. Неабходна падкрэсліць, што бліскучыя палоскі заўсёды выступалі ў такіх формах рэльефна на вышыню не менш 1 см, а рыфленыя матавыя палоскі заўсёды размяшчаліся контррэльефна, чым дасягалася мноства святлоценявых эфектаў (рыс. 88, 89, 95), якія надавалі рэчы выразную дэкаратыўнасць.

Найбольш удалым прыкладам спалучэння рыфленых і гладкіх фактур у прасаваным шкле з'яўляецца прыбор для крушону, выраблены са шкла колеру «разалін» (рыс. 86). Буйнамаштабная крушонніца мае форму ўсечанага конуса з высокай канічнай накрыўкай. З двух бакоў крушонніца дэкарыравана ўдала вырашанымі формамі ручак, якія маюць выгляд трох валютападобных завіткоў. Такія ж валютападобныя завіткі ўпрыгожваюць вострае канічнае наверша накрыўкі. Рыфленыя і бліскучыя



*Рыс. 90. Падсвечнік. Шклозавод «Барысаў» і гута «Нёман». 1890—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 91. Падсвечнік. Гута «Нёман». 1920—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

паверхні ў гэтым вырабе размешчаны трыма ярусамі-паясамі, дзе бліскучыя паверхні ў выглядзе стылізаваных раслінных галінак выступаюць над нейтральнай рыфленай фактурай фону. Манументальных форм і памераў крушонніца, якая ўстаноўлена на масіўным дванаццацігранным паддоне-пастаменце, нагадвае скульптуру. Чашкі паўтараюць форму крушонніцы і яе дэкаратыўныя элементы, але ручкі ў іх размешчаны толькі з аднаго боку. У свой час выраб такіх прасаваных рэчаў адлюстроўваў вялікія магчымасці масавай вытворчасці мастацкіх шкляных вырабаў ва ўмовах механізаванага прадпрыемства. Разглядаемыя рэчы сведчаць аб высокім узроўні тэхнічнага абсталявання нёманскіх гут высакаякаснымі металічнымі формамі і



*Рыс. 92. Флакон для парфюмерыі. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Музей старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АН БССР. Публікуецца ўпершыню*

аб належнай кваліфікацыі спецыялістаў, што забяспечвала вялікае тыражыраванне вырабаў добрай якасці.

Акрамя вышэй пералічаных строга лінейных рыфленых дэкораў, у прасаваным шкле прымяняліся і не так яўна арганізаваныя рыфленыя кампазіцыі, напрыклад дэкор пад назвай *«калючка»* — па ўсёй паверхні пасудзіны ў шахматным парадку размяшчаліся рэльефныя пухірочкі.

Частка прасаваных вырабаў дэкарыравалася featуз рознымі па форме і памеру гранямі, скампанаванымі вельмі разнастайна. Але яны ўяўлялі сабой механічнае перанясенне ў прэс ручных прыёмаў дэкарыравання вырабаў гранeннем (рыс. 98, 106). Адны дэкоры прэса імітавалі трохграннае шліфаванне (рыс. 100, сл. 5), другія — двухграннае (рыс. 99). Частка вырабаў мела больш складанае дэкаратыўнае рашэнне.

У якасці *рэльефных* дэкораў прасаваных вырабаў выкарыстоўвалі іншыя выяўленчыя сродкі: контррэльефныя выявы раслінных галінак; выгнутых па кругу вінаградных лоз з гронкамі, добра скампанаванымі на плоскасці; нацюрмортна пададзенай садавіны; галінак рабіны, чарэшні; стылізаваныя выявы елак (рыс. 84, 88, 95, 96).

На плоскіх частках попельніц, падносаў, селядзечніц размяшчалі выявы сабак, кацянят, коней, пеўняў, аленяў на фоне лесу, рыб.

Акрамя таго, было распрацавана шмат рэльефна выступаючых гладкіх дэкораў, г. зн. без узбагачэння фактуры шкла. Яны ўяўлялі сабой разнастайныя канцэнтрычныя салярныя выявы, кропкавыя кампазіцыі, пляцёнкавы арнамент, графічна прапрацаваныя; лускаватыя выявы, якія ў XVIII ст. называлі беларускія майстры «арнамент у карпавую луску»; згрупаваныя ў форме трохвугольнікаў выявы лісцяў, якія ўпрыгожвалі талеркі, жардзіньеры, сподкі, цукерніцы. Упрыгожваўся посуд і арнаментамі — геаметрычным (рыс. 95), раслінным (рыс. 96), часам яны спалучаліся. Асноўным элементам геаметрычных арнаментаў былі рэльефныя кан-



*Рыс. 93. Туалетны прыбор. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 94. Фрагмент прыбора для салаты. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

цэнтрычныя акружнасці на «точечной» паверхні контррэльефу, раслінных — сцябло з кветкамі і лісцямі.

На новую выразную мову прасаванага шкла майстры перанеслі мясцовыя матывы гравіраваных і шліфаваных кампазіцый, заклаўшы ўсе гэтыя дэкоры ў форму. Часцей гэтыя пераасэнсаванні былі плённымі. Аднак у асобных выпадках дэкоры (у іншых тэхніках звычайна працаёмкія) спрачаліся з самой ідэяй тэхналогіі прасаванага шкла, якая патрабавала распрацоўкі ўласных дэкораў. Трэба адзначыць, што беларускія шкларобы стварылі шэраг вельмі ўдалых дэкораў, якія цалкам адпавядалі тэхналогіі прасавання шкла (рыс. 84—86, 88, 89). Падобныя дэкоры ўжо не імітавалі традыцыйнае шліфаванне і гравіроўку. Майстры разумелі, што прэс не можа даваць гладкія бліскучыя паверхні на вялікіх плошчах, і таму асноўная задача зводзілася да распрацоўкі пластычнага і фактурнага ўзбагачэння паверхні прасаваных вырабаў. Нёманскія вырабы, што захаваліся ў заводскім музеі і прыватных калекцыях майстроў, сведчаць, што з гэтай задачай нёманскія майстры 20—30-х гадоў добра справіліся.

Рысы кубізму ў дэкаратыўных кампазіцыях прасаваных вырабаў праяўляюцца ў чляненні іх плоска-



*Рыс. 95. Блюда. Гута «Нёман». 1920—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 96. Прасаваныя вырабы гуты «Нёман». 1910—1939 гг. Рысункі з каталога*

сцей на трохвугольнікі, ромбы, трапецыі, якія размяшчаліся спіральна або па дыяганалі, што надавала дэкору дынамічнасць, якая стрымлівалася формай.

У нацыянальных традыцыях геаметрычнага арнаменту выканана ваза для кветак, паддон якой у плане меў канфігурацыю рамбічнага ступеньчатага арнаменту, а профілі сценак паўтаралі яе, і ў выніку па абрысу вусця таксама лёгка прачытваўся гэты ж арнамент (рыс. 80, *в*).

У тэхніцы прасавання выконвалася і дробная пластыка, якую звычайна выкарыстоўвалі ў дэкоры накрывак маслёнак і ручак сальніц. Так, на накрыўках маслёнак утульна сядзелі квактухі і лебедзі, а ў якасці ручак сальніц узвышалася фігура сядзячага мядзведзя. Усе фігуры трактаваліся натуралістычна (рыс. 71).

Неабходна падкрэсліць, што формы многіх прасаваных вырабаў былі вытанчанымі, а прапорцыі дасканалымі (рыс. 86, 89, 91, 92, 98). Дэкор размяшчалі гарманічна і прадумана на плоскасцях і аб'ёмах, заўсёды падкрэсліваючы форму вырабу. Такім чынам, майстры і мастакі, якія распрацоўвалі формы і дэкоры для прасаваных вырабаў, мелі добрую прафесійную падрыхтоўку і былі добра знаёмы са ста-



*Рыс. 97. Чашка і сподак. Гута «Нёман». 1910—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 98. Цукарніца. Гута «Нёман». 1910—1939 гг. Музей шклозавода «Нёман». Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 99. Цукарніца. Гута «Нёман». 1900—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

нам развіцця мастацкага шкла ў многіх краінах Еўропы і Амерыкі.

З 1920 па 1924 г. на гуце «Нёман» мастаком па роспісу шкляных вырабаў працаваў Васнеўскі, потым Міхаіл Ціткоў да 1940 г. Сам уладальнік шклозавода Ю. Столе таксама распрацоўваў узоры роспісу па шкле і рысункі гравіровак. Да гэтага часу ў музеі завода захаваліся вырабы са светлай гравіроўкай выявы вінаграднай гронкі з лісцем, якую старыя рабочыя называюць «столеўская гравіроўка». Пад такой назвай гэты дэкор праходзіў у дакументах і каталогу завода. Вырабам форм для прасаваных рэчаў займаўся з 1921 па 1934 г. чаканшчык Ганс Гергарт, які абучыў гэтаму рамяству мясцовых жыхароў Леаніда Клюкевіча і Казіміра Буяка [38].

Прэсавая гаспадарка нёманскіх гут была такой дабраякаснай, што прэс-формы 20—30-х гадоў выкарыстоўвалі на шклозаводзе «Нёман» да канца 50-х гадоў (рыс. 64, 79, 81, 86, 96), пакуль на заводзе не з'явіліся ўласныя мастакі, якія пачалі распрацоўваць узоры для выдзіманых вырабаў з накладнога шкла.

*Выдзіманыя* рэчы вырабляліся рознымі тэхнікамі — гутным фармаваннем, выдзіманнем у рухомыя і нерухомыя формы (ціхае выдзіманне). Асартымент выдзіманых рэчаў быў таксама вельмі разнастайны: сталовы, кухонны і аптэчны посуд, вазы, лямпы, абажуры для лямп і люстраў, туалетныя прыборы і інш. Выдзіманы сталовы посуд — жбаны і жбаночкі для вяршкоў, графіны, сырніцы, масленіцы, цукерніцы, вазы для садавіны, шклянкі, кілішкі, з якіх складаліся сервізы, мелі зграбныя цыліндрычныя ці шарападобныя формы з дасканалымі прапорцыямі. Сярод рэзервуараў лямп пераважалі высокія цыліндрычныя формы, абажуры да іх выраблялiся



*Рыс. 100. Блюда. Гута «Нёман». 1910—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

[38] Па звестках былога чаканшчыка шклозавода «Нёман» Э. Л. Тэрасаніна.



*Рыс. 101. Сувенір. Гута «Нёман». 1900—1939 гг. Музей старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АН БССР*

паўсферычнай, крыху сплашчонай формы. Туалетныя прыборы мелі формы кроплепадобныя, шарападобныя ці прамавугольныя.

Дэкарываваліся выдзіманыя вырабы тэхнікамі шліфоўкі, матавай гравіроўкі, вальцаваннем, тэхнікай кракле і роспісам эмалямі.

Тэхнікай шліфоўкі дэкарываваліся жбаны, прыборы для крушону і лікёру, графіны, падносы, шклянкі, абажуры для люстраў, кілішкі, якія мелі больш сухаватыя формы (рыс. 74) і выраблялiся з бясколернага і накладнога каляровага шкла насычаных колераў (чырвонага, зялёнага, фіялетавага, сіняга, жоўтага, малочнага). Сярод рысункаў шліфовак пераважалі тыя ж, што і ў пачатку XX ст.,—«алівіер», «грант», «Нёман», «Прага» і інш. Але часцей пачалі ўжываць шырокую грань, якая вызначала зусім новую стылістыку — канструктывісцкага напрамку.

Матавай гравіроўкай пад назвай «столеўская гравіроўка» пераважна аздаблялі сталовы посуд.

Вальцаваннем пад мясцовай назвай дэкораў «валік» і «віццю» ўпрыгожваліся кроплепадобныя і шарападобныя тулавы жбаноў, сценкі кружак, ваз.

Тэхнікай кракле аздабляліся жбанкі, графіны, вазы для кветак.

Самым распаўсюджаным відам дэкору быў роспіс эмалямі (рыс. 73, 74). Роспісам аздаблялі сувеніры і прэс-пап'е (рыс. 101), вазы (рыс. 103), графіны, жбанкі (рыс. 73, 74), шклянкі, кілішкі, бакалы і



*Рыс. 102. Кілішак. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

асабліва шмат распісвалася настольных лямп (рыс. 104, 105), якія разам з прасаваным посудам (рыс. 79, 86, 89) экспартаваліся ў многія краіны свету і больш усяго ў Турцыю. Матывы і сюжэты роспісаў засталіся тыя ж, што былі ў канцы XIX ст. Часцей за ўсё сустракаюцца грацыёзна выгнутыя сцяблы з лісцямі, увенчаныя кветкамі буйнога цюльпана, братак, вінаградныя гронкі з лісцямі, галінкі рабіны, вішні, а таксама беларускі пейзаж з бярозкай або групай бярозак на пярэднім плане (рыс. 104, 105).

Асаблівай зграбнасцю вылучаюцца сярод распіснога посуду графіны кроплепадобных і шарападобных форм з элегантнымі лініямі ручак і разнастайнымі паддонамі. Па характару і матывах роспісы графінаў блізкія да роспісаў жбанкоў. Адрозненні назіраюцца ў маштабе роспісаў: у графінах яны больш дробныя.



*Рыс. 103. Ваза. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 104. Абажуры для лямп. Гута «Нёман». 1890—1939 гг. Рысункі з каталога*



*Рыс. 105. Рэзервуары настольных лямп. Гута «Нёман». 1890—1939 гг. Рысункі з каталога*

Па матывах роспісы на графінах падзяляюцца на кветкавыя і пейзажныя. Сярод кветкавых роспісаў сустрэты макі, рамонкі, дробныя суквецці зонцікавых раслін, галінкі з чарэшнямі, галінкі з яблыкамі і інш. Сярод пейзажных кампазіцый часцей сустракаюцца возера, над якім ляціць качка, грыбы пад бярозай, пірамідальныя таполі, драўляная хата і сцежка, што бачыцца ўдалечыні, вятрак на фоне неба, птушкі на галінках. І амаль усе пейзажы былі з нязменнай бярозкай на пярэднім плане. Сам шклозавод размясціўся ў бярозавым гаі, адкуль узяў назву і рабочы пасёлак — Бярозаўка.

Яшчэ больш разнастайныя матывы роспісаў былі на шкляных абажурах для газавых лямп і на саміх рэзервуарах лямп, якія мелі формы цыліндрычныя, усечанага конуса і трапецападобныя. Усе лямпы ўзвышаліся на розных па формах і канструкцыі масіўных паддонах. Сценкі лямпавых рэзервуараў былі цалкам пакрыты роспісам, які стужкай

былі і іншыя — хата на фоне яловага лесу; сасна на пярэднім плане і поле ўдалечыні.

Увогуле дэкор на вырабах меў прыкладны характар. Сама рэч служыла нібы «палатном» для майстроў па роспісу шкла. У роспісах адлюстраваліся сімпатыі мастакоў да асобных відаў мясцовых кветак, раслін і дрэў, любоў да роднай прыроды, яе краявідаў, да свайго краю. Характар роспісаў рэалістычны. У большасці выпадкаў ручныя свабодныя роспісы сведчаць аб неапаясваў яго, калі роспіс быў пейзажны. Фасадныя кампазіцыі прымяняліся пры кветкавых матывах дэкору, маштаб якога быў суадносна ўзбуйнены. Пісалі ірысы, хрызантэмы, макі, васількі, званочкі, галінкі бэзу, галінкі з клубніцамі.

Пейзажныя кампазіцыі на абажурах і рэзервуарах лямп часткова былі такія ж, як і на посудзе, але



*Рыс. 106. Ваза. Гута «Нёман». 1900—1940 гг. Музей старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АН БССР. Публікуецца ўпершыню*



*Рыс. 107. Крэманка. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

звычайным майстэрстве жывапісцаў, прафесійнай кампаноўцы рысункаў на складаных крываліней-ных аб'ёмах лямп і іх абажураў. Трактоўка кампазіцый і манера пісьма нагадваюць народны лубок, што сведчыць аб уплыве народнага мастацтва ў дэкорах шкляных вырабаў нават буйных гут.

Уражвае разнастайнасць форм і дэкораў ваз для кветак, якія вырабляліся рознымі спосабамі — прасаваннем (сл. 6), ціхім выдзіманнем у нерухомую форму (рыс. 67), гутным фармаваннем (сл. 1, 4, 10), выдзіманнем у рухомыя формы (рыс. 109).

Найбольшую цікавасць выклікаюць ціхавыдзіманыя вазы з дашліфоўкай шырокіх граней. Яны маюць адточаныя абрысы шарападобных, канічных і біканічных форм, якія арганічна звязаны з лінейнымі рытмамі дэкору, што выяўляюць і падкрэсліваюць формы (рыс. 77, 78, *в*). Асацыяцыі з урэцка-налібоцкімі бакаламі, аздобленымі ў дне трыма рэльефнымі кольцамі, выклікаюць ціхавыдзіманыя вазы, на якіх часцей за ўсё сустракаюцца розныя па памерах кальцавыя дэкоры. Яны размяшчаліся ў асноўным у ніжняй частцы складаных па канструкцыйных аб'ёмах ваз.

Вытанчанасцю форм і прапорцый вылучаюцца свабодна выдзіманыя вазы на плоскіх паддонах, якія маюць вальцаваныя паверхні сценак, і цэльнацягнутыя вузкія і высокія вазы з чатырохграннымі і васьмі-граннымі донцамі (сл. 1). Гэтыя гутныя вазы сведчаць аб незвычайным майстэрстве нёманскіх гутнікаў.

Дызайнерскае рашэнне форм і дэкораў наглядаецца ў аптэчным посудзе і некалькіх відах сталовага посуду (рыс. 75), а таксама ў туалетных прыборах (рыс. 78, 93, сл. 3). Іх формы ясныя, устойлівыя, кампактныя, практычныя. Яны і сёння ўспрымаюцца як сучасныя вырабы.

Сярод посуду, прызначанага для піцця, які выраблялі ў вялікай колькасці і разнастайным асартыменце, побач з формамі кілішкаў у стылі класіцызму, мадэрна (рыс. 108, *а*), функцыяналізму (рыс. 102) і канструктывізму (рыс. 78) нёманскія гуты выраблялі «шампанкі» (рыс. 108, *б*) у традыцыйных для Беларусі формах канічных шкляніц на ўстойлівых паддонах, а таксама «шампанкі», якія мелі традыцыйныя формы флетаў.



*Рыс. 108. Бакалы: а — для віна; б — для шампанскага. Гута «Нёман». 1900—1939 гг. Рысункі з каталога*



*Рыс. 109. Бакал і кілішкі. Гута «Нёман». 1930—1939 гг. Прыватная калекцыя. Публікуецца ўпершыню*

Сярод гладкасценнага бездэкорнага посуду для піцця ў 30-я гады былі створаны такія формы (рыс. 102, 107, 108), якія па-сапраўднаму ацэнены толькі праз трыццаць год, у 60-я гады.

Каляровая палітра нёманскага шкла была пастэльных таноў. Тут варылі празрыстае шкло ружоваааранжавага колеру пад мясцовымі назвамі («разалін», сл. 6), жаўтавата-бурштынавага («тапаз», сл. 5), бэзава-блакітнага («аметыст»), інтэнсіўна-сіняга («шафір», сл. 2), інтэнсіўна-зялёнага («смарагд», сл. 6), чырвонага («рубін», сл. 3). Каляровая гама глушонага шкла таксама ўражвае разнастайнасцю: блакітнае, ружовае, колеру слановай косці, чорнае, чырвонае, аранжавае (сл. 11). Асабліва прываблівыя таўстасценныя, дэкарыраваныя шырокімі гранямі вырабы з тапазнага і смарагдавага шкла (сл. 5, 6, 9).

У нёманскім шкле 20—30-х гадоў адлюстроўваліся новыя плыні мастацкага шкларобства Заходняй Еўропы гэтага часу (канструкты-

візм, кубізм, функцыяналізм) і адначасова захоўваліся традыцыі шклароробства канца XIX — пачатку XX ст., калі арганічнымі былі ўплывы ампіру і мадэрна. Увогуле для мастацкага шкла Беларусі канца XIX — пачатку XX ст. характэрна рознастылёвасць. Гэта вырабы і ў стылі ампір (рыс. 79, 86), і ў стылі мадэрн (сл. 1, 6), і канструктывісцкага напрамку (рыс. 77, 78), і функцыяналізму (рыс. 102, 108), і нават заўважаецца чыста дызайнерскае рашэнне ў мастацкай стылістыцы школы Баўхаўза (рыс. 75).

У беларускім шкле канца XIX — пачатку XX ст. адлюстраваліся ўсе стылістычныя і мастацкія напрамкі гэтага бурнага і супярэчлівага часу, калі мастацтвам шкла пачалі займацца прафесійныя архітэктары, мастакі і скульптары, а з 20-х гадоў XX ст.— прафесійныя мастакі па шклу.

Вывучэнне і засваенне гэтай багатай спадчыны ўзбагачае сучаснае мастацкае шкло.

# ДАДАТАК 
# Б

## ПЕРАЛІК І КАРОТКІЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ЗВЕСТКІ АБ МАНУФАКТУРАХ, ГУТАХ, ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЛІ Ў РОЗНЫЯ ГАДЫ XIX І Ў ПАЧАТКУ XX СТ. НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ. СКЛАДЗЕНЫ НА ПАДСТАВЕ АРХІЎНЫХ КРЫНІЦ І ДРУКАВАНЫХ ПРАЦ ГІСТОРЫКА-ЭКАНАМІЧНАГА ХАРАКТАРУ (УКЛЮЧАНЫ Ў АСНОЎНЫМ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, НА ЯКІХ ПРАЦАВАЛА НЕ МЕНШ 16 РАБОЧЫХ).

### *Брэсцкая вобласць*

**1. В. Багуслаўка** Маларыцкага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1857 г. У 1885 г. належаў Фердзінанду Багуслававічу Радзівілу, арандаваў шляхціц Вікенцій Фаміч Вількашэўскі. Дзейнічала 2 печы, працавала 49 рабочых, выраблена посуду, лямпавага і аконнага шкла на 82 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель фабрик и заводов Европейской России.— 3-е изд.— СПб., 1894, с. 349. У 1896 г. належаў В. Ф. Вількашэўскаму, працаваў 31 рабочы, выраблена посуду і лямпавага шкла на 56 тыс. руб.— Перечень фабрик и заводов.— СПб., 1897, с. 420.

**2. Бельскі павет** (вёска не названа). Шклозавод, упамінаецца ў 1847 г., выраблена шкла на 1573 руб.— Белоруссия в эпоху феодализма.— Мн., 1961, т. 3, с. 371.

**3. В. Бродніца** Лунінецкага р-на. Гута, узнікла ў самым пачатку XIX ст. Належала памешчыку Пружанскаму, існавала да 1809 г.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861 гг.).— Мн., 1966, с. 164.

**4. Г. Ганцавічы.** Шклозавод, у 1899 г. належаў В. Краеўскаму і Ю. Столе, з 1921 г. перайшоў у асабістую ўласнасць Ю. Столе і называўся «Завод аконнага і люстранога шкла Акцыянернага таварыства Ю. Столе». Закрыты ў 1924—1926 гг. у час крызісу, ахапіўшага Заходнюю Беларусь.— Наркевич С. И. Промышленность Западной Белоруссии в период белопольской оккупации (1920—1939 гг.).— Мн., 1965, с. 12.

**5. В. Дамброўка** Брэсцкага р-на. Гута, час узнікнення не высветлены. У 1812 г. належала Краеўскаму.— Ведомость о мануфактурах России за 1812 г. (хрустально-стекольные заводы).— СПб., 1814, с. 157.

**6. В. Ельня** Ганцавіцкага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1889 г. У 1897 г. уведзена паравая машына, у 1900 г. працавала 42 рабочыя.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии. 1860—1900.— Мн., 1978, с. 238.

**7. В. Заполле** Пружанскага р-на. Шклозавод, час узнікнення не вызначан, упамінаецца ў 1900 г., выраблена шкла на 90,7 тыс. руб., працавала 157 рабочых.— Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.).— Мн., 1953, т. 3, с. 32. Упамінаецца ў 1910—1914 гг.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло.—Мн., 1969, с. 56.

**8. В. Малая Плотніца** Пінскага р-на. Прыгонная мануфактура, заснавана ў 1842 г. У 1898 г. на ёй працавала 80 рабочых.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 256.

**9. В. Міхалін** Пружанскага р-на (раней маёнтак). Мануфактура, заснавана ў 1824 г. Упамінаецца ў 1845 г.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240; яго ж. Промышленность Белоруссии, с. 264. У 1848 г. належала Міхаілу Аляксандравічу Аляксандраву. Дзейнічала 3 печы, працавалі 33 рабочыя, выраблена посуду і аконнага шкла на 7 тыс. руб.—Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 349. У 1879 г. належала Вандаліну Войцэхавічу Пуслоўскаму, называлася заводам, працавала 8 рабочых, выраблена дробнага посуду і ліставога шкла на 5,7 тыс. руб.— Указатель фабрик и заводов Европейской России с царством Польским и Великим княжеством Финляндским.— СПб., 1881, с. 333. У 1896 г. належаў Чарніхову, працавала 120 рабочых.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 55. У 1910 г. належаў

Чарніхову, Ратнеру, Граеўскаму, працавала 202 рабочыя, выраблена аптэчнага, хімічнага посуду і іншых вырабаў на 100 тыс. руб.— Документы и материалы..., т. 3, с. 61.

**10. В. Нароўшчына** Камянецкага р-на (раней маёнтак Нараўка). Шкло-крышталёвы завод, узнік у 80-я гады XIX ст. У 1910 г. належаў таварыству «Нараўка», працавала 135 рабочых, выраблена крышталёвага, аптэчнага, хімічнага посуду і лямпавага шкла на 30 тыс. руб.— Документы и материалы..., т. 3, с. 60. Закрыты ў 1929—1933 гг.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 55, 57.

**11. В. Паняцічы** Пінскага р-на. Мануфактура, час заснавання не высветлены. У 1809 г. працавала 25 майстроў. Упамінаецца ў 1857 г. Закрыта ў 1860 г.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 164, 240.

**12. В. Паўлаполь** (раней Кобрынскага п.), цяпер не існуе. Шклозавод, заснаваны ў 1876 г. У 1887 г. працавала 44 рабочыя, выраблена шкла на 9 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 275.

**13. Г. Пінск.** Гута, час узнікнення не высветлены. Упамінаюцца шкларобы-рамеснікі ў 1561, 1783 і 1800 гг.— Игнатенко А. П. Ремесленное производство в городах Белоруссии в XVII—XVIII вв.— Мн., 1963, с. 10, 16. У 1910—1919 гг. дзейнічаў шклозавод «Піна», належаў Л. Туроку і Ш. Левіну, выраблялісе слоікі 9 відаў і бутэлькі 5 форм.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 260. У 1920 г. завод набыла варшаўская фірма «Вітрум». У 1924—1926 гг. належаў сіндыкату ліставога шкла «Верполь». Закрыты ў 1929—1933 гг.— Наркевич С. И. Промышленность Западной Белоруссии..., с. 5, 13.

**14. В. Плотніца** Столінскага р-на. Мануфактура, час заснавання не высветлены. У 1845 г. выраблена шкла на 4150 руб. Упамінаецца ў 1851 г.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240. У 1879 г. належала памешчыку Завадскаму, працавала 14 рабочых, выраблена 180 коп посуду, 30 скрынь ліставога шкла і 10 тыс. бутэлек.— Указатель фабрик и заводов..., с. 333.

**15. Пінскі павет** (вёска не названа). Шклозавод памешчыка Завадскага і кампаніі. Упамінаецца ў 1849 г., выраблена шкла на 2 тыс. руб.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 376.

**16. В. Старая Мыш** Баранавіцкага р-на (раней маёнтак Мыш). Гута, упамінаецца з 1650 г.— Aleksandrowicz S. Kierunki produkcij rzemieślniczej i przemysłowej w miasteczkach Białorusi i Litwy (XVI do połowy XVII w.).— Historia (Zeszyty naukowe Uniwersitetu im. A. Mickiewicza w Poznaniu), 1964, N 6, с. 50. З 1763 па 1809 г. вядома як мануфактура графа Міхала Масальскага, упамінаецца ў 1780 г. Згарэла ў 1808 г.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 72; Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 159.

**17. Г. п. Целяханы** Івацэвіцкага р-на. Шклозавод, заснаваны М. К. Агінскім. Упамінаецца ў 1814 г.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 90.

**18. Г. п. Целяханы** Івацэвіцкага р-на. Шклозавод на вул. Касцельнай, заснаваны на зямлі памешчыка Ф. У. Пуслоўскага ў 1895 г. У 1896 г. устанавілі паравы рухавік у шліфавальным аддзяленні (на 6 станкоў), працавала 146 рабочых, выраблялі посуд і лямпы з крышталёвага і каляровага шкла. У 1899 г. устанавілі ванныя шклоплавільныя печы, у 1911 г. падключылі электраасвятленне. У 1900 г. працавала 300 рабочых. У 1910 г. належаў В. Ф. Пуслоўскаму, працаваў 471 рабочы, выраблена посуду на 156 тыс. руб. Арандавала завод з 1896 г. таварыства «Галоўнае праўленне шкляных і крышталёвых заводаў братоў Чарніховых». Быў узнагароджаны Камітэтам Усерасійскіх сялянска-гаспадарчых выставак Залатым медалём «За трудолюбие и искусство».— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 53, 54, 56, 64; ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 261, л. 1, 2, 8, 31—62; ф. 229, воп. 5, спр. 1113. л. 3, 5, 8, 9, 32, 34 об; спр. 2049, л. 7; Документы и материалы..., т. 3, с. 61.

**19. В. Чарняны** Маларыцкага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1887 г. У 1888 г. належаў шляхціцу Мікалаю Мікалаевічу Коншыну. Дзейнічала 2 печы, працавала 56 рабочых, выраблялі аконнае шкло і піўныя бутэлькі.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 349. У 1892 г.— шкло-крышталёвы завод, належаў акцыянернаму таварыству шклаварных і крышталёвых заводаў «Чарняны», працавала 250 рабочых. Паравая машына ўведзена з 1895 г., лакамабіль — з 1896 г. У 1896 г. належаў Голабаву Міхалу Сямёнавічу, працаваў 71 рабочы, выраблена посуду на 72 тыс. руб. У 1900 г. завод, як і раней, належаў акцыя-

нернаму таварыству шклаварных і крышталёвых заводаў; працавала 250 рабочых, выраблена крышталёвага посуду, асвятляльных прыбораў і літога шкла на 354 105 руб.— Перечень фабрик и заводов, с. 422; Документы и материалы..., т. 3, с. 33; Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 54; Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 305.

**20. Чэрвішчы** (раней маёнтак Орды ў Пінскім п.). Шклозавод памешчыка Орды, пабудаваны пасля 14.2.1898 г., працавала 35 рабочых.— ЦДГА БССР, ф. 299, воп. 1, спр. 869, л. 26.

Акрамя таго, вытворчасць шкла існавала ў мясцовасцях, вакол якіх узніклі пасяленні з назвай «Гута» і вытворнымі ад яе:

**21. В. Гута** ў Ляснянскім с/с Баранавіцкага р-на.

**22. В. Гута** ў Дамачаўскім п/с Брэсцкага р-на.

**23. Х. Гута** да 1976 г. у Любашаўскім с/с Ганцавіцкага р-на.

**24. В. Гута** ў Нацкім с/с Ганцавіцкага р-на.

**25. В. Гута** ў Восаўскім с/с Драгічынскага р-на.

**26. В. Гута** ў Востраўскім с/с Ляхавіцкага р-на.

**27. В. Гута** ў Лысаўскім с/с Пружанскага р-на.

**28. В. Гутава,** ц. Гутаўскага с/с Драгічынскага р-на.

**29. В. Гутка** ў Рэчкаўскім с/с Івацэвіцкага р-на.

**30. В. Гутовічы** ў Чэрнінскім с/с Брэсцкага р-на.

## *Віцебская вобласць*

**31. В. Брачкі** (да 1917 г. х. Віцебскай губ.). Гута, час заснавання не высветлены. У 1850 г. належала мяшчанам Гершу Зільберману і Горбаргу Махлі. Дзейнічала 1 печ, працавала 26 рабочых, выраблена аптэчнага посуду на 10 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 348.

**32. В. Бяседы** Лепельскага р-на (раней маёнтак Бяседзь). Гута, упамінаецца ў 1810 г., працавала 15 рабочых. У 1814 г. належала памешчыку Петразоліну, дзейнічала 4 печы, працавала 14 вольнанаёмных майстроў, 4 прыгонныя.—Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 90, 91; Журнал мануфактур и торговли, 1831, № 9, с. 80. У 1855 г. гуту арандаваў купец Меер Левін, дзейнічала 1 печ, працавала 36 рабочых, выраблена на 7 тыс. руб. бутэлек і слоікаў.—Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 347—357. Закрыта ў 60-я гады XIX ст.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 162.

**33. Г. п. Варапаева** Пастаўскага р-на. Шклозавод, узнік паміж 1908 і 1914 гг.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 56.

**34. Г. п. Ветрына** Полацкага р-на. Шклозавод, у 1896 г. належаў графіні Талстой. У 1900 г. працавала 73 рабочыя.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 54.

**35. Г. Віцебск.** Фабрыка акуляраў І. М. Зэліча. Час узнікнення не вызначаны. У 1900 г. працаваў 131 рабочы.— Документы и материалы..., т. 3, с. 32.

**36. В. Галбея** Пастаўскага р-на. Гута, час узнікнення не высветлены. У 1908 г. належала таварыству ў складзе Когана, Ліберсона і Годэса. У 1910 г.— шклозавод, уваходзіў у склад варшаўскага сіндыката ліставога шкла «Верполь». Закрыты ў 1929—1933.— Наркевич С. И. Промышленность Западной Белоруссии..., с. 10, 13. Пасля 1939 г. адноўлена вытворчасць шкляных вырабаў. Вырабляюць і сёння кансервавую тару.— Гольбин Я. А. Развитие стекольной промышленности Белорусской ССР за годы Советской власти.— Мн., 1958.

**37. В. Гута Асічная** (да 1917 г. вёска Віцебскай губ.). Гута, час заснавання не высветлены. У 1830 г. належала памешчыку Каэтану Васількоўскаму (арандаваў купец Арон Білінскі), дзейнічала 1 печ, працавала 12 рабочых, выраблена аптэчнага посуду і посуду для піцця на 4 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 348.

**38. В. Гута** Пастаўскага р-на. Гута, час заснавання не высветлены. У 1879 г. належала графу Станіславу Плятэр-Зіберту, працавала 17 рабочых, выраблена 200 тыс. бутэлек на 6,0 тыс. руб.— Указатель фабрик и заводов..., с. 333. Цяпер працуе шклозавод «Гута».

**39. В. Зялёнаўка** Шумілінскага р-на (да 1872 г. х. Зяленіца). Гута, час заснавання не высветлены. У 1872 г. належала графу Тышкевічу, працавала 15 рабочых, выраблена 125 тыс. бутэлек на 4 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 348.

**40. В. Ісакаўцы** Браслаўскага р-на (ра-

ней Ісакаўка). Гута, час заснавання не высветлены. У 1880 г. належала купцу I стацці Арону Вайсбергу, дзейнічала 1 печ, працаваў 51 рабочы, выраблена аптэчнага і лямпавага шкла на 10 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 347—357.

**41. X. Краснаселле** Міёрскага р-на. Шклозавод, упамінаецца ў 1897 г., выраблялася аконнае шкло.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, адз. 216, л. 14, 15.

**42. В. Лапатнікі** Сенненскага р-на (раней маёнтак Лапатка). Гута, час заснавання не высветлены. У 1862 г. належала купцу Міхалу Фёдаравічу Клатцо, працавала 38 рабочых, выраблена посуду на 40 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 347—357. У 1890 г. працавала 58 рабочых, выраблена шкла на 40 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 254.

**43. В. Любанічы** Талачынскага р-на (раней маёнтак Любовічы). Шклозавод, заснаваны ў 1897 г. У 1899 г. належаў Мендэлю і Пеўзнеру (упамінаецца ў сувязі з забастоўкай, якую праводзілі рабочыя завода 21 кастрычніка).— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 72. У 1899 г. працавала 28 рабочых.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 255.

**44. В. Нарцызава** Талачынскага р-на (раней Нарцызаўка). Гута, час заснавання не высветлены. У 1868 г. належала памешчыцы Адэльфіне Вайцахоўскай. Дзейнічала 1 печ, працавала 27 рабочых, выраблена аптэчнага посуду і посуду для піцця на 2 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 347—357.

**45. В. Новааляксандраўка** Віцебскага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1881 г. У 1898 г. працавала 32 рабочыя.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 269.

**46. П. Ноўка** Віцебскага р-на. Шклозавод «Ноўка», заснаваны ў 1861 г.—Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии (вторая половина XVIII — первая половина XIX в.).— Мн., 1966, с. 312. У 1863—1864 гг. належаў купцу Густаву Лемке, у 1863 г. дзейнічала 1 печ, працавала 50 рабочых.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 347—357. У 1879 г. дзейнічала 1 печ на 6 гаршкоў, працавала 6 рабочых, выраблена 228 тыс. бутэлек на 6,3 тыс. руб.— Указатель фабрик и заводов..., с. 333. У 1884 г. працавала 44 рабочыя, выраблена 2 млн. лямпавага шкла, 10 тыс. шкляных каўпакоў да лямп і 20 тыс. лямп.— Указатель фабрик и заводов Европейской России.— СПб., 1887, с. 308. У 1896 г. належаў Міхаілу Фёдаравічу Клатцо, працавала 100 рабочых, выраблена лямпавых рэчаў на 70 тыс. руб.— Перечень фабрик и заводов, с. 410. У 1900 г. належаў Л. І. Дэйбнеру, выраблена лямп і посуду на 75,8 тыс. руб., працавала 104 рабочыя. У 1910 г. належаў Галёркіну, працавала 285 рабочых, выраблена лямпавага шкла на 120 тыс. руб.— Документы и материалы..., т. 3, с. 32, 61. У 1914 г. працавала 300 рабочых. Дзейнічалі паравая шліфавальня, механічнае сціранне фрыты, ванныя шклоплавільныя печы. Выраблялі крышталёвы посуд, аздоблены алмазнай гранню. Уваходзіў у лік трох буйнейшых шклозаводаў Беларусі. Працаваў і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 56, 57, 85.

**47. В. Пасмуркі** (раней вёска Сенненскага п., цяпер не існуе). Шклозавод, час заснавання не высветлены. Упамінаецца ў 1833 г. У 1850 г. належаў памешчыку Вітольду Славінскаму, працавала 28 рабочых, выраблена 1000 скрынь ліставога шкла на 10 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 349. У 1855 г. належаў Вікенцію Славінскаму.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі ў часы распаду феадалізму.— Мн., 1935, т. 2, с. 86. У 1859 г. належаў Вітольду Вікенцьевічу Славінскаму, дзейнічала 2 печы, працавала 54 вольнанаёмныя майстры і 40 прыгонных, выраблена 1460 скрынь ліставога шкла. Ужывалі фабрычную сыравіну — соду і глаубераву соль.—Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 305—306. У 1861—1874 гг. завод працаваў на фабрычнай шчолачнай сыравіне, вырабляў ліставое шкло. У 1861 г. працавала 74 рабочыя.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 163, 240; яго ж. Промышленность Белоруссии, с. 276. Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 142; Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 46, 47.

**48. В. Равяцічы** Талачынскага р-на. Шклозавод, час узнікнення невядомы. У 1910 г. належаў Н. І. Курчу, працавала 274 рабочыя, выраблена ліставога шкла і бутэлек на 226 856 руб.— Документы и материалы..., т. 3, с. 61.

**49. В. Сабалёўка** Шумілінскага р-на (спалена ням. фашыстамі, не адноўлена).

Гута, у 1850 г. належала памешчыцы Феліцыі Мікалаеўне Богуш (арандаваў купец Фрэнкель). Дзейнічала 1 печ, працавала 20 рабочых, выраблена аптэчнага посуду і посуду для піцця на 6 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 348.

**50. В. Сасновая Балярня** (да 1917 г. вёска Віцебскай губ.). Гута, час заснавання не высветлены. У 1879 г. належала памешчыкам Сакалоўскаму і Ваўцахоўскаму, дзейнічала 1 печ, працавала 20 рабочых, выраблена 10 тыс. бутэлек і 650 скрынь ліставога шкла на 7 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 348.

**51. В. Серкавіцы** Талачынскага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1897 г. У 1898 г. працавала 100 рабочых. Належаў А. М. Мерлісу. У 1909 г. ім валодалі бельгійскі інжынер Л. К. дэ Бэра і Н. І. Курчы. Упамінаецца ў 1916 г. Дзейнічаў і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 54, 59, 75, 77; Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 290.

**52. Г. п. Сураж** Віцебскага р-на (раней з. г. Віцебскага п.). Шклозавод, заснаваны ў 1861 г. У 1896 г. працавала 69 рабочых, выраблена шкла на 60 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 299.

**53. Г. п. Талачыно.** Шклозавод, час заснавання не высветлены. Упамінаецца ў 1854—1863, 1897 гг., належаў Славінскаму, працаваў на фабрычнай шчолачнай сыравіне.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 82.

**54. В. Труды** Полацкага р-на. Шклозавод, узнік пасля 1908 г. У 1910—1914 гг. называўся шклозавод «Труды», належаў М. І. Мерлісу, працавала 390 рабочых. Дзейнічаў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 56, 57.

55. **В. Увалокі** Шумілінскага р-на (раней маёнтак Ігуменскага п.). Шклозавод пры лесапільным заводзе, упамінаецца ў 1915 г., выробляў аконнае шкло, загадваў заводам С. Г. Фрыдлендар.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 216, л. 59.

**56. В. Уладзіміраўка** Полацкага р-на. Гута, час узнікнення не высветлены. У 1861—1863 гг. належала Ул. Даненштэрну.— У 1864 г. працавала 28 рабочых, выраблена шкла на 13 тыс. руб.—Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 224.

**57. Усвяты** (раней маёнтак Суражскага п., цяпер не існуе). Шклозавод князя Р. А. Пацёмкіна, узнік у 1780 г., у 1859 г. працавала 15 вольнанаёмных рабочых, завод працаваў на фабрычнай шчолачнай сыравіне. З 1860 г. належаў памешчыку Аляксандру Міхайлавічу Пацёмкіну. У 1861—1863 гг. працавала 8 прускіх майстроў і 7 мясцовых, выраблялі аконнае шкло і бутэлькі.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 196; Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 46. У 1879 г. належаў іншаземцу Дзісону Армдсцеаду, дзейнічала 1 печ на 6 гаршкоў, працавала 15 рабочых, выраблена 300 тыс. бутэлек, 250 скрынь ліставога шкла на 11,3 тыс. руб.— Указатель фабрик и заводов..., с. 333.

**58. В. Цілеўцы** Браслаўскага р-на (да 1850 г. в. Цілеўская Гута). Гута, час заснавання не высветлены. У 1850 г. належала памешчыку Мікалаю Цярэцкаму (арандаваў купец Борух Вакеман). Дзейнічала 1 печ, працавала 16 рабочых, выраблена аптэчнага посуду і посуду для піцця на 2 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 348.

**59. В. Гута** ў Варапаеўскім п/с Пастаўскага р-на.

**60. В. Гута** да 1971 г. у Азінскім с/с Полацкага р-на.

**61. В. Гута** ў Слаўнаўскім с/с Талачынскага р-на.

62. **В. Гута** ў Жарскім с/с Ушацкага р-на.

**63. В. Гуцішча** ў Мосарскім с/с Ушацкага р-на, спалена ням. фашыстамі, не аднаўлена.

## *Гомельская вобласць*

**64. В. Асіпоўка** (раней урочышча Рагачоўскага п., цяпер не існуе). Шклозавод, час заснавання невядомы, у 1879 г. працавала 80 рабочых, выраблена 3 тыс. скрынь ліставога шкла на 55 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 272.

**65. В. Барсукіно** Чачэрскага р-на. Дробная прыгонная мануфактура. Час заснавання і закрыцця не высветлены. Упамінаецца ў 1859 і 1861 гг., належала памешчыцы Цеафіле Францаўне Хайніцкай. У 1859 г. дзейнічала 1 печ, працавала 15 рабочых, у тым ліку 2 вольнанаёмныя майстры, выраблена 40 тыс. шт. посуду.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 305—306; Матэ-

рыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 82, 144.

**66. Р. п. Беліцк** Рагачоўскага р-на (раней в. Беліца Быхаўскага п.). Мануфактура, упамінаецца з 1734 г. У 1805 г.— крышталёвы завод графа М. П. Румянцава.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. XIII; Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 42. У 1812 г. працавала 32 іншаземцы, 14 вольнанаёмных майстроў і 53 прыгонныя, выраблена 85 041 шт. посуду.—Ведомость о мануфактурах России за 1812 г.— СПб., 1814, с. 157—169.

**67. В. Валосавічы** Рагачоўскага р-на. Гута, упамінаецца ў 1814 г., належала графіні Ганне Радзівонаўне Чарнышовай.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 90.

**68. Г. Гомель.** Прыгонная мануфактура, заснавана да 1809 г. У 1812 г. працавала 67 прыгонных.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии..., с. 240. У 1814 г. называлася «Крышталёвая фабрыка дзяржаўнага канцлера графа М. П. Румянцава», дзейнічала 16 печаў, працавала 25 прыгонных, 8 вольнанаёмных майстроў. Акрамя крышталёвых рэчаў, выраблялі бутэлькі, кварты, паўкварты, бутлі, слоікі, ліставое шкло.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 88, 89, 141. У 1825 г. увесь посуд быў адпраўлены суднамі на продаж у Крамянчуг.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 299.

**69. В. Грамыкі** Лоеўскага р-на. Прыгонная мануфактура купца Скарнякова. Упамінаецца ў 1810, 1818 гг., працавала 17 рабочых.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240. Да 1819 г. увесь лес вакол вёскі быў спалены і мануфактуру перамясцілі ў в. Свяцілавічы.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 303; у 1819 г. яшчэ выраблялі кварты, бутэлькі, аптэчны посуд.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 130, 139, 141.

**70. В. Гута,** падпарадкаваная Нараўлянскаму г/с Нараўлянскага р-на (раней в. Нараўлянская Гута ў Рэчыцкім п.). Шклозавод сапраўднага стацкага саветніка Я. Е. Сіваса, упамінаецца ў 1800 г.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 110.

**71. В. Дзяніскавічы** Калінкавіцкага р-на. Гута, час узнікнення не высветлены. У 1806 г. належала памешчыку Пружаноўскаму, дзейнічала 2 печы, працавала 15 прыгонных, выраблена 1615 шт. посуду і 2 скрыні аконнага шкла.—Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 293.

**72. П. Краснагор'е** да 1972 г. у Веткаўскім р-не. Гута, заснавана да 1812 г. Вырабляла посуд.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии..., с. 161.

**73. В. Нікалаева** (раней Чачэрскага п., цяпер не існуе). Прыгонная мануфактура, упамінаецца ў 1796 г.; у 1854 г. упамінаецца пад назвай «Нікалаеўская шкляная фабрыка Шарлоты Осіпаўны Круглікавай, жонкі генерал-ад'ютанта».— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии..., с. 240. У 1856, 1859, 1860, 1870 гг. упамінаецца як «Мікалаеўская шкляная фабрыка памешчыцы Ш. О. Мартынавай». У 1856 г. працавала 16 вольнанаёмных майстроў, 16 прыгонных і 20 вучняў з прыгонных, выраблялі аконнае шкло.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 75, 87, 96, 143.

**74. Мазырскі павет** (вёска не названа). Шклофабрыка, заснавана ў 1809 г.— Белоруссия в эпоху феодализма, с. 153.

**75. В. Наспа** Буда-Кашалёўскага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1897 г. Курындзіным. У 1900 г. працавала 45 рабочых, выраблена ліставога шкла на 19 тыс. руб. У 1910 г. працавала 122 рабочыя, выраблена ліставога шкла на 99 242 руб.— Документы и материалы, с. 61. У 1924 г. вырабілі 2270 скрынь ліставога шкла. Закрыты ў 1924 г.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 75, 114; Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 268.

**76. П. Пясочная Буда** да 1924 г. у Чачэрскім р-не. Гута, упамінаецца ў 1760 г. У 1780 г.— шкляная мануфактура П. А. Румянцава-Задунайскага, з 1796 г. належала яго сыну М. П. Румянцаву. У 1797 г. працавала 50 рабочых, выраблялі ліставое шкло і бутэлькі, упамінаецца яшчэ і ў 1812 г.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии..., с. 161, 240; Закалинская Е. П. Вотчинные хозяйства Могилевской губернии во второй половине XVIII в.— Могилев, 1958, с. 56, 76.

**77. Г. Рагачоў.** Прыгонная мануфактура, упамінаецца ў 1778 г. У XIX ст. упамінаецца «гута рагачоўская» ці «гута Марыі Віле», вырабляла шкло люстэркавае і шкло гравіраванае.— Довнар-Запольский М., Ярошевич А. Весь юго-западный край.— Киев, 1913, с. 28.

**78. В. Свяцілавічы** Веткаўскага р-на. Мануфактура купца Скарнякова, упамінаецца ў 1818—1830 гг. У 1830 г. працавала 19 рабочых.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240; Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 303. У 1840 г. упамінаецца як «гута Скарнякова».— ЦДГА БССР, ф. 295, воп. 1, спр. 476, с. 41.

**79. В. Старая Ёлча** Брагінскага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1865 г., у 1884 г. працавала 10 рабочых, у 1895 г. пачала дзейнічаць паравая машына.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 243.

**80. В. Студзёная Гута** (Студзянец) Қармянскага р-на. Гута, упамінаецца ў 1736 г.— Мелешко В. И. Очерки аграрной истории восточной Белоруссии (XVII—XVIII вв.).— Мн., 1975, с. 173. У апошняй чвэрці XVIII ст. рэканструявана ў шклозавод. Належала графу П. А. Румянцаву-Задунайскаму, які атрымаў ад Кацярыны II беларускія землі пасля I падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. У канцы XVIII — пачатку XIX ст. на заводзе вырабляўся самы шырокі асартымент шкляных вырабаў — 50 відаў. Завод складаўся з 2 частак: «стары шкляны шацёр» і «новы шкляны шацёр» з 4 печамі для плаўкі шкла і 2 печамі для разагрэву доўгіх цыліндраў, з якіх рабілі ліставое шкло; 4 печамі для сушкі дроў і 2 для закальвання гатовых вырабаў. Усе печы знаходзіліся ў вялікім аднапавярховым драўляным будынку. Да яго прымыкала паташня. Калісьці ў гэтым будынку была шкляная рамесная майстэрня, у якой дваровыя (вотчынныя) рамеснікі (гутнікі, скляры) выраблялі шкляны посуд і аконнае шкло для патрэб уладальніка. М. П. Румянцаў — сын П. А. Румянцава-Задунайскага расшырыў гэту майстэрню і адначасова пабудаваў у 1803 г. новы двухпавярховы драўляны будынак з 8 печамі (4 плавільных, 2 для закальвання вырабаў, 1 для разагрэву, 1 для сушкі дроў) і «новы шкляны шацёр», устанавіў 12 шліфавальных станкоў і 17 гравіравальных для аздобы крышталёвых вырабаў. Адначасова выдзімалі шкло ў 20 выдзімальных трубак. Акрамя сталовага посуду і ліставога шкла, выраблялі шмат аптэчнага посуду. Частку вырабаў, асабліва аптэкарскі посуд, вывозілі на Украіну.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 294—296. У 1825 г. працавала 45 прыгонных, 1 вольны майстар, выраблена 14 703 шт. рознага крышталёвага посуду (кварт, пясочных гадзіннікаў, збаноў, лампад, чарнільніц, бутэлек, слоікаў, ліставога і бемскага шкла каля 16 тыс. скрынь.—Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 344, 345.

**81. В. Хізаў** Қармянскага р-на. Мануфактура, упамінаецца з 1760 да 1797 г.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 142; У 1814 г. на ёй выраблялася 917 тыс. шт. рознага посуду.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 90. У 1819 г. працавала 28 рабочых.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии..., с. 240. У 1830 г. вырабляўся посуд для дзяржаўных аптэк.— Закалинская Е. П. Вотчинные хозяйства Могилевской губернии..., с. 54.

**82. В. Хізы** Веткаўскага р-на. Мануфактура, у 1802 г. належала купцу Астаф'еву.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 42. У 1809 г. дзейнічала 4 печы, працавала 10 вольнанаёмных рабочых, выраблена 63 тыс. шт. рознага посуду.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 293. У 1818 г. выраблялі ліставое шкло і посуд.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 138, 141, 146.

**83. Г. Чачэрск.** Прыгонная мануфактура, заснавана каля 1780 г. У 1789 г. належала графу Захару Чарнышову, працавала 22 іншаземныя майстры.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 142, 240. У 1847 г. працавала 63 прыгонныя майстры, выраблена шкла на 40 362 руб.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 368. У 1859 г. належала графу Чарнышову-Круглікаву, працавала 7 прыгонных і 22 вольнанаёмныя майстры (іншаземцы), дзейнічала 2 печы, выраблена 1500 скрынь ліставога содавага (бемскага) шкла. Завод прыняў удзел ва Усерасійскай прамысловай выстаўцы 1859 г., дзе яго ліставое шкло было прызнана самым лепшым у Расіі.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 312; Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 45, 46; З 1860 г. называўся заводам, вырабляў содавае аконнае шкло і посуд.—Закалинская Е. П. Вотчинные хозяйства Могилевской губернии..., с. 54. У 1879 г. арандаваў купец Шульман, дзейнічала 2 печы, працавала 65 рабочых, выраблена ліставога шкла 2 тыс. скрынь на 36 тыс. руб.— Указатель фабрик и заводов..., с. 333. Па-

стаўляў шкло ў Пецярбург.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 47.

**84. В. Шарсцін** Веткаўскага р-на. Гута, узнікла ў 1760 г.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 142. У 1797 г. выраблена 4200 шт. посуду. Закрыта пасля 1812 г.— Закалинская Е. П. Вотчинные хозяйства Могилевской губернии, с. 161; Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 161, 240.

**85. П. Асінаўская Гута** ў Сідаравіцкім с/с Чачэрскага р-на.

**86. П. Гута** да 15 кастрычніка 1964 г. у Патапаўскім с/с Буда-Кашалёўскага р-на.

**87. В. Гута** ў Хізоўскім с/с Веткаўскага р-на.

**88. В. Гута** ў Журавіцкім с/с Рагачоўскага р-на.

**89. В. Гутка** ў Старазакружскім с/с Веткаўскага р-на.

**90. П. Гуцішча** да 1 снежня 1966 г. у Пірэвіцкім с/с Жлобінскага р-на.

**91. П. Гуцішча** ў Балатнянскім с/с Рагачоўскага р-на.

**92. В. Новая Гута** ў Шырокаўскім с/с Буда-Кашалёўскага р-на.

**93. В. Новая Гута** ў Цярухскім с/с Гомельскага р-на.

## *Гродзенская вобласць*

**94. В. Астроўна** Навагрудскага р-на. Гута, год заснавання не высветлены. У 1896 г. Гродзенскі надворны саветнік А. Ф. Квіцінскі прасіў дазволу пабудаваць гуту ва ўрочышчы «Устроўня» (пазнейшая назва Астроўна).—ЦДГА ЛітССР, ф. 382, воп. 4, спр. 1183, л. 4; З гісторыі шклозавода «Нёман».— Матэрыялы заводскага музея. У 1898 г. устаноўлена паравая машына, працавала 185 рабочых. У 1900 г. належала Каплінскаму, працавала 185 рабочых. У 1914 г. згарэла.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 53, 75 Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 273.

**95. Ашмянскі павет** (вёска не названа). Шклозавод, упамінаецца ў 1860 г., працавала 39 рабочых, выраблена шкла на 837 руб.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 405.

**96. Маёнтак Бальцэрышкі** Лідскага п. (цяпер не існуе). Гута, год заснавання не высветлены. У 1861 г. належала графу Путкамеру.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 52.

**97. В. Бушкі** Карэліцкага р-на (раней маёнтак Бушкулішкі). Гута, год заснавання не высветлен. У 1814 г. працавала 8 вольнанаёмных майстроў, выраблялі кілішкі, шклянкі, лістовае шкло.— Матэрыялы па гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 90, 91.

**98. Г. п. Бярозаўка** Лідскага р-на. Шклозавод, заснаваны мясцовымі купцамі Каплінскім, Бронэрам і Трубовічам у 1894 г., хаця дакументы афармляліся ў 1896 г. на А. Ф. Квіцінскага — надворнага саветніка з Гродна. План быў зацверджаны ў 1903 г. Дзейнічала 3 печы, выраблялі піўныя бутэлькі. У 1899 г. завод набылі Ю. Століе і В. Краеўскі. Пасля 1908 г. належаў Ю. Століе. У 1915—1921 гг. не працаваў. Рэканструяваны пасля 1921 г. і да 1939 г. выпрабляў лямпавае шкло і лямпы, аптэкарскі і гатунковы посуд з каляровага шкла, бясколернага і каляровага крышталю. Экспартаваў 45% вырабаў у Турцыю, Англію, Аўстрыю, Канаду, Французскую Афрыку.— З гісторыі шклозавода «Нёман».— Матэрыялы заводскага музея. З верасня 1939 г. у складзе БССР. У час Вялікай Айчыннай вайны часткова разбураны, адноўлены ў 1944 г.

**99. В. Гродзі** Астравецкага р-на (раней маёнтак Гродзік). Гута, год заснавання не высветлены, у 1886 г. належала стацкаму саветніку Памеранскаму, дзейнічала 1 печ, працавала 22 рабочыя, выраблена бутэлек, слоікаў, лістовага шкла і посуду на 8 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 349.

**100. Г. Гродна.** Гута Брауна. Час заснавання не высветлены, упамінаецца ў XIX ст.— Grodno i okolice. Jeziora Augustowskie. Suwałszczyzna. Przewodnik turystyczny.— Grodno, 1934, с. 5. Шклозавод працуе і ў наш час, вырабляе шклошарыкі і бутэлькі.

**101. Лідскі павет** (вёска не названа). Шклозавод, заснаваны ў 1804 г. памешчыкам Каржанеўскім. У 1805 г. выраблена шкла на 50 руб.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 145.

**102. Люцынскі павет** (вёска не названа). Шклозавод, заснаваны ў 1807 г. памешчыкам Гаражанскім.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 147.

**103. Мантвідава,** маёнтак, размяшчаўся каля п. Рось Ваўкавыскага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1818 г. памешчыкам Іосіфам Гружэўскім. У 1828 г. працавала 50 рабочых, у тым ліку 20 вольнанаёмных і 30 прыгонных, выраблялі «карафіны» і шклянкі.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 196.

**104. Х. Новая Гута** Навагрудскага р-на. «Паравы шклозавод», заснаваны ў 1894 г. Ю. Столе і В. Краеўскім на арандаванай імі зямлі памешчыцы Ганны Смальян ва ўрочышчы Маладзіна (па другіх крыніцах Магадзіна) Ганчароўскай в., у 4 км ад сучаснага х. Устрынь-Боркі, дзе ўжо была гута З. А. Ленскага. 13.8.1896 г. уладальнікі далажылі Віленскаму ўпраўленню, што завод «устроен окончательно» і назвалі яго «Нёман-Б». Дзейнічала 1 печ на 12 гаршкоў, 130 шліфавальных станкоў, 30 пнеўматычных прэсаў, 2 паравыя машыны на 140 к. с., 5 гільяшырных станкоў, пантограф, пескаструменны апарат, паўаўтамат для шліфоўкі розных відаў граней, машына для заточкі донцаў, 8-шпіндэльныя станкі для шліфоўкі шклянак, цэх па рамонту прэс-форм. У 1897 г. устанавілі яшчэ 2 печы на 10 і 12 гаршкоў. Для свайго часу гута была добра абсталявана навейшымі машынамі і прыстасаваннямі, якія дазвалялі выраблць мастацкія шкляныя і крышталёвыя вырабы нават па мадэлях, чарцяжах і эскізах заказчыкаў.— З гісторыі шклозавода «Нёман».— Матэрыялы заводскага музея. У 1900 г. называлася «Крышталёвая фабрыка «Нёман-Б», належала В. Краеўскаму і Ю. Столе, працавала 480 рабочых, выраблена крышталёвага посуду на 306 127 руб.— Документы и материалы..., с. 32; Перечень фабрик и заводов. СПб., 1807, с. 410. Пасля 1908 г. належала Ю. Столе. Згарэла ў час першай сусветнай вайны, у 1914 г., і болей не аднаўлялася.— З гісторыі шклозавода «Нёман»; Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 75; ЦДГА ЛітССР, ф. 515, воп. 1, спр. 334; ф. 517, воп. 2, спр. 113; ф. 382, воп. 4, спр. 1183, л. 4.

**105. У. Няўрага** (цяпер не існуе, раней урочышча Машнеўскай вол. Слонімскага п.). Шклозавод, заснаваны ў 1880 г. У 1884 г. працавала 27 рабочых, выраблена ліставога шкла, бутэлек і шклянак на 7 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 268.

**106. В. Плянта** Навагрудскага р-на (раней маёнтак Плянта-Гродзік Ваўкавыскага п.). Шклозавод, заснаваны ў 1879 г. У 1896 г. працавала 42 рабочыя, выраблена шкла аконнага, бутэлек і посуду на 28 тыс. руб.— Перечень фабрик и заводов, с. 422.

**107. Г. п. Сапоцкін** Гродзенскага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1861 г. У 1890 г. працавала 16 рабочых, выраблена 1 тыс. скрынь ліставога шкла на 20 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 296.

**108. В. Саленікі** Слонімскага р-на (да 1867 г. маёнтак Салечнікі). Гута, заснавана ў 1867 г. У 1867—1879 гг. належала памешчыку Вітольду Альгердавічу Вагнеру (арандаваў прускі падданы Л. Л. Брауер). У 1879 г. працавала 34 рабочыя, выраблена 12 тыс. бутэлек, 400 скрынь ліставога шкла і дробнага посуду на 6500 руб.— Указатель фабрик и заводов..., с. 333. У 1896 г. працавала 37 рабочых, у тым ліку 22 жанчыны, выраблена бутэлек і посуду на 140 тыс. руб.— Перечень фабрик и заводов, с. 410.

**109. Слонімскі павет** (вёска не названа). У 1860 г. дзейнічаў шклозавод, выраблена шкла на 10 150 руб.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 412.

**110. В. Уладзіславова** Лідскага р-на (раней маёнтак). Шклозавод, заснаваны памешчыкам Адзінцом у 1821 г., у 1828 г. працавала 11 прыгонных, выраблена бутэлек і шклянак 18 тыс. шт.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 196.

**111. Х. Устрынь-Боркі** Навагрудскага р-на. Гута, заснавана ў 1875 г., па даных «Указателя фабрик и заводов...». У 1885—1886 гг. належала графу Зенону Антонавічу Ленскаму. Дзейнічала 1 печ, працавала 15 рабочых, выраблена 2 тыс. скрынь аконнага шкла на 6 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 347. У 1890 г. дзейнічала 10-гаршковая печ, 9 шліфавальных шайб, 12 станкоў для нанясення алмазнай грані на крышталь. Кіраваў гутай Іван Шыманскі. 1 мая 1891 г. З. А. Ленскі аддаў гуту ў арэнду майстру роспісу па шкле Ю. А. Столе (былому селяніну в. Ставы Камянецкага р-на, раней Холмскага п. Люблінскай губ.) і дваранiну В. А. Краеўскаму (паходзіў з Сядлецкай губ.), якія з 1885 г. валодаў шклозаводам у Барысаве. Стары рабочы шклозавода «Нёман» Б. Шыманскі, былы эканаміст завода Б. Б. Брас-

лаўскі паведамілі, што да набыцця шклозаводаў у Беларусі В. Краеўскі працаваў тэхнаруком польскага шклозавода «Чэхі», які належаў патомнаму чэшскаму шклаauthor В. Хрдлічку. В. Краеўскі і Ю. Столе рэканструявалі прадпрыемства, павялічылі ёмкасць печы да 12 гаршкоў, у 1893 г. устанавілі лакамабіль і павялічылі выраб крышталёвага сталовага і аптэчнага посуду. Пасля 1894 г. называлася «Старая Гута».— ЦДГА ЛітССР, ф. 382, воп. 4, спр. 1183, л. 4; Перечень фабрик и заводов, с. 410; З гісторыі шклозавода «Нёман» (матэрыялы заводскага музея). У 1900 г. называлася крышталёвая фабрыка «Нёман-А», працавала 208 рабочых, вырабілі крышталёвага посуду на 117 400 руб. У 1910 г. працавала 454 рабочыя.— Документы и материалы..., с. 32.

**112. В. Яцкуны** Астравецкага р-на (да 1866 г. маёнтак Яшуны). Гута, час узнікнення не высветлены. У 1866 г. належала памешчыку Канстанціну Багінскаму. Дзейнічала 6 печаў, працавала 28 рабочых, выраблена дробнага посуду, бутэлек, паўбутэлек і ліставога шкла на 13 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 347. У 1879 г. пры тым жа ўладальніку гуту арандавала купчыха С. Пупкіна. Працавала 20 рабочых, выраблена 17 тыс. бутэлек, 100 скрынь ліставога шкла і дробнага посуду на 7200 руб.— Указатель фабрик и заводов..., с. 333. У 1884 г. належала Канстанціну Балінскаму, працавала 16 рабочых, выраблена бутэлек і дробнага посуду на 8 тыс. руб.— Указатель фабрик и заводов..., 1887, с. 308.

**113. Х. Гута** ў Граўжышкаўскім с/с Ашмянскага р-на.

**114. В. Гута** ў Воранаўскім п/с Воранаўскага р-на.

**115. В. Гута** ў Паляцкішкаўскім с/с Воранаўскага р-на.

**116. В. Гута** ў Рудаяварскім с/с Дзятлаўскага р-на.

**117. В. Гута** ў Суботніцкім с/с Іўеўскага р-на.

**118. Х. Гута** ў Велікашылавіцкім с/с Слонімскага р-на.

**119. Х. Гуціска** ў Паўлаўскім с/с Слонімскага р-на.

**120. В. Гуцішкі** ў Геранёнскім с/с Іўеўскага р-на.

## *Магілёўская вобласць*

**121. П. Асінаўка** Касцюковіцкага р-на (раней урочышча Клімавіцкага п.). Шклозавод, час заснавання не высветлены. У 1882 г. належаў памешчыку Льву Іванавічу Сабінскаму, працавала 40 рабочых, выраблена 240 тыс. шт. ліставога і аконнага шкла на 30 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 349. У 1900 г. належаў Магідсону, працавала 60 рабочых.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 55. У 1895 г. працавала 142 рабочыя, выраблена шкла на 87 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 272.

**122. Бабруйскі павет** (вёска не названа). Шклозавод, належаў памешчыкам фон Гогерам, упамінаецца ў 1849 г., выраблена шкла на 8 тыс. руб.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 376.

**123. Бабруйскі павет** (паміж вёскамі Хімы Бабруйскага р-на і Шыраеўшчына). Шклозавод, належаў памешчыку Івану Кільчэўскаму, упамінаецца ў 1800 г.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 110.

**124. В. Батаева** Хоцімскага р-на. Шклозавод, у 1795 г. належаў В. М. Галынскаму, выраблялі 40% шклянак, 25% крышталёвых кілішкаў, 25—27% бутэлек.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 291, 293. У 1798 г. выраблялі аконнае шкло. У 1800 г. на ім працавала 11 рабочых.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240. У 1802 г. зноў пачалі вырабляць посуд (кварты, бутэлькі, кілішкі, шклянкі з простага і паўкрышталёвага шкла).— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 55, 56. Упамінаецца ў 1860 г.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 149.

**125. Г. Быхаў.** Шклозавод, заснаваны ў маёнтку Гута князем Ф. Сапегам у канцы 50-х гадоў XVIII ст., існаваў 5 год. У 1818 г. на зямлі князя М. Сапегі было зноў заснавана шкляное прадпрыемства, называлася «Быхаўская гута», у 1830 г. працавала 17 прыгонных, выраблялі посуд і бутэлькі.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 76; Матэрыялы да гісторыі

мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 146, 157, 184; т. 2, с. 240.

**126. В. Ветранка** Быхаўскага р-на (раней фальварк). Шклозавод, заснаваны ў 1896 г., працавала 77 рабочых. У 1900 г. вырабілі шкла на 41 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 220.

127. **В. Віктарына** (раней Бабруйскага п., цяпер невядома). Шклозавод памешчыка Міхаіла Прушаноўскага, упамінаецца ў 1800 г.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 110.

**128. П. Глуша** Бабруйскага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1869 г., належаў Грыцэнку. У 1900 г. працавала 32 рабочыя, у гэтым жа годзе ўстанавілі паравую машыну, выраблена шкла на 13 тыс. руб. З 1924 г. называецца «Камінтэрн», выробляе бутэлькі.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 55, 77; Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 227.

**129. В. Гута** Быхаўскага р-на. Дробная прыгонная мануфактура. Час заснавання не высветлены. У 1794 г. належала памешчыцы Наталлі Аляксееўне Ялагінай.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. XII. Упамінаецца ў 1813 і 1826 гг. У 1846 г. працавала 10 рабочых.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240. У 1879 г. належала памешчыку Казіміру Іванавічу Банькоўскаму, дзейнічала 3 печы, працавала 13 рабочых, выраблена 250 тыс. бутэлек на 3500 руб.— Указатель фабрик и заводов..., 1881, с. 333.

**130. В. Гута** Бялыніцкага р-на (раней мясцовасць Гута Магілёўскага п.). Дробная прыгонная мануфактура, час заснавання не высветлены. У 1859 г. працавала 14 рабочых.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240. У 1861 г. належала Віктару Калантаю.— ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 476, с. 145.

**131. В. Гута** Слаўгарадскага р-на (раней фальварак Гута Чэрыкаўскага п.). Прыгонная мануфактура, заснавана ў 1846 г. У 1861 г. належала Віктару Калантаю, працавала 39 рабочых, выраблена 750 скрынь аконнага шкла на 7500 руб — Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 149.

**132. В. Дамамерычы** Клімавіцкага р-на. Мануфактура Сабанскага, упамінаецца ў 1881 г. У 1890 г. вырабляла аконнае шкло.— Болбас М. Ф. З гісторыі фабрык і заводаў.— Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1978, № 3. У 1895 г. працавала 142 рабочыя, выраблена шкла на 87 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 236. У 1896 г. яе арандаваў Я. М. Магідсон. — Перечень фабрик и заводов, с. 440.

**133. В. Загоранка** Чавускага р-на. Прыгонная мануфактура, час заснавання не высветлены. У 1847 г. выраблена шкла на 3840 руб. У 1850 г. выраблена аконнага шкла на 5500 руб. Упамінаецца ў 1854.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 367; Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 23, 82.

**134. В. Зябень** Чэрыкаўскага р-на (былы фальварак Зябна). Гута, заснавана ў 1828 г. Вырабляла ліставое шкло.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 162; его ж. Промышленность Белоруссии, с. 245. У 1859 г. называецца шклозаводам, належаў памешчыцы Мальвіне Солтан, працавала 39 прыгонных, выраблена 750 скрынь ліставога шкла на 7500 руб.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 23. У 1900 г. працаваў 41 рабочы, выраблена шкла на 8 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 242.

**135. В. Качэрніцы** (цяпер не існуе, раней вёска Бабруйскага п.). Прыгонная мануфактура памешчыка Ганера, узнікла да 1845 г. У 1859 г. працаваў 31 рабочы, у тым ліку 3 вольнанаёмныя. Дзейнічала 1 печ. У 1861 г. працавала 32 рабочыя, выраблена 500 тыс. скрынь ліставога шкла на 10 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240; яго ж. Промышленность Белоруссии, с. 249; Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 306.

**136. Г. Клімавічы.** Гута, упамінаецца ў 1796—1800 гг.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 161. Шклофабрыка ўпамінаецца за 1854 г., выраблена да 700 скрынь ліставога шкла, працавала 9 наёмных і 21 прыгонны рабочы.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 382.

**137. Г. Клічаў.** Шклозавод, упамінаецца ў канцы XIX — пачатку XX ст., вырабляў аптэкарскі і хімічны посуд. У 1896 г. збудаваны новы завод кіеўскім купцом А. Б. Тылесам і мінскім Л. І. Сліозбергам, належаў графу А. М. Патоцкаму. У 1902 г. адбудавалі завод пасля пажару. У 1907 г. працавала 79 мужчын.— Документы и материа-

лы..., т. 3, с. 630; ЦДГА БССР, ф. 299, воп. 5, спр. 1648, л. 3, 8, спр. 733, л. 218.

**138. Г. Крычаў.** Гута, упамінаецца з 1760 г., выраблялі крышталь і бясколернае шкло. З 1799 г. да 1785 г. упамінаецца як мануфактура князя Р. А. Пацёмкіна, якая вырабляла шкло «крышталёвае, цэсарскае і аканічнае».— Майер А. Описание Кричевского графства или бывшего староства.— Могилевская старина. Могилев, 1901, вып. 2, с. 113—115; у 1785 г. Р. А. Пацёмкін перанёс яе ў в. Ушакі Чэрыкаўскага п. і аб'яднаў з мясцовай дробнай мануфактурай, якую здаў у арэнду англійскаму гандлёваму таварыству «Магідсон—Расія».— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 290. У 1786 г. збывалі шкляныя вырабы ў Крэмянчуг і Херсон.— Мелешко В. И. Очерки аграрной истории восточной Белоруссии (XVII—XVIII вв.).— Мн., 1975, с. 172. У 1800 г. упамінаецца крышталёвы завод.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240.

**139. В. Лешчанская Гута** Краснапольскага р-на (раней маёнтак Ляшчынка, Ляшэнка). Прыгонная мануфактура, узнікла да 1832 г., упамінаецца ў 1859 г. як мануфактура В. М. Галынскага. Дзейнічала 3 печы, працавала 30 прыгонных, вырабляла ліставое шкло.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240. У 1861 г. называлася гутай і належала В. М. Галынскаму.— ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 476, с. 189; Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 305—306. У 1864 г. працавала 87 рабочых, выраблена 2 тыс. скрынь ліставога шкла на 16 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 253.

**140. В. Лубянка** Клімавіцкага р-на. Прыгонная мануфактура, узнікла ў 1760 г., упамінаецца за 1789 г., належала «ксёндзам канонікам». Упамінаецца ў 1814, 1832, 1860, 1870 гг. як «гута Лубяніцкая», У 1814 г. рэгулярным арандатарам быў дваранін Нужванта.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 90, 161. У 1830 г. яе арандаваў Антон Ігнатавіч Тамашэвіч. У 1832 г. працавала 18 рабочых — Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 242, 246; Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 287, 291; Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 161, 240.

**141. В. Львы** Быхаўскага п. (цяпер не існуе). Шклозавод, час заснавання не высветлены. У 1898 г. працавала 45 рабочых. У 1900 г. належаў Есьману, працавала 45 рабочых. Закрыты ў 20-я гады XX ст.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 55; Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 255.

**142. В. Людкоў** Быхаўскага р-на. Гута, заснавана ў 1855 г. У 1878 г. належала Елізавеце Яраслаўне Сіпайла, працавала 30 рабочых, выраблена 680 450 шт. аптэчнага посуду на 20 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 349. У 1884 г. належала Андрэю Усцінавічу Бабылёву.— Указатель фабрик и заводов Европейской России..., 1887, изд. 2, с. 314. У 1890 г. працавала таксама 30 рабочых. У 1899 г. належала Есьману, упамінаецца ў сувязі з забастоўкай, якую праводзілі рабочыя 23 жніўня.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 72; Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 256.

**143. В. Лысаўка** Чэрыкаўскага р-на. Гута, упамінаецца ў 1847—1848 гг., выраблена шкла на 6500 руб., у 1859 г.— на 7 тыс. руб., якое прадавалі ў Кіеў.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 367, 386.

**144. Магілёўскі павет** (вёска невядома). Шклофабрыка, час заснавання не высветлены. У 1859 г. належала графу Аляксандру Патуліцкаму-Вайзбун; працавала 24 рабочыя, выраблялі бутэлькі, кварты, паўкварты і гарнцовыя кварты.—Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 130.

**145. В. Мокрае I** Быхаўскага р-на (раней фальварак Мокры Клімавіцкага п.). Прыгонная мануфактура, заснавана ў 1855 г. У 1864 г. працавала 98 рабочых, выраблена ліставога шкла на 11 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 266. У 1884 г. належала памешчыкам галынскім Станіславу і Казіміру Дзмітрыевічам, працавала 33 рабочыя, выраблена лістабога шкла на 10 тыс. руб.— Указатель фабрик и заводов..., 1887, с. 314.

**146. В. Малінаўка** Чэрыкаўскага р-на. Мануфактура, заснавана ў 1841 г. У 1859 г. належала Антону Калантаю, дзейнічала 3 печы, працавала 40 рабочых, у тым ліку 10 вольнанаёмных.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240. У 1859—1861 гг. вырабляла ў год 750 скрынь аконнага шкла.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 138; Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 300;

Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 256.

**147. Х. Петруліно** (былы маёнтак Чэрыкаўскага п.). Прыгонная мануфактура, узнікла да 1850 г. У 1859 г. называлася фабрыкай, належала памешчыку Мечыславу Кастравіцкаму, дзейнічала 1 печ, працавала 32 рабочых, у тым ліку 11 вольнанаёмных, выраблена 750 скрынь ліставога шкла.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240; Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 310. У 1861 г. належала Мячыславу Кастравіцкаму, працавала 32 рабочыя, выраблена 800 скрынь ліставога шкла на 10 тыс. руб.— ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 476, с. 145; Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 113, 138, 149.

**148. В. Рудня** Бялыніцкага р-на. Прыгонная мануфактура, на якой выраблялі жалеза і шкло. Час заснавання не вызначан. У 1814 г. належала палкоўніку Бернарду Пенчкоўскаму. У 1832 г. выраблена 211 тыс. бутэлек.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 90; Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240.

**149. В. Свіслач** Асіповіцкага р-на. Шклозавод «Ялізава», заснаваны купцом М. І. Мерлісам 12.9.1912 г., выраблялі ліставое шкло, выкарыстоўвалі соду, сульфат. Закрыты ў 1924 г. На яго базе новы шклозавод пабудаваны ў р. п. Ялізава.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 175, л. 1.

**150. Селішчы** (раней фальварак Клімавіцкага п., цяпер невядома). Шклозавод, заснаваны ў 1881 г. У 1884 г. належаў шляхціцу Льву Іванавічу Сабанскаму, працавала 36 рабочых, выраблена 1500 скрынь ліставога шкла на 24 тыс. руб.— Указатель фабрик и заводов Европейской России..., СПб., 1887, изд. 2, с. 314.

**151. В. Семукачы** Магілёўскага р-на (раней вёска Быхаўскага п-та). Шклозавод, заснаваны ў 1860 г. У 1881 г. працавала 16 рабочых, выраблена ліставога шкла на 5 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 290.

**152. В. Ушакі** Чэрыкаўскага р-на. Прыгонная мануфактура князя Р. А. Пацёмкіна, дзейнічала з 1780 г. Р. А. Пацёмкін у 1785 г. аб'яднаў дзве мануфактуры (перавёў сюды шкляную мануфактуру з Крычава) і здаў у арэнду англійскаму гандлёваму таварыству «Магідсон—Расія».— Майер А. Описание Кричевского графства...—Могилевская старина.— Могилев, 1901, вып. 2, с. 114, 115. Першапачаткова было 2 плавільныя печы і працавала 19 прыгонных рабочых, пазней іх замянілі «абучаныя з Крычава мяшчане». Выраблялі крышталёвыя вырабы «рознай дабраты і ўзораў, цэсарскае, аканічнае і зольнае» на 10—12 тыс. руб. у год.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 290.

**153. В. Чарабамір** Кіраўскага р-на. Гута, упамінаецца ў 1814 г., належала князю Сапегу, арандаваў Арый Фундамінскі.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 5, 90. У 1846—1847 гг. называлася «Гута чарабамірская», належала Ігнату Булгаку, выраблялі кварты, бутэлькі і аконнае шкло. У 1847 г. выраблена шкла на 558 руб. Працаваў майстрам іншаземец Карл Пап.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі, т. 2, с. 8, 12.

**154. В. Язвы** Быхаўскага р-на. Шклозавод, заснаваны ў 1874 г. У 1895 г. працаваў 61 рабочы, выраблена шкла на 23 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 307.

**155. Р. п. Ялізава** Асіповіцкага р-на (да 1955 г. чыг. ст. Свіслач). Шклозавод «Ялізава», заснаваны ў 1912 г. пры м. Свіслач; у 1914 г. належаў купцу М. І. Мерлісу і К°; выраблялі ліставое шкло халяўным метадам і выдзіманы сталовы посуд.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 175, л. 1, 3, 22 аб, 29.

**156. Ялізавеціна** (раней маёнтак Клімавіцкага п., цяпер невядома). Прыгонная мануфактура, заснавана ў 1724 г. У 1844 г. належала В. М. Галынскаму, працавала 38 вольнанаёмных і 19 прыгонных рабочых. У 1856 г. працавала 16 вольнанаёмных і 16 прыгонных майстроў, а таксама 20 вучняў з прыгонных, выраблялі аконнае шкло. У 1861 г. працавала 57 рабочых, належала В. М. Галынскаму.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 2, с. 96; Романовский Н. Т. К вопросу о возникновении и развитии мануфактурной промышленности в Белоруссии.— Труды географ. фак-та БГУ. Мн., 1958, вып. 2, с. 46; Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240; Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 46; Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 238.

**157.** В. Гута ў Гарадзецкім с/с Быхаўскага р-на.

158. **В. Гута** да 1969 г. у Глухаўскім с/с Быхаўскага р-на.

159. **В. Гута** ў Лебядзянкаўскім с/с Бялыніцкага р-на.

160. **П. Гута** ў Цяхнінскім с/с Бялыніцкага р-на.

161. **В. Гута** ў Баранавіцкім с/с Кіраўскага р-на.

162. **В. Гута** ў Любоніцкім с/с Кіраўскага р-на.

163. **В. Гута** ў Лабжанскім с/с Клімавіцкага р-на.

164. **В. Гутка** ў Мокраўскім с/с Касцюковіцкага р-на.

165. **В. Гутка** да 1971 г. ва Ушакоўскім с/с Чэрыкаўскага р-на.

166. **В. Раманецкая Гута** ў Ямненскім с/с Быхаўскага р-на.

## *Мінская вобласць*

167. **В. Анаполле** Чэрвеньскага р-на. Прыгонная мануфактура, час заснавання не высветлены. Закрыта пасля 1812 г.— Закалинская Е. П. Вотчинные хозяйства..., с. 161.

168. **Г. Барысаў.** Шклозавод, заснаваны ў 1885 г. В. А. Краеўскім. Шклозавод «Гутта», які належаў Эпштэйну, упамінаецца 1 лістапада 1905 г. у сувязі з наяўнасцю на ім прапагандысцкіх гурткоў.— Документы и материалы..., т. 3, с. 474; Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 53; Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 314.

169. **Нова-Барысаў** (цяпер г. Барысаў). 20.1.1898 г. будаддзелам Мінскага губернскага праўлення зацверджан праект купца Б. А. Кабакова на будаўніцтва шклозавода ў пасадзе Нова-Барысаў Барысаўскага п. (цяпер у межах г. Барысава). На гэтым жа месцы знаходзіцца сучасны шклозавод. У 1898 г. загадчыкам завода ў пасадзе Нова-Барысаў быў В. А. Краеўскі. З 1899 г. кіраваў заводам У. В. Панкевіч, пазней стаў саўладальнікам В. А. Краеўскага.— ЦДГА БССР, ф. 299, воп. 1, спр. 869, л. 9. У жніўні 1899 г. пачаў працаваць шліфавальны цэх, у 1902 г.— газавая печ.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 204, л. 11. У маі 1900 г. называўся «Шкляны завод Краеўскага і К°», у канцы года — крышталёвы завод «Барысаў», працавала 170 рабочых, у тым ліку немцы, чэхі, аўстрыйцы, сербы, мадзьяры, выраблена крышталёвага посуду і лямпавага шкла на 78 тыс. руб.— Документы и материалы..., т. 3, с. 32. У 1904 г. працавала 195 рабочых, у тым ліку малалетніх 31.— З рапартаў У. В. Панкевіча старшаму фабрычнаму інспектару Мінскай губерні (па матэрыялах заводскага музея). У 1910 г. належаў нашчадкам В. А. Краеўскага, працавала 255 рабочых, выраблена крышталёвага посуду на 175 452 руб. У гэтым жа годзе крышталёвыя вырабы завода на міжнароднай выстаўцы шкла ў Парыжы адзначаны *Залатым медалём.* У 1913 г. называўся «Крышталёвая фабрыка «Барысаў» таварыства браты Краеўскія ў Нова-Барысаве».— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 204, л. 50. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі шклозавод нацыяналізаваны.— Документы и материалы..., т. 3, с. 61; Борисовский стекольный: История фабрик и заводов.— Мн., 1974, с. 9.

170. **Бродні** (раней засценак Барысаўскага п.). Шклозавод памешчыкаў Вікенція і Станіслава Тышкевічаў, упамінаецца ў 1800 г.— Белоруссия в эпоху феодализма, т. 3, с. 111.

171. **В. Гарэлец** Пухавіцкага р-на (раней маёнтак Ігуменскага п.). Шклозавод, у 1896 г. належаў І. Б. Калецкаму.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, л. 7, 216.

172. **В. Жабічы** Лагойскага р-на (раней маёнтак Жабічы). Прыгонная мануфактура, заснавана ў 1806 г. У 1810 г. належала Анэлі Петразолінай, дзейнічала 3 печы, працавала 15 прыгонных і 2 вольнанаёмныя майстры, выраблена 2880 шт. посуду.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 293. У 1812 г. дзейнічала 4 печы, працавала 23 прыгонныя, выраблена крышталёвага і шклянога посуду на 3 850 руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 157—169. У 1833 г. належала Пятролінавай.— ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 476, л. 112. У 1896 г. працавала 62 рабочыя, у тым ліку 12 жанчын, выраблена бутэлек і лямпавага шкла на 30,5 тыс. руб.— Перечень фабрик и заводов, с. 410; Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 189. У 1900 г. называецца шклозавод

«Жабічы», належаў А. Чаховічу, працавала 109 рабочых, выраблена бутэлек і лямпавага шкла на 38 900 руб.— Документы и материалы..., т. 3, с. 32.

**173. В. Залессе** (раней маёнтак) Вілейскага п. Прыгонная мануфактура, заснавана ў 1802 г. У 1898 г. працавала 180 рабочых, выраблялі сталовы і аптэкарскі посуд.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 240.

**174. В. Залессе** ў Хаценчыцкім с/с Вілейскага р-на (да 1897 г. сядзіба). Шклозавод, заснаваны ў маёнтку Васнеўскага. У 1855 г. належаў купцу Мееру Самсонавічу Левіну, дзейнічала 1 печ, працавала 100 рабочых, выраблена рознага шкла і посуду на 18 тыс. руб. У 1896 г. працавала 110 рабочых, выраблена шкла на 30,1 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 347; Перечень фабрик и заводов.— СПб., 1897, с. 410. У 1900—1903 гг. належаў М. Левіну, закрыты ў час крызісу 1900—1903 гг., калі на ім працавала 110 рабочых.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 55.

**175. В. Ілья** Вілейскага р-на. Прыгонная мануфактура, заснавана графам Салагубам у 1769 г. У 1794 г. Кацярына II падаравала мануфактуру ў складзе зямель Салагуба графу М. Салтыкову. У 1800 г. выраблена графінаў гладкіх круглых у дне, квартаў гладкіх і аздобленых шліфоўкай 11 тыс. шт., кілішкаў шліфаваных, гравіраваных і гладкіх 3,1 тыс., шклянак шліфаваных і гравіраваных 2 тыс., бутэлек 1 тыс., 1,76 тыс. шт. рознага посуду і 3 скрыні ліставога шкла.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 5. У 1806 г. мануфактуру купіў Валадковіч. У 1814 г. дзейнічала 5 печаў, працавала 26 прыгонных. У 1815 г. яе закрылі, абсталяванне і людзей перавялі ў засценак Стражыслаў. У 1828 г. па спадчыне належала Радзішэўскаму.— Журнал мануфактур и торговли, 1931, № 9, с. 79, 88; Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. XII і 188. У 1897 г. працавала 120 рабочых, выраблена шкла на 40 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 243.

**176. В. Краснае** Мінскага р-на (раней урочышча Мінскага п.). Шклозавод, заснаваны ў 1880 г., у 1890 г. на ім працаваў 91 рабочы, выраблена шкла на 38 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 250.

**177. В. Краснае сяло** Слуцкага р-на (раней маёнтак Валадковічаў). Шклозавод, заснаваны ў 1884 г. памешчыкам В. І. Валадковічам (вёў справы М. Эндзільберг), дзейнічала 6 печаў.— ЦДГА БССР, ф. 299, воп. 4, спр. 758, л. 3; воп. 5, спр. 758.

**178. Г. Мінск.** Вул. Добрамысленская (раней урочышча Добрыя Мыслі). Шклозавод, заснаваны ў 1895 г. Г. Сыркіным і М. Эндзільбергам. У 1909 г. належаў купцу Мазэ. Пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі нацыяналізаваны. Разбураны ў час Вялікай Айчыннай вайны.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 216, л. 44—46; ф. 299, воп. 2, спр. 111, л. 1; Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 56.

**179. Г. Мінск.** Завул. Грыгор'еўскі (каля вул. Маскоўскай). Шклозавод, заснаваны ў 1910 г. Д. Л. Ашкіназі і І. С. Батвіннікам. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі нацыяналізаваны, называўся «Пралетарый». Закрыты ў 1924 г.— ЦДГА БССР, ф. 299, воп. 5, спр. 1934, л. 9.

**180. В. Налібокі.** Стаўбцоўскага р-на. Прыгонная мануфактура, заснавана ў 1717 г. Радзівілам. Закрыта ў 1866 г.— Гісторыя Беларускай ССР, т. 2.— Мн., 1972, с. 596; Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 90; Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 240.

**181. В. Неманіца** Барысаўскага р-на (раней вёска Мінскага п.). Шклозавод, час заснавання не ўдакладнены. У 1866 г. працавала 38 рабочых, выраблена шкла на 21 тыс. руб.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 268.

**182. В. Пагрэбліцы** (цяпер не існуе, раней у Вілейскім п.). Мануфактура. Узнікла да 1850 г. У 1854 г. працавала 18 майстроў. Упамінаецца ў 1857 г.—Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 162, 240.

**183. Пас. Партызанскі** Вілейскага р-на (раней маёнтак Залессе). Шклозавод «Залессе», заснаваны ў 1855 г. у выніку пераводу сюды гуты з маёнтка Стражыслаў. У 1859 г. належаў памешчыку Норберту Міхайлавічу Васілеўскаму, дзейнічала 1 печ, працавала 30 прыгонных, выраблялі посуду на 4700 руб. у год.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 305—306. У 1879 г. пры тым жа ўладальніку працавала 36 рабочых, выраблена шклянак і бутэлек на 4800 руб.— Указатель фабрик и заводов...,

с. 333. У 1900 г. належаў Б. Ш. Тылесу, Я. Б. Ашкіназі, Х. З. Грытгаўзу, працавала 157 рабочых, выраблена сталовага, аптэчнага посуду, лямпавых вырабаў на 90 700 руб., у 1910 г.— на 89 949 руб.— Документы и материалы..., т. 3, с. 32, 60. Працуе і сёння, вырабляе сілікатныя глыбы і шклатару.

**184. В. Парэчча** Пухавіцкага р-на. Шклозавод, у 1892 г. належаў Бярловічу і Клёцкіну. У 1895 г. устанавілі паравы рухавік, працавала 111 рабочых, выраблена шкла на 59 тыс. руб. Закрыты ў 1924 г.— Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 54, 77, 78; Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 281.

**185. Парэцкая Пушча** (цяпер не існуе, раней маёнтак В. Л. Азмідава ва ўрочышчы Коўзскае Ігуменскага п.). Шклозавод, заснаваны памешчыкам В. Л. Азмідавым у 1895 г., у 1900 г. на ім працавала 104 рабочыя.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 246. Завод працаваў у 1913 г.— ЦДГА БССР, ф. 299, воп. 2, спр. 1110, л. 24.

**186. В. Раванічы** Чэрвеньскага р-на. Гута, год заснавання невядомы, у 1831 г. належала памешчыку Вікенцію Слатвінскаму.— ЦДГА БССР, ф. 295, воп. 1, спр. 476, с. 41.

**187. Г. Смалявічы.** Шклозавод, год заснавання не высветлены. З 80-х гадоў XIX ст. па 1910 г. належаў Ашкіназі і К°, з 1910—таварыству «Шкло-крышталёвы завод «Смалявічы» пазней называўся «Шклозавод «Вікторыя». У 1910 г. пабудавалі цэх шліфоўкі на 7 станкоў з лакамабільным рухавіком. Закрыты ў 1924 г.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 205, л. 1, 2; ф. 299, воп. 5, спр. 1935, л. 18; Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 56, 64, 77.

**188. В. Старэва** Слуцкага р-на. Шклокрышталёвы завод, узнік пры лесапільным заводзе, год заснавання не высветлены. Знаходзіўся ў 12 км ад г. п. Урэчча. У 1887 г. належаў А. Клёцкіну і Ш. Фейнбергу. У 1897 г. працавала 70 рабочых, выраблена крышталёвага посуду і лямп на 58 тыс. руб. Кіраваў заводам М. Голь. У 1899 г. устаноўлены лакамабіль. У 1908 г. завод узнагароджан на Міжнароднай марсельскай выстаўцы прызам «Гран-пры». З 1908 г. належаў Б. А. Клёцкіну.— ЦДГА БССР, ф. 311, воп. 1, спр. 176, л. 102, 113. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі нацыяналізаваны, закрыты ў 1924 г.—Жаврид М. Ф. Белорусское стекло, с. 53; 77; Стеклозаводчик, 1910, № 48.

**189. В. Старое Сяло** Маладзечанскага р-на (раней маёнтакВаладковічаў). Гута, год заснавання не вызначан. У 1812 г. належала Валадковічу, працавала 28 прыгонных, выраблена посуду на 10 360 руб.— Ведомость о мануфактурах России за 1812 г., с. 157. У 1880 г. належала Вікенцію Ігнатавічу Валадковічу, працаваў 91 рабочы, выраблена ліставога і аконнага шкла на 38 тыс. руб.— Орлов П. А. и Будагов С. Г. Указатель..., с. 349. У 1884 г. яе арандавалі Мазэ, Фрэнкель і Калецкі, працавалі 44 рабочыя, вырабілі бутэлек, шклянак і ліставога шкла на 14 тыс. руб.—Указатель фабрик и заводов..., 1887, с. 314. У 1898 г. працавала 80 рабочых.— Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии, с. 297.

**190. Х. Стокі** (да 1977 г.) Стаўбцоўскага р-на. Шклозавод, год заснавання не вызначан. У ведамасці за 1828 г. паведамляецца, што заснаваны ксяндзом Слуцэвічам; у 1828 г. належаў памешчыку Станіславу Цыбовічу, які ў гэты час здаў завод у арэнду. Працавалі 1 вольнанаёмны майстар і 10 прыгонных, у 1831 г. выраблена 13 тыс. квартаў і бутэлек з бясколернага і асветленага шкла. Збывалі посуд у Вільні.— Журнал мануфактур..., 1831, № 9, с. 80; Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 196.

**191. Засценак Страбівіслова** Вілейскага п. (цяпер не існуе). Гута, у 1833 г. належала памешчыку Радзішэўскаму.— ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 476, с. 111—112. У 1833 г. працавала 8 майстроў, выраблялі бутлі 2-гарнцовыя, «карафінкі квартовыя і паўквартовыя», «шклянкі квартовыя і паўквартовыя», кілішкі з «белага шкла», слоікі 3-гарнцовыя, чарнільніцы.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 188.

**192. В. Стражы** Вілейскага р-на (былы засценак Стражыслаў). Гута, у 1815 г. перанесена з в. Ілья памешчыкам Валадковічам. У 1828 г. дасталася ў спадчыну памешчыку Радзішэўскаму. Дзейнічалі 3 печы, шліфавальны і гравіравальны цэхі, працавала 26 прыгонных.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 90, 91. У 1833 г. належала памешчыцы Махлі Гутнеравай.— ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 476, л. 111—112. У 1855 г. пераведзена ў в. Залессе.— Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии, с. 159.

**193. Г. п. Урэчча** Любанскага р-на. Шклолюстэркавая прыгонная мануфактура. Заснавана Ганнай Радзівіл у 1737 г. Выраблялі ліставое аконнае і люстэркавае шкло, посуд, люстры, падсвечнікі. Закрыта ў 1862 г.— Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі..., т. 1, с. 90; Kameńska Z. Manufaktura szklana w Urzeczu (1737—1846). — Warszawa, 1964.

**194. В. Шобікі** Барысаўскага р-на (раней Шобіны). Гута, час узнікнення не высветлены. У 1812 г. належала памешчыцы Петразолінай, дзейнічала 4 печы, працавала 23 прыгонныя, выраблена крышталёвага і сталовага посуду на 3850 руб.— Ведомость о мануфактурах России за 1812 г. (хрустально-стекольные заводы). — СПб., 1814, с. 157—164. У 1859 г. належала памешчыцы Петразолінай, дзейнічала 1 печ, працавала 30 прыгонных, выраблена 2 скрыні ліставога шкла і посуду на 4700 руб.— Романовский Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии..., с. 305—306.

**195. В. Гута** ў Паплаўскім с/с Бярэзінскага р-на.

**196. В. Гута** ў Багданаўскім с/с Валожынскага р-на.

**197. В. Гута** ў Ігрушаўскім с/с Крупскага р-на.

**198. В. Гута** ў Любяцкім с/с Уздзенскага р-на.

**199. В. Гутніца** ў Амговіцкім с/с Слуцкага р-на.

**200. В. Новая Гута** ў Хаценчыцкім с/с Вілейскага р-на.

**201. В. Новы Гуткоў** у Амговіцкім с/с Слуцкага р-на.

**202. В. Старая Гута** ў Бабаўнянскім с/с Капыльскага р-на.

**203. В. Стары Гуткоў** у Амговіцкім с/с Слуцкага р-на.

# ЗМЕСТ

5
УВОДЗІНЫ

9
ХАРАКТАРЫСТЫКА ВІДАЎ ШКЛАРОБСТВА

**МАСТАЦКАЕ ШКЛО БЕЛАРУСІ I—III ЧВЭРЦІ XIX ст.**

17
АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СТАНУ ШКЛАРОБСТВА
І ШКЛЯНЫХ ВЫРАБАЎ

40
АТРЫБУТАВАННЕ ЎРЭЦКА-НАЛІБОЦКАГА
ШКЛА

**МАСТАЦКАЕ ШКЛО БЕЛАРУСІ**
**АПОШНЯЙ ЧВЭРЦІ XIX — ПАЧАТКУ XX ст.**

71
СТАН РАЗВІЦЦЯ ШКЛАРОБСТВА
І АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ВЫРАБАЎ

96
ШКЛАРОБСТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ
**(1920—1939 гг.)**

118
ДАДАТАК

**МАЙЯ МИХАЙЛОВНА ЯНИЦКАЯ**

БЕЛОРУССКОЕ ХУДОЖЕСТВЕННОЕ СТЕКЛО
XIX — начало XX ст.

Издательство «Наука и техника»
На белорусском языке

Загадчык рэдакцыі *Г. Ф. Юрчанка*
Рэдактар *А. М. Садоўская*
Мастак *Э. Э. Жакевіч*
Мастацкі рэдактар *Л. І. Усачоў*
Тэхнічныя рэдактары *Т. В. Лецьен, С. А. Курган*
Карэктар *М. А. Вячорка*

ІБ № 1487

Друкуецца па пастанове РВС АН БССР. Здадзена ў набор 25.04.84. Падпісана ў друк 12.10.84. АТ 18892. Фармат 70×90$^1/_{16}$. Папера мял. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 10,53. Ум. фарб.-адб. 18,43. Ул.-выд. арк. 10,3. Тыраж 1100 экз. Зак. № 537. Цана 1 р. 60 к. Выдавецтва «Навука і тэхніка» Акадэміі навук БССР і Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600. Мінск, Ленінскі праспект, 68. Друкарня імя Францыска (Георгія) Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка». 220600. Мінск, Ленінскі праспект, 68.



1 р. 60 к.

М. М. ЯНІЦКАЯ — БЕЛАРУСКАЕ МАСТАЦКАЕ ШКЛО